№ 1 (503) 12 студзеня 2007

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

## Ніхто ня дасьць нам выбаўленьня

Тэма нумару: нафтагазавы канфлікт. Старонкі 3—15.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

### Шасьцідзённая вайна

Беларускія мыты на транзыт нафты пратрымаліся шэсьць дзён пасьля таго, як Расея на два дні перакрыла транзыт нафты. **Старонка 3.**

### Першыя ластаўкі крызісу

Цяжкасьці пасьля падаражаньня расейскіх энэргарэсурсаў адчуў шэраг прадпрыемстваў. **Старонка 11.**

### Новы вораг Лукашэнкі

І самы небясьпечны. Гэта выпеставаная ім палітычная і эканамічная эліта. Піша Андрэй Павач. **Старонка 13.**

### Радасьць «Газпрому», смутак Сідорскага

«Газпром» дабіўся сваёй галоўнай мэты — атрыманьня «Белтрансгазу». **Старонка 10.**

### Давайце пабачым, што будзе заўтра

Праз два дні пасьля газавага ляманту Беларусь прадала «Белтрансгаз»: маўляў, іншага выхаду не было. Праз шэсьць дзён пасьля ўвядзеньня нафтавых мытаў яны адмененыя. Піша Барыс Тумар. **Старонка 12.**

### Тое, пра што так доўга гаварылі незалежнікі, здарылася

Зянон Пазьняк, Сяргей Гайдукевіч і іншыя беларускія палітыкі камэнтуюць нафтавы канфлікт з Расеяй. **Старонка 7.**

### Хацят лі рускія вайны?

«Як Вы лічыце, ці павінна Расея ўвесьці войскі ў Беларусь для аховы нафтаправоду «Дружба»? **Старонка 3.**

### Хто ненадзейны?

Агляд замежных публікацыяў на тэму беларуска-расейскага энэргетычнага крызісу. **Старонка 8.**

### Адны ідуць, другія стаяць

Мілінкевіч рэзка крытыкуе партыйную апазыцыю. **Старонка 16.**



# у нумары

## тэма

Шасьцідзённая вайна 3

Трацiна аўдыторыі радыё «Эхо Москвы» выступала за ўвод войскаў у Беларусь .. 3

Віктар Лукашэнка ўвайшоў у Раду бясьпекі ........ 6

Тое, пра што гаварылі незалежнікі, здарылася ........ 7

Хто ненадзейны? ....... 8

«СБ»: «Экспансіянісцкая палітыка Расеі пагражае сувэрэнітэту Беларусі» ........ 9

Радасьць «Газпрому», смутак Сідорскага .. 10

Першыя ластаўкі крызісу ........ 11

Ці ўхваляеце Вы рашэньне А.Лукашэнкі прадаць «Белтрансгаз» «Газпрому»? Вынікі апытаньня ........ 12

## камэнтары

Барыс Тумар. Давайце пабачым, што будзе заўтра ........ 12

Андрэй Павач. Новы вораг Лукашэнкі ..... 13

Віталь Тарас. «Ніхто ня дасьць нам выбаўленьня...» ....... 14

Рэдакцыйны камэнтар. Да выбараў у мясцовыя саветы засталося чатыры дні, а апазыцыя ня вызначылася, што рабіць ........ 17

Павал Севярынец. Сьвята нараджэньня Сьвятла ........ 18

## люстра дзён

Адны ідуць, другія стаяць ........ 16

Мілінкевіч рэзка крытыкуе партыйную апазыцыю ........ 16

Адзін прэтэндэнт ужо застаўся бяз працы ........ 17

## з усіх старон

Як моладзь займаецца палітыкай у Нямеччыне ........ 20

Дэмакратыя па–славацку ........ 23

## комікс

Бульбman ........ 24

## мы самі

Дзякуй ........ 25

## газэтка дзеткам

Зіма ў Плястыляндыі ....... 44

## вольны час

Прэзэнтацыя новай кніжкі Хадановіча ... 45

Палітычная крыжаванка ........ 46

**50 РАДКОЎ РЭДАКТАРА**

# Год паэзіі

Сёлета мы сьвяткуем юбілеі Янкі Купалы і Якуба Коласа. Клясыкам беларускай літаратуры будзе па 125 гадоў.

З Новым годам, з шчасьцем новым!
Дай жа Божа гэты год,
Каб успомніў шчырым словам
Працавіты ўвесь народ!

Каб больш сьлёзы не ліліся,
Каб ня падаў чалавек,
Каб астрогі запярліся
Ад людзей на вечны век;

Каб казалі, што хацелі,
Каб ня гнулісь, як цяпер,
Каб са страхам не глядзелі
На вураднікаў каўнер;

Дай Бог шчасьця вам і долю
Ўсім, хто сьлёзы праліваў,
Хто у бедным родным полі
Зерне праўды засяваў!

Гэтак пісаў у першым нумары на новы 1907 год Якуб Колас. Нямнога тут чыстае красы. Дый ці яна чапляла тагачаснага чытача-мужыка ў газэце? Чаплялі палітычныя тэмы, выкладзеныя даступна і сваёй мовай, чапляла сугучча напісанага з уласнымі думкамі.

Увесь той нумар «НН» з Коласавым вершам быў прысьвечаны выбарам у царскую Думу. Чытаючы, міжволі параўноўваеш іх зь сёлетнімі мясцовымі. Пры цары свабоды было болей.

Перадвыбарныя гульні сёньня ня ўражваюць. Беларусь пражыла калядныя тыдні ў стане газа-нафтавай вайны з Расеяй (**старонкі 3—15**).

А яшчэ пад Каляды выйшаў з турмы Цімох Дранчук, вярнуўся з высылкі Андрэй Клімаў. Паўлу Севярынцу споўнілася трыццаць гадоў. Бяз каліва дзяржаўных грошай надрукаваны «Нямецка-беларускі слоўнік» на 55 тысяч словаў (**старонка 34**). Лявон Вольскі з «Крамбамбуляй» запісаў аж дзьве навагоднія песьні й пачаў маляваць комікс пра беларускага супэрмэна (**старонка 24**). У Мастацкім музэі нарэшце адчыніўся новы корпус. Адзначыла гадавіну існаваньня газэта «Крама крыжаванак»… Жыцьцё віруе вакол, важна яго бачыць.

За тыдзень, што Рэдакцыя была на калядных вакацыях, склаўся нам нумар з раскошных матэрыялаў, дасланых чытачамі з розных куткоў краіны. Сяргей Брадавы піша з Маладэчна. Васіль Аўраменка — з Магілёва. Руслан Равяка — з Баранавічаў. Дар’я Ліс — з Смургоняў. Андрэй Павач і Даніла Жукоўскі — з Горадні. Бірута Янкевіч — з Гомеля, Антон Лучкоўскі — з Докшыцаў... 100 гадоў таму клясыкі таксама жылі не ў сталіцах.

У Год беларускай паэзіі «Наша Ніва» штонумар будзе даваць месца вершам (**старонкі 40—42**).

Дык — прыемнага чытаньня.

# Шасьцідзённая вайна

Беларускія мыты на транзыт нафты пратрымаліся шэсьць дзён пасьля таго, як Расея на два дні перакрыла транзыт нафты.




## «Бэнзыну 92 і 95 няма»

Такія шыльды пэрыядычна зьяўляюцца на сталічных запраўках. То яшчэ не дэфіцыт. То проста праявы павышанага попыту. Звычайнай колькасьці паліва не стае на пэрыяд між завозамі. Аўтамабілісты зрэагавалі на чуткі пра магчымы дэфіцыт, запрапоўныя бакі й каністры. Людзям яшчэ памятныя перабоі з бэнзынам часоў Кебіча.

Улады абяцаюць, што ні павышэньня цэнаў на паліва, ні дэфіцыту не чакаецца. Кіраўнік Камітэту дзяржаўнага кантролю Зянон Ломаць запэўніў, што сытуацыя застаецца пад кантролем. Абавязак забесьпячэньня заправак ускладзены на іхных уласьнікаў. Агенцтва БелТА цытуе словы Ломаця: у тых заправак, на якіх будзе назірацца дэфіцыт паліва, будуць забіраць ліцэнзіі.

Нафтаперапрацоўчыя заводы працуюць у звычайным рэжыме, хоць пастаўкі нафты з Расеі перапыненыя з 1 студзеня. Згодна з афіцыйнымі паведамленьнямі, пакуль хапае рэзэрваў. Адборы нафты з «Дружбы» сьведчаць, што Беларусь ня хоча сваіх рэзэрваў вычэрпваць.

«Белнафтахім» адрокся закупак нафты з Расеі з 1 студзеня пасьля ўвядзеньня нашай суседкай экспартных мытаў на пастаўкі нафты ў Беларусь. У выніку гэтага чорная сыравіна падаражэла для нашай краіны на $180. Раней Беларусь атрымлівала нафту бяз мыта, у адрозьненьне ад Украіны ці Літвы, якія плацілі поўныя грошы.

Пра павышэньне мытаў стала вядома 11 сьнежня, калі адпаведнае рашэньне падпісаў расейскі прэм'ер Фрадкоў. А прадчувалася яно месяцы з два таму пасьля таго, як ранейшую сытуацыю скрытыкаваў прэзыдэнт Пуцін. Расея зьвінаваціла Беларусь у рээкспарце нафты на шкоду расейскаму бюджэту. Тым ня менш, за гэты час беларускія ўлады не знайшлі выхаду са становішча.

## Абяцанкі-цацанкі

Перад самым Новым годам было падпісанае пагадненьне аб пастаўках газу ў Беларусь узамен за перадачу Расеі газаправоднай сеткі «Белтрансгаз». Беларускі бок разьлічваў, што пасьля гэтага будзе адмененае рашэньне аб увядзеньні экспартнага мыта на пастаўкі нафты. Аж не. Масква з радасьцю прыняла адкупное, але не сьпяшаецца выконваць вусныя абяцанкі.

Паводле падлікаў эканамістаў з Інстытуту прыватызацыі і мэнэджмэнту, увядзеньне нафтавых мытаў больш балючае для беларускага бюджэту, чым рост цэнаў на газ. Ад першага беларускі бюджэт сёлета страціць каля $400 млн, ад другога — $1 млрд 700 млн.

Спрабуючы вырваць ад Масквы палёгкі, Аляксандар Лукашэнка 4 студзеня загадаў абкладаць беларускім мытам гіганцкі нафтавы транзыт праз Беларусь. Гэтых грошай зь ліхвой выстарчыла б, каб кампэнсаваць рост цэнаў, ды толькі няма гарантыі, што Расея будзе іх сплочваць. У расейскай кампаніі «Транснефть» і Міністэрстве эканамічнага разьвіцьця й гандлю такія мыты называюць незаконнымі і супярэчнымі міждзяржаўным пагадненьням.

Кіраўнік дзяржавы на нарадзе з адміністрацыяй 4 студзеня не шкадаваў словаў ганьбы для кіраўніцтва «саюзнае» зь Беларусьсю дзяржавы. «Калі яны, захлынаючыся нафтадалярамі і іншымі наплывамі валюты, вырашылі на Беларусі адыгрaцца... дык давайце папросім такую багатую Расею заплаціць нам за наданыя ёй паслугі».

Кіраўнік Беларусі запатрабаваў паставіць перад Расеяй пытаньне аб аплаце транзыту нафты праз Беларусь, аплаце зямлі пад газа- і нафтаправодамі і вайсковымі базамі Расеі і нават перагляд статусу аб'ектаў расейскай уласнасьці ў Беларусі.

А. Лукашэнка прызнаў, што гэта ён даў заданьне падпісаць нявыгаднае для Беларусі пагадненьне пра пастаўкі газу і перадачу «Белтрансгазу» ў расейскую ўласнасьць. Ён патлумачыў гэтае рашэньне абя-

Працяг на старонцы 4.

**Траціна аўдыторыі радыё «Эхо Москвы» выступала за ўвод войскаў у Беларусь**

У панядзелак адна з самых прасунутых і лібэральных радыёстанцый зладзіла апытаньне «Як Вы лічыце, ці павінна Расея ўвесьці войскі ў Беларусь для аховы нафтаправоду «Дружба»?

36% слухачоў патэлефанавалі ў эфір, каб адказаць «Так», 64% выказаліся супраць.

# Шасьцідзёная вайна

Працяг са старонкі 3.

цанкамі Масквы ў выпадку здачы «Белтрансгазу» вырашыць пытаньне бязмытных паставак нафты ў Беларусь. Між тым «дагэтуль гэтае пытаньне ня вырашана».

## Братняя вайна

Адразу пасьля нарады ў А. Лукашэнкі ўрад задняй датай пастанавіў устанавіць мыта на транзыт расейскай нафты ў памеры $45 за тону. Рашэньне ўступіла ў дзеяньне ад 1 студзеня. За кожную тону Расеі прапаноўвалася плаціць $45.

У адказ на рашэньне Менску, расейскі апэратар нафтаправодаў «Транснефть» заявіў, што Беларусь ня мае права ўводзіць новыя мыты на расейскую нафту, экспартаваную праз яе тэрыторыю.

— Што датычыць аплаты за транзыт, яна ўстанаўляецца міжнароднымі пагадненьнямі, і яе няможна зьмяняць бяз згоды Расеі. Таму ня варта перажываць, — заявіў намесьнік дырэктара «Транснефти» Сяргей Грыгор’еў.

У аўторак расейскі міністар Герман Грэф адмовіўся весьці перамовы зь беларускай дэлегацыяй на чале зь віцэ-прэм’ерам Кабяковым, пакуль Беларусь не адменіць мытаў на транзыт нафты.

Як адзначыў намесьнік міністра эканамічнага разьвіцьця й гандлю Расеі Андрэй Шаронаў, Масква лічыць увядзеньне гэтага мыта незаконным і з пункту гледжаньня ўзаемных дамоўленасьцяў і пагадненьняў, якія дзейнічаюць між Расеяй і Беларусьсю, і нават з пункту гледжаньня беларускага заканадаўства, і з гледзішча міжнароднай практыкі. «І з гледзішча таго, што фактычна яна была ўведзеная задняй датай, — зазначыў Шаронаў. — Сцэнар можа разьвівацца або, так бы мовіць, «мірным» спосабам у двукосьсях, калі ўсё-ткі нам удасца пераканаць нашых партнэраў. У адваротным выпадку нам прыйдзецца шукаць адэкватныя захады, зьвязаныя з нашымі гандлёвымі адносінамі, якія прымусяць нашых беларускіх партнэраў у цэлым сур’ёзьней пагледзець на тую сытуацыю, у якую яны паставілі цяпер Расею».

Тым часам БелТА ў суботу паведаміла, што прэзыдэнту расейскай кампаніі «Транснефть» Сямёну Вайнштоку накіраваная позва ў беларускі суд за транспартаваньне сырой нафты бяз мытнага дэкляраваньня.

У той жа дзень была агучаная інфармацыя пра поўнае спыненьне экспарту выробленага ў Беларусі цукру ў Расею. Расейская мытня папросту не прымае цягнікоў з цукрам, нават не правяраючы, бураковы ён ці трысьняговы.

Нарэшце, у ноч на панядзелак ўпершыню былі прыпыненыя пастаўкі нафты ў Эўропу праз нафтаправод «Дружба». Расейская «Транснефть» абумовіла гэта адмоўваньнем нафты ў Беларусі з транзытнага нафтаправоду. Гэтая беспрэцэдэнтная мера выклікала непакой ва ўсёй Эўропе. Эўракамісія запатрабавала ад Расеі неадкладна вырашыць сытуацыю. Краіны-атрымальніцы нафты перажылі шок.

У аўторак пра становішча выказаўся прэзыдэнт Пуцін. Ён загадаў гарантаваць экспартныя пастаўкі і кампэнсаваць страты нафтавым кампаніям.

## Тэлефоннае права

Тэлефонная размова Лукашэнкі й Пуціна ў сераду дала вынік. Прэзыдэнты далі даручэньне прэм’ерам да пятніцы падрыхтаваць прапановы кампрамісу, паведамляе ІТАР-ТАСС. У дэпэшы агенцтва не было ніякай канкрэтыкі, адно зазначалася, што размова адбылася па ініцыятыве беларускага боку. Аднак адразу пасьля тэлефоннай размовы прэзыдэнтаў беларускі ўрад паведаміў пра рашэньне адмяніць пошліны на транзыт нафты, уведзеныя шэсьць дзён таму. А расейская «Транснефть» абвесьціла пра аднаўленьне паставак нафты ва Ўсходнюю Эўропу праз нафтаправод «Дружба», спыненых у панядзелак. Пакуль няясна галоўнае: па якой цане будзе пастаўляцца ў Беларусь расейская нафта.

Сяргей Сідорскі паведаміў, што заўтра ён мае вылецець у Маскву для сустрэчы з расейскім прэм’ерам. Такім чы-

**Каманда прэзыдэнта ўпершыню прайграла. Газпрому.**

На аматарскім турніры ў Менску перамогу здабыла расейская каманда — «Газпромэкспарт». У фінальным матчы яна перайграла каманду прэзыдэнта Беларусі зь лікам 4:3. Беспрэцэдэнтны выпадак. Дагэтуль у якіх бы спаборніцтвах ня ўдзельнічаў Аляксандар Лукашэнка, ягоная каманда непазьбежна перамагала. Кіраўнік Беларусі зь лёгкасьцю абыходзіў на лыжні алімпійскіх чэмпіёнаў. І раптам, на 13-м годзе, гэтая «непераможная армада» прайграла. І каму! Найпрынцыповейшым сапернікам з «Газпрому»!

**Віця Папраўкін, «Салідарнасць»**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Беларусы запасаюцца газам.

### Эўракамісія патрабуе спыніць паліўную спрэчку

З патрабаваньнем спыніць паліўную спрэчку зьвярнулася сёньня да Масквы і Менску Эўракамісія. Дакладныя ўзьдзеяньні прыспыненьня нафтавага забесьпячэньня будуць вывучаныя, як і надзейнасьць Расеі ў якасьці эканамічнага партнэра, вынікае са звароту Эўракамісіі. Эўрапейская камісія лічыць, што расейска–беларускі нафтавы канфлікт ўплывае на сытуацыю ў эўрапейскіх краінах. Нафтаперапрацоўчыя заводы Нямеччыны, Польшчы, Вугоршчыны, Чэхіі і Славаччыны ў многім залежаць ад паставак паліва па нафтаправодзе «Дружба».

### У Польшчы запасаў паліва хопіць на 80 дзён

Віцэ–міністар экstaномікі Польшчы Пётра Наімскі мяркуе, што энэргетычнай бясьпецы краіны нічога не пагражае. Краіна мае стратэгічныя запасы паліва на 80 дзён. Тактычных жа запасаў нафтаперапрацоўчых заводаў досыць, каб пераладзіць пастаўкі з трубаправодных на танкерныя праз Гданьскі порт.

### Дзярждэп ЗША крытыкуе і Беларусь, і Маскву

Дзярждэпартамэнт ЗША пракамэнтаваў увядзеньне Беларусьсю мыта ў дачыненьні экспарту нафты з Расеі. Афіцыйны прадстаўнік дзярждэпартамэнту Шон Маккормак у часе штодзённага брыфінгу заявіў, што пазыцыя Беларусі паказвае «гнілую сутнасьць» рэжыму Лукашэнкі. Адначасова адміністрацыя Джорджа Буша ў сувязі з сытуацыяй вакол паставак расейскага газу ў Беларусь зноў абвінавачіла Расею ў выкарыстаньні энэргарэсурсаў ў якасьці «палітычнага рычага». «Летась мы бачылі гэта ў дачыненьні Украіны, мы бачылі гэта ў дачыненьні Грузіі і цяпер мы бачым гэта ў дачыненьні Беларусі»




PHOTO.BYMEDIA.NET

нам, беларускія мыты пратрымаліся роўна пакуль у Расеі доўжыліся калядныя вакацыі.

Цяпер беларускі ўрад разлічвае падпісаць хоць які варыянт падзелу мыта на экспарт нафтапрадуктаў. Сідорскі хацеў бы, каб 50 % мыта трапляла ў беларускі бюджэт.

Беларуская доля мытаў можа аказацца і ніжэйшаю за 50 %. У любым разе, прыбыткі беларускага бюджэту сёлета могуць аказацца ніжэйшымі за прагнозныя. Калі мінулыя гады Расея пастаўляла ў Беларусь паліва па мінімальных цэнах узамен на палітычную залежнасьць і палітыку русіфікацыі, якую праводзіла адміністрацыя А. Лукашэнкі, цяпер Крэмль усё настойлівей патрабуе платы па рахунках — ласых кавалкаў беларускай гаспадаркі. Сьледам за газаправодамі «Ямал-Эўропа» і «Белтрансгаз» гэта могуць быць нафтаперапрацоўчыя заводы.

Між тым, сацыёлягі аддаўна адзначалі, што насельніцтва Беларусі крайне нэгатыўна ставіцца да перадачы беларускай стратэгічнай маёмасьці ў замежныя рукі. Нават сам факт такіх прэтэнзій падрывае давер да кіраўніцтва краіны. Па выніках апытаньня на нашым сайце, 82 % інтэрнаўтаў не ўхваляюць рашэньня А. Лукашэнкі прадаць «Белтрансгаз» «Газпрому».

## Зьвязаныя рукі

Вобразна кажучы, Беларусь вядзе матч з Масквой са зьвязанымі рукамі. У цяжкім процістаяньні ўрад Лукашэнкі ня можа разьлічваць па палітычную і фінансавую дапамогу Захаду, які ў аналягічных сытуацыях дапамог вытрымаць ціск і перабудаваць гаспадарку спачатку краінам Балтыі, а апошнія гады — Украіне і Грузіі. Гэтыя краі пераҗылі «газавы шок» безь вялікага клопату для эканомік.

Гэта дае дадатковы аргумэнт апазыцыі. Кіраўнікі незалежніцкіх колаў ускладаюць на А. Лукашэнку адказнасьць за тое, што краіна застаецца цалкам залежнаю ад расейскіх энэрганосьбітаў.

Аляксандар Мілінкевіч заявіў, што мы назіраем правал лукашэнкаўскай замежнай палітыкі. Аляксандар Казулін перадаў з турмы на волю сваю ацэнку сытуацыі з увядзеньнем транзытных мытаў на нафту: «Рэпутацыя беларускага рэжыму як надзейнага партнэра збанкрутавала». А Зянон Пазьняк наўпрост назваў газавыя пагадненьні незаконнымі і заявіў, што «ёсьць дастаткова аргумэнтаў, каб іх адмяніць».

Змагаючыся за вобраз дэмакратычных сілаў як адказнага партнэра для Захаду і Ўсходу, Мілінкевіч заявіў у інтэрвію радыё «Эхо Москвы», што «разумее пазыцыю «Газпрому». Адначасова праз свае шырокія дыпляматычныя кантакты на Захадзе ён загадзя правёў масіраваную апрацоўку грамадзкае думкі з мэтай запабегчы любых замахаў на сувэрэнітэт Беларусі. У выніку пасол ЗША ў Менску ўжо заявіла, што Амэрыка не прызнае рэфэрэндуму аб аб'яднаньні дзьвюх краінаў, калі б такі адбыўся. А Эўразьвяз напярэдадні гэтай гарачай зімы ўпершыню выступіў з прапановамі маштабнай эканамічнай падтрымкі Беларусі і адкрыцьця эўрапейскага рынку для беларускай прадукцыі. Пры дзьвюх умовах: нармалізацыі адносінаў і дэмакратызацыі ўнутры краіны.

У суботу палітрада Дэмакратычных сілаў заклікала «адказныя, нацыянальна арыентаваныя» сілы ва ўлады ўступіць у перамовы з апазыцыяй для выпрацоўкі адзінай стратэгіі вываду краіны з ізаляцыі й эканамічнага крызысу. Гэтым жа сілам прапануецца разгледзець пытаньне

Працяг на старонцы 6.

# Шасьцідзёная вайна

Працяг са старонкі 5.

пра парушэньне Канстытуцыі пры продажы акцыяў «Белтрансгазу».

### Хто адкажа

Варта адзначыць, што меры па абароне эканамічных інтарэсаў дзяржаваў рэдка калі суправаджаюцца такімі перчанымі палітычнымі заявамі, якія гучалі сёньня. Дэклярацыі А. Лукашэнкі і прадыктаваныя ім крокі, напэўна, прывядуць да новага пагаршэньня беларуска-расейскіх адносінаў у эканамічнай сфэры. У сярэднетэрміновай пэрспэктыве гэта можа скончыцца пераводам міждзяржаўных адносінаў на рынкавыя рэйкі. Саюзная дзяржава ператвараецца ў поўны фантом.

Апошнія крокі Масквы й Менску, напэўна, вядуць да далейшага зьніжэньня даверу ў беларуска-расейскіх эканамічных адносінах. Дэпутат палаты прадстаўнікоў Красуцкі ня выключыў нават магчымасьці ўвядзеньня паўнавартаснай мяжы з Расеяй і развалу мытнага саюзу. Хоць такі сцэнар пакуль уяўляецца малаверагодным, «саюзная дзяржава» на нашых вачах ператвараецца ў фантом. У краіне паўстаюць зарысы новай эканамічнай сытуацыі, што неўнікнёна атрымаюць свой палітычны адбітак. Ужо цяпер прэм’ер Сяргей Сідорскі адыгрывае ролю, якой ня меў ніводзін іншы кіраўнік ураду пры А. Лукашэнку. Можам чакаць спробаў перакласьці віну за эканамічныя праблемы ня толькі на Расею і апазыцыю, але і на прэм’ера, ды іншых спосабаў аднавіць папулярнасьць прэзыдэнта.

Да канца студзеня, напэўна, стане вядома, колькі нафтавага мыта зможа выгандляваць для Беларусі адміністрацыя А. Лукашэнкі. Аднак пройдзе яшчэ мінімум паўгоду, перш чым стане адчувальна, як зрэагавала гаспадарка на яшчэ не сярэднеэўрапейскія, але падрослыя цэны на газ. Тады ж будзе відаць, ці ўдаецца ўтрымаць сацыяльныя праграмы на здавальняючым узроўні ва ўмовах скарачэньня даходаў бюджэту.

Незалежныя эканамісты прадказваюць у такой сытуацыі непазьбежны рост інфляцыі і дэвальвацыю беларускага рубля. На думку намесьніцы дырэктара Інстытуту прыватызацыі і мэнэджмэнту Алены Ракавай, фінансавая дэстабілізацыя можа пачацца пад канец першага паўгодзьдзя 2007 г.

**Сямён Печанко, Мікола Бугай**

### Асьцярожна, мяжа зачыняецца

**Беларусь мае ўвесьці для расейцаў, якія прыяжджаюць у краіну на асабістых аўтамабілях, абавязковае афармленьне пасьведчаньня на часовы ўвоз транспартнага сродку. Пра гэта заявіў БТ начальнік упраўленьня Мытнага камітэту Сяргей Барысюк. Паводле ягоных словаў, гэты крок — мера ў адказ на аналягічныя дзеяньні Расеі.**

### Расея прызнала сваё ўмяшаньне ў Беларусі

Паводле словаў кіраўніка расейскага Мінпрамэнэрга Віктара Хрысьценкі, рашэньне пра тое, каб захоўваць ільготны экспартны рэжым па пастаўках нафты для Беларусі, нават пасьля яе выхаду з пагадненьня ў 2001 г., было палітычным. «Гэта не дабрачыннасьць, гэта сьвядомае палітычнае рашэньне субсыдаваць, калі хочаце, эканоміку Беларусі й інтэграцыйныя працэсы, а таксама перадвыбарныя баталіі Беларусі, — падкрэсьліў В.Хрысьценка. — Гэта палітычнае рашэньне, а любое рашэньне нечага ды каштуе», — заявіў ён.

**Паводле NEWSru.com**



GW

Нягожа беларусам хадзіць у Маскву з торбай.




## Віктар Лукашэнка ўвайшоў у Раду бясьпекі

У самы разгар паліўнага канфлікту на нацыянальным прававым інтэрнэт-партале Рэспублікі Беларусь зьявілася паведамленьне пра Ўказ прэзыдэнта Беларусі №3 ад 5 студзеня. Паводле яго ўносяцца некаторыя зьмены ва Ўказ ад 23 студзеня 2004 году «Аб складзе Рады бясьпекі Рэспублікі Беларусь». У склад Рады бясьпекі цяпер уведзены памочнік прэзыдэнта ў нацыянальнай бясьпецы Віктар Лукашэнка — старэйшы сын Аляксандра Лукашэнкі. Раней у склад Рады бясьпекі ўваходзіла вузкае кола службовых асобаў: прэзыдэнт, дзяржсакратар Рады бясьпекі, прэмьер-міністар, кіраўнік Адміністрацыі прэзыдэнта, старшыні палатаў нацыянальнага сходу, старшыня Нацбанку, міністар фінансаў, а таксама кіраўнікі сілавых ведамстваў.

Былы сябар гэтай структуры Аляксандар Вайтовіч кажа: «Лукашэнка рыхтуе сабе пераемніка. А паколькі ён нікому не давярае, акрамя сына, дык, зразумела, што наступным прэзыдэнтам ён бачыць Віктара».

**Паводле радыё «Свабода»**

# Тое, пра што так доўга гаварылі незалежнікі, здарылася

Пра нафтавы канфлікт з Расеяй разважаюць Аляксандар Мілінкевіч, Уладзімер Нісьцюк, Сяргей Гайдукевіч, Юрась Беленькі, Зянон Пазьняк.

**Аляксандар Мілінкевіч**, лідэр Аб’яднаных дэмакратычных сілаў: «Гэта сумны фінал замежнай палітыкі Аляксандра Лукашэнкі. Гэта стала вынікам той эканамічнай сыстэмы, якая будавалася на падмане і непрафэсіяналізме. Учора яны прадалі «Белтрансгаз», заўтра прададуць нешта яшчэ. Беларуская эканоміка патрабуе карэннай мадэрнізацыі. У праціўным выпадку можа скласьціся такая сытуацыя, што рэжым, як апошні шанец на ўратаваньне, можа здаць суверэнітэт краіны».

**Уладзімер Нісьцюк**, адзін зь лідэраў БСДП (Грамада): «Тое, пра што мы, беларускія апазыцыянэры, так доўга казалі, яшчэ з часоў Зянона Пазьняка, пачынае зьдзяйсьняцца. Мы казалі, што нельга базаваць усе эканамічныя адносіны на гандлі толькі з адной краінай, якая да ўсяго іншага ня мае стабільнасьці ўнутры сябе. Нельга злучаць у адно эканамічныя сыстэмы дзьвюх дзяржаваў, прычым зусім супрацьлеглых. Дзікі капіталізм Расеі і дзяржаўны манапалістычны сацыялізм Беларусі. Ня можа існаваць такога панятку, як «саюзная дзяржава», калі абедзьве краіны застаюцца незалежнымі. Дала аб сабе ведаць энэргетычная залежнасьць ад Расеі. Мне здаецца, што ўрэшце бакі мусяць прыйсьці да згоды, але ад усіх гэтых падзеяў будзе прайграваць выключна Беларусь. Нават калі ўладзіцца гэты канфлікт, то Расея, не сумняюся, будзе шукаць іншыя рычагі ўплыву на Беларусь у гандлёвай вайне. У гэтым годзе, думаю, канфлікт з Расеяй ня вельмі адаб’ецца на жыцьці людзей, бо будуць выкарыстаныя рэзэрвовыя сродкі, а вось 2008 год чакаецца цяжкім. Мы зможам вытрымаць яго толькі ў тым разе, калі ўся нацыя аб’яднаецца на плятформе нацыянальнай ідэі».

**Сяргей Гайдукевіч**, лідэр Лібэральна-дэмакратычнай партыі: «Гэта ня тая тэма, пра якую гавораць у двух словах. Мы кажам пра глябальнае пытаньне. Калі б вы запыталіся пра тое, як я правёў Каляды, я б адказаў у двух словах, а гаварыць пра нафту ў такім ключы не выпадае».

**Юрась Беленькі**, намесьнік старшыні КХП-БНФ: «Нельга, каб краіна на 100% залежала ад паставак паліва зь любой іншай краіны, як адбывалася ў Беларусі. Гэтак Лукашэнка заклаў бомбу запаволенага дзеяньня, якая можа выбухнуць у любы момант. Разам з тым, сёньняшні канфлікт ня ёсьць эканамічным. Пытаньне стаіць аб захаваньні незалежнасьці Беларусі».

**Зянон Пазьняк**, старшыня Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі (цытата з сайту www.bielarus.net)): «Склалася такая сытуацыя, што шкурныя інтарэсы дыктатара ў пэўных аспэктах супадаюць з нацыянальнымі інтарэсамі народу. Нягледзячы на часовае супадзеньне задачаў, катэгарычна нельга аб’ядноўвацца з рэжымам Лукашэнкі. Для канфлікту паміж дыктатарамі характэрна таксама нязьменнасьць іхняе ўнутранае палітыкі. Яна не зьмяняецца ні пры якіх абставінах, як не зьмяняецца тыпаж пры ўладзе. Як былі антыбеларускія рэпрэсіі, так і застаюцца; як перасьледавалі беларускую моладзь, так і перасьледуюць, як нішчылі беларускую адукацыю, так і нішчаць, як была русіфікацыя, так і застаецца, нягледзячы на ўсю супрацьрасейскую рыторыку».

**Запісаў Зьміцер Панкавец**

### Вайтовіч: Лукашэнка вінаваты ў неэфэктыўным выкарыстаньні мільярдных датацый

Вялізарная віна Лукашэнкі перад Беларусьсю ў тым, што ён «штогадовыя мільярдныя расейскія датацыі ня выкарыстаў эфэктыўна для мадэрнізацыі эканомікі». Пра гэта акадэмік Вайтовіч заявіў у інтэрвію інфармацыйнаму агенцтву «Росбалт–Украіна». Паводле словаў Вайтовіча, ад сёлета датацыі значна зьменшыліся, а неўзабаве й зусім спыняцца. «І ўсе пабачаць, што кароль (чытайце, так званая і шырока разрэклямаваная «беларуская мадэль эканомікі») голы. Лукашэнка праз гэта губляе вытрымку і дапускае, мякка кажучы, недыпляматычныя выказваньні. У параўнаньні разьвіцьця сытуацыі з падзеямі леташняй т.зв. «газавай вайны» між «Газпромам» і ўкраінскім «Нафтагазам», Вайтовіч адзначыў: «Эўропа падтрымлівала Ючшанку і ня стане, вядома ж, падтрымліваць Лукашэнку».




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Хто ненадзейны?

Агляд замежных публікацыяў на тэму беларуска–расейскага энэргетычнага крызісу

Энэргетычная вайна вывела Беларусь на першыя старонкі сусьветных выданьняў. Калі расейскія мэдыі абураюцца дзеяньнямі «бацькі», дык большасьць заходніх вінавацяць у тым, што адбываецца, найперш Расею: з Лукашэнкам, маўляў, усё даўно было зразумела, а вось ад Пуціна мы такога не чакалі. У Расеі ненадзейным партнэрам называюць Лукашэнку, на Захадзе — Пуціна.

«Расейска-беларускі танец на трубе — гэта адчайнае змаганьне за выжываньне для Лукашэнкі, — піша польскі тыднёвік «Wprost». — Праблема ў тым, што, нават калі і ўдасца дасягнуць згоды, Уладзімер Пуцін не забудзецца на выбрык Лукашэнкі. Гэта азначае, што час калхозьніка Лукашэнкі сыходзіць».

«Расея сарвала перамовы зь Беларусьсю», — гэта загаловак іншага артыкулу «Gazety». «Пуцін намякае, што калі Менск не саступіць расейскаму ўльтыматуму, НПЗ у Цэнтральнай Эўропе могуць надоўга забыцца на пастаўкі нафты праз «Дружбу».

## Дружбе канец

Нямецкі тыднёвік «Die Zeit» зьмяшчае аналіз «Перакрытая «Дружба». На думку аўтара, канфлікт парадаксальны, бо Лукашэнка і Пуцін у многім падобныя — абодва схільныя да аўтарытарызму, а Беларусь даўно зрабілася для Расеі лябараторыяй, у якой выпрацоўваюцца палітычныя тэхналёгіі па задушэньні апазыцыі ды мэдыяў. «Расея ня дбае пра свой імідж», — піша журналіст. «Для Нямеччыны доступ да паставак энэрганосьбітаў з Расеі неабавязкова будзе азначаць большую энэргетычную бясьпеку, пра што сьведчыць досьвед Украіны і Беларусі».

«Канец сяброўству», — піша нямецкі «Spiegel». «Энэргетычная вайна зь Беларусьсю паказвае сьвету, наколькі груба Расея навязвае свае інтарэсы». «Калі паслухаць выказваньні расейскіх палітыкаў ды мэнэджэраў, ствараецца ўражаньне, што суседняя Беларусь за некалькі тыдняў ператварылася з партнэра ў «дзяржаву-ізгоя». Аўтары выданьня дыскутуюць, наколькі лягічным было рашэньне аб адмове ад разьвіцьця атамнай энэргетыкі ў Нямеччыне. У любым выпадку, «даверныя адносіны паміж крамлёўскім шэфам ды Захадам разбураныя».

## Масква разбурае давер

«Frankfurter Allgemeine Zeitung» выходзіць пад загалоўкам «Пуцінская бэнзынавая ўлада». «На памылках вучацца — гэта тычыцца і эўрапейскай энэргетычнай палітыкі. Занадта доўга вырашэньне праблемы энэргетычнай бясьпекі адкладалася на заўтра». «Масква разбурае давер», — так падае газэта рэакцыю кіраўніцтва Эўразьвязу ды Ангелы Мэркель на нафтавую блякаду.

«Труба маўчыць», піша брытанскае выданьне «The Economist». «Хаця гэты эпізод можа нанесьці чарговы ўдар па рэпутацыі Расеі як надзейнага пастаўшчыка энэргарэсурсаў, большая частка віны ляжыць усё-ткі на Беларусі. Калі ў нейкай ступені Расею і можна ў нечым абвінавачваць, дык гэта ў выбары тактыкі». Ва ўмовах высокіх цэнаў на энэрганосьбіты і без эканамічных рэформаў эканоміку Беларусі чакае калапс, падкрэсьлівае газэта, «і для ЭЗ — а ў першую чаргу для яго ўсходніх сяброў — гэта складае нашмат большую патэнцыйную пагрозу, чым непрацяглыя перапынкі ў пастаўках нафты».

## Час Расеі даць адпор

«The Washington Post» (ЗША) жорстка крытыкуе Крэмль: «Расея: вымагальніцтва працягваецца». «Мы яшчэ раз пабачылі пацьвярджэньне таго, што агрэсіўнасьць Крамля і выкарыстаньне энэрганосьбітаў у якасьці палітычнага інструмэнту б'е ня толькі па яго суседзях, але і па заходніх дэмакратыях... Зараз, пасьля нападу на Беларусь, ня можа быць і размовы пра патураньне Расеі».

«Даўно надышоў час даць пуцінскай Расеі жорсткі адпор», — піша брытанская газэта «The Financial Times». «Эўропе варта было б на хвілінку спыніцца і задумацца, ці не нясе яна ў гэтай сытуацыі хаця б частку адказнасьці за пагрозу ўласнай энэргетычнай бясьпецы. За апошнія гады Эўропа не зрабіла практычна нічога, каб супрацьстаяць усё больш аўтарытарнаму рэжыму Ўладзімера Пуціна ў Расеі. А для ўтаймаваньня жорсткай дыктатуры Аляксандра Лукашэнкі ў Беларусі Эўропа зрабіла яшчэ меней». Што да Расеі, дык ёй «наўрад ці варта дзівіцца, што дыктатура, якая выжывае адзінае за кошт гвалту ды падману, не паважае правілаў чэснай гульні, бо яна сама дбайна ўзрошчвала гэтую дыктатуру».

Прарасейская брытанская «The Guardian» займае прымірэнчую пазыцыю ў рэдакцыйным артыкуле «Вярнуцца з холаду ў цяпло». «Калі расейцы жадаюць прасоўваць свае эканамічныя інтарэсы, іх наўрад ці можна ў гэтым вінаваціць… Займацца бізнэсам з Расеяй проста неабходна».

## Сьцяг барацьбы

«Нафта супраць «Дружбы» — такі артыкул зьмяшчае газэта «День» (Украіна). У ёй рэжа вока катэгарычная заява: «У Беларусі Лукашэнку падтрымалі ўсе, уключна з апазыцыяй». Грунтуецца гэтая выснова на словах намесьніка галоўнага рэдактара «Белгазеты» Віктара Марціновіча: «У рэспубліцы назіраецца ашаламляльная кансалідацыя грамадзянаў вакол дзеяньняў прэзыдэнта… Невядома, да чаго гэта прывядзе, але для ўсіх, хто разумее, што адбываецца, на паверхневым узроўні, Аляксандар Рыгоравіч ператвараецца проста ў сьцяг нашай барацьбы за незалежнасьць».

«Лукашэнка капае нафтавую магілу і сабе, і Расеі», — піша «Маскоўскі

**Нафта патаньнела да рэкордных адзнак**

У аўторак цэны на нафту ўпалі да мінімальнага ўзроўню за паўтара году. За адзін барэль на рынку давалі троху больш за $54. Асноўныя прычыны палягаюць у цеплыні зімы, а таксама ў падзеньні попыту на рынку ў ЗША. Спыненьне паставак расейскай нафты з Расеі трубаправодам «Дружба» паўплывала на агульную сытуацыю толькі на вельмі кароткі тэрмін.

камсамолец» (Расея). «Разьвіцьцё сытуацыі па шляху канфрантацыі пагражае абодвум бакам незьлічонымі стратамі. Расея згубіць грошы і рэпутацыю надзейнага пастаўшчыка… Але калі нашая краіна наважыцца змагацца да канца, беларускі Бацька згубіць яшчэ больш: уладу, а, значыцца, краіну». Газэта прагназуе такі сцэнар: «Лукашэнку скіне нават не народ, а тыя, хто яго зараз падтрымлівають, каб самім застацца ва ўладзе ды з грашыма».

### Варыянт Мітволя

Расейскае інтэрнэт-выданьне gazeta.ru магло б быць шпаргалкай для зьляканых беларускіх міністраў: «Лукашэнка мае ў запасе дужа моцны ход — «варыянт Мітволя» (кіраўнік расейскага Фэдэральнага агенцтва па нагляду ў сфэры прыродакарыстаньня — заўв. Рэд.), — лічыць аналітык East European Gas Analysis Міхаіл Карчэмкін. — Беларускі ўчастак газаправоду Ямал-Эўропа, які належыць «Газпрому», быў пабудаваны ў 2003 г. Я пэўны, што на трасе можна знайсьці мноства парушэньняў прыродаахоўчых законаў Беларусі». Напрыклад, на фатаздымках з космасу добра бачна, што шырыня землеадводу амаль у тры разы перавышае нарматыўныя 45 м. «Беларусь можа цалкам накласьці на «Газпром» шматмільярдныя штрафы, — лічыць экспэрт. — І нібыта законным шляхам атрымаць ва ўласнасьць 51% транзітнага газаправоду. Я думаю, мы хутка пачуем словы Лукашэнкі пра тое, што «газаправод Ямал-Эўропа — гэта звыродлівы шнар на твары «сінявокай Беларусі».

### Трубадуры

«Трубадурь» — такі артыкул зьмяшчаюць расейскія «Известия». «Несаступнасьць прэзыдэнта Лукашэнкі каштуе Расеі 3,5 — 4 млрд даляраў». «Кожны новы год у нас пачынаецца весела. Згаджаючыся на нявыгадныя для іх умовы газавага кантракту, беларускія чыноўнікі, мабыць, усьміхаліся. Яны ўжо ведалі, які сюрпрыз чакае Расею. Гандлёвая вайна рэзка і, відавочна, незваротна зьмяніла палітычны расклад паміж нашымі краінамі. Пасьля такога канфлікту ўжо немагчыма будзе казаць пра саюзную дзяржаву і, адпаведна, пра агульны парлямэнт».

**Падрыхтаваў Алесь Кудрыцкі**

## «СБ»: «Экспансіяніссцкая палітыка Расеі пагражае сувэрэнітэту Беларусі»

Друкаваны орган Адміністрацыі прэзыдэнта — газэта «Советская Белоруссия» 10 студзеня зьмясьціла рэдакцыйны матэрыял пад назвай «Выпрабаваньне «Дружбай». На самым пачатку артыкулу зазначаецца, што за кулісамі перамоваў па нафтагазавых пытаньнях «хаваюцца рэчы больш значныя, чым нафтавыя мыты ці вэнтылі».«СБ» піша, што пад пагрозай апынулася беларуская незалежнасьць.

«СБ» рэзка крытыкуе Маскву. Газэта піша, што «не расейскі ўрад кіруе «Газпромам», а «Газпром» спраўляе баль на ўнутранай і замежнай палітыцы Расеі». Пэрыёдык заступаецца за Украіну і Грузію, «Украіну Крэмль душыў прыдуманымі мытамі на газ, разьвязаў дзікую антыгрузінскую кампанію».

Далей аўтар артыкулу адказвае на асноўныя пытаньні бягучага моманту.

Працяг на старонцы 12.



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Радасьць «Газпрому», смутак Сідорскага

А.Лукашэнка прызнаў, што ўказаньне падпісаць пагадненьне аб «Белтрансгазе» даў ён.

У апошнія хвіліны 2006 г. Беларусь падпісала дамову аб перадачы «Газпрому» кантролю над «Белтрансгазам», пераходзе на эўрапейскія цэны ад 2011 году і пастаўках газу ў Беларусь па $100 за тысячу кубамэтраў у 2007 г. Такім чынам, «Газпром» дабіўся сваёй галоўнай мэты — атрыманьня «Белтрансгазу».

Кіраўнік «Газпрому» Аляксей Мілер паінфармаваў, што ў будучыні цана на расейскі газ для Беларусі будзе вылічацца, зыходзячы з цаны на газ на эўрапейскім рынку. У 2008 г. цана на газ для Беларусі складзе 67 % ад цаны на эўрапейскім рынку за вылікам транспартных расходаў, у 2009 г. — 80 %, у 2010-ым — 90 %, у 2011 г. — 100 %. Дарэчы, няпэўны «вылік транспартных выдаткаў» можа азначаць 200, а можа і 170 ці 140, і пакідае вялікую прастору для маніпуляцый.

Стаўка транзыту па сетках «Белтрансгазу» вырасьце з $0,75 да $1,45 за транспартаваньне тысячы кубамэтраў на 100 км. Мінус у тым, што гэтая стаўка зафіксаваная на 5 гадоў. Значыць, павышаць яе будзе немагчыма.

Цана $100 — найніжэйшая ў былым СССР. Аднак варта заўважыць, што Ўкраіна, якая будзе сёлета атрымліваць газ за $130, не перадала «Газпрому» кантролю над сваімі газаправодамі.

Расейскі канцэрн заплаціць $2,5 млрд за 50 % акцыяў «Белтрансгазу» грашыма з растэрміноўкай на чатыры гады. «Газпром» і Беларусь прынялі ацэнку незалежнага ацэншчыка, нідэрляндзкага банку ABN Amro. Варта нагадаць, што Аляксандар Лукашэнка сёлета ацэньваў кошт «Белтрансгазу» на 10 — 17 млрд даляраў.

«Я хачу падзякаваць беларускім калегам за канструктыўны дыялёг», — цытуе кіраўніка «Газпрому» агенцтва «Інтэрфакс».



WWW.SVABODA.ORG

**Сяргей Сідорскі (зьлева) і Аляксей Мілер пасьля перамоваў.**

Прэм’ер-міністар Беларусі Сяргей Сідорскі прызнаў, што кантракт «у цэлым нявыгадны для Беларусі»: «Ва ўмовах сёньняшняй эканомікі Беларусі рост у два разы цаны на газ для Беларусі — да $100, гэтая цана для эканомікі вельмі складаная, а, можна сказаць, непад’ёмная», — паведамляе агенцтва БелТА. Сідорскі ня выключыў, што ў выпадку дэфіцыту сродкаў для разьлікаў за газ краіна будзе прасіць у «Газпрому» растэрміноўкі.

«Паважаючы нашых партнэраў, паважаючы нашы адносіны, паважаючы нашых эўрапейскіх партнэраў, якія да нас цягам апошніх двух тыдняў зьвярталіся, мы вымушаныя былі пагадзіцца з гэтай цаной», — сказаў Сідорскі.

Беларускі ўрад мяркуе, што беларускую эканоміку чакаюць цяжкія часы пры цане газу $100. Між тым Літва, Польшча, Латвія будуць закупляць газ за $230 і не чакаюць значных эканамічных цяжкасьцяў.

Цана газу на эўрапейскім рынку прывязаная да цаны нафты. Вылічваецца, колькі энэргіі можна вырабіць з тысячы кубамэтраў газу, і ў залежнасьці ад цаны мазуты (нафты), зь якой можна вырабіць такую сама колькасьць энэргіі, атрымліваецца цана газу. Вядома, сабекошт здабычы нафты й газу намнога меншы, што дае супэрпрыбыткі краінам, багатым на радовішчы вуглявадародаў (Расея, Нарвэгія, краіны Арабіі да інш.)

Перамовы ў маскоўскім офісе «Газпрому» доўжыліся 30 — 31 сьнежня. На нарадзе з адміністрацыяй 4 студзеня А.Лукашэнка прызнаў, што ўказаньне падпісаць пагадненьне аб «Белтрансгазе» даў ён.

Аналітыкі ў Маскве, блізкія да «Газпрому», не выключаюць, што беларуская ўлады паспрабуюць нейкім спосабам адыграць назад пагадненьне, падпісанае 31 сьнежня. Але, на іхную думку, «Газпром» цяпер «Белтрансгазу» не папусьціць.

У Беларусі было дзьве стратэгіі: плаціць за газ даражэй, але трымаць «Белтрансгаз» як стратэгічны нацыянальны набытак, або атрымліваць газ таньнейшы і аддаць газаправод. Лукашэнка выбраў другое.

**Мікола Бугай**

# Першыя ластаўкі крызісу

Першыя цяжкасьці пасьля падаражаньня расейскіх энэргарэсурсаў адчуў шэраг прадпрыемстваў.

Дзяржаўныя СМІ паведамляюць пра складаную сытуацыю на гарадзенскім «Азоце» ды менскім «МАЗе».

Па зразумелых прычынах ад падаражаньня пацерпяць у першую чаргу прадпрыемствы, дзе тэхналягічны працэс непасрэдна зьвязаны з нафтай і газам.

Менскі аўтазавод адчуе новы кошт на расейскі газ, які для заводу з Новага году павялічыцца на 94%. Але доля выдаткаў на газ у сабекошце прадукцыі МАЗу складае толькі 5%, у той час значна большыя выдаткі на электра- і цеплаэнэргію, якія ўзрастуць на 50 і 32% адпаведна. Падлічана, што рэнтабэльнасьць прадукцыі зьнізіцца на трэць, а агульныя страты ад падвышэньня коштаў на энэргарэсурсы складуць прыкладна $35 млн. На заводзе чакаюць падаражаньня камплектуючых, але пэўнай інфармацыі пра кошты ад пастаўшчыкоў пакуль не атрымана. Толькі ў Беларусі МАЗ супрацоўнічае са 144 прадпрыемствамі.

На гарадзенскім «Азоце», які спажывае каля 1,4 млрд кубамэтраў газу ў год, стрымана кажуць пра тое, што прадпрыемства будзе працаваць, але дзеля гэтага неабходна скарачаць выдаткі ды шукаць рэзэрвы. І, безумоўна, у сёньняшніх умовах без дзяржаўнай дапамогі прадпрыемству будзе дужа няпроста.

ААТ «Азот» — асноўны вытворца азотных угнаеньняў. Газ тут выкарыстоўваецца і як сыравіна для вытворчасьці асноўнай прадукцыі, і ў якасьці паліва для працы тэхналягічнага абсталяваньня.

Падаражаньне паліва зрабіла нерэнтабэльнай вытворчасьць угнаеньняў. Цяпер на «Азоце » чакаюць рашэньня ўраду пра льготы.

Адна з найбольш залежных ад коштаў на газ галіна прамысловасьці — вытворчасьць цэмэнту. Міністар архітэктуры і будаўніцтва Аляксандар Селязьнёў паведаміў, што ў 2007 г. кошт 1 тоны беларускага цэмэнту складзе $70, то бок узрасьце на 30%. Міністар супакойвае, што гэта ўсё адно канкурэнтаздольны кошт у параўнаньні з коштамі на польскую ці ўкраінскую прадукцыю. Са словаў міністра, беларускі вытворца цэмэнту «Крычаўцэмэнташыфэр» мае магчымасьць скараціць выдаткі за кошт зьмены тэхналёгіі. Пераход на так званы сухі спосаб вытворчасьці дазволіць зьнізіць энэргазатраты на вытворчасьць прадукцыі ў яе сабекошце з 40 — 50% да 15 — 18%. Аднак незалежныя экспэрты пярэчаць, што вытворчасьць беларускага цэмэнту балянсавала на мяжы стратнасьці і пры старых цэнах.

Відавочна, што новыя кошты на расейскае паліва адчуюць ня толькі ў нафтагазавых гарадох кшталту Наваполацку, але і ў кожнай сям'і. На адной з апошніх прэс-канфэрэнцыяў першы намесьнік міністра энэргетыкі Эдуард Таўпянец зазначыў, што грамадзкі сэктар чакаюць зьмены ў пляне энэргазабесьпячэньня. Будзем вучыцца эканоміць.

**Сямён Печанко**




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Намесьнік міністра энэргетыкі Эдуард Таўпянец аддае перавагу вадзе з газам.**

# Давайце пабачым, што будзе заўтра

Што насьцярожвала – што ўвядзеньне нафтавых мытаў адбылося дэманстратыўна, у жывым эфіры. Тонкая палітыка так ня робіцца. Гэта была бравада, гульня на беларускую публіку. Глядзіце, Гарант канстытуцыі змагаецца за наша самае дарагое, за нашу нацыянальную незалежнасьць.

Праз два дні пасьля газавага ляманту Гарант разьвёў рукамі і прадаў «Белтрансгаз»: маўляў, іншага выхаду не было. Толькі не кажыце мне, што 29-га ён ня ведаў, што зробіць 31-га.

Праз шэсьць дзён пасьля ўвядзеньня нафтавых мытаў яны адмененыя. Расея патрабуе выканаць яшчэ й акт прыніжэньня — вярнуць 80 тыс. тонаў нафты. Фактычна прызнаць факт крадзяжу.

Давайце пабачым, што будзе заўтра. Ня дай Бог «Іншага выхаду няма» нумар два.

Бо выхад ёсьць! Няма чаго выдумляць ровар, на ім ужо праехалі нашы суседзі.

Барацьба за незалежнасьць заключаецца ня ў лямансе і нараканьнях на імпэрскую Маскву, а ў выбудоўваньні альтэрнатываў, выхадзе з залежнасьцяў. Дакуль на 16-м годзе незалежнасьці Беларусь атрымлівае 90% энэрганосьбітаў з адных рук, гэта ніякая не барацьба за незалежнасьць.

З часу папярэдняга адключэньня газу прайшло два гады. Што зроблена? Спажываньне газу вырасла. Спажываньне нафты вырасла. Доля Расеі ў энэргабалянсе вырасла. Ніводнага альтэрнатыўнага шляху энэргапаставак не збудавана. Больш за тое, Беларусь маніякальна псавала адносіны з усімі краінамі, праз якія тыя шляхі маглі б пралегчы. За танны газ Беларусь даплачвала незалежнасьцю.

За час нафтагазавай гістэрыі мы пачулі крайне цікавыя рэчы. Аказваецца, пры ўмовах, якія прапануе Расея беларускую эканоміку чакае каляпс. Вось табе і беларуская мадэль. Літоўская эканоміка вытрымлівае павышэньне цэнаў да 230-ці, польская – да 270-ці, а ўкраінская зь яе мэталюргіяй – да 130-ці. Ніякіх зямлянак на гары Гедыміна ня рыюць і ў саюзы з Расеяй ня лезуць. Значыць, і 100 для беларускай ня створыць пагрозы незалежнасьці. Нагнятаньне страсьцей патрэбнае для аднаго — таго, хто прыпіша сабе заслугу ўратаваньня беларускай маёмасьці і беларускай эканомікі. Таго, хто нам пэнсіі плаціць. Таго, хто газам забясьпечыў. Гаранта незалежнасьці. Таго, дзякуючы каму мы засталіся жыць у панэльным доме. Хто ня даў краіне вярнуцца ў зямлянкі.

«У зямлянкі пойдзем, а на шантаж не паддамося». І ў чым жа наша непаддача: прадалі мову, прадалі сьцяг, цяпер прадалі «Белтрансгаз»... У чым наша незалежнасьць застаецца? У наяўнасьці ўласнага прэзыдэнта?

Незалежнасьць Літвы гарантаваная, бо прэзыдэнт Літвы ня вольны ёю распараджацца аднаасобна. Ёсьць парлямэнт, грамадзянская супольнасьць мае права голасу, і свабодныя СМІ.

Незалежнасьць Беларусі стане гарантаванаю толькі тады, калі самадзяржаўя ня будзе.

**Барыс Тумар**




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## АПЫТАНЬНЕ «НН»

**Ці ўхваляеце Вы рашэньне А.Лукашэнкі прадаць «Белтрансгаз» «Газпрому»?**

| | |
|---|---|
| Так | 26 (8.3%) |
| Не | 256 (81.5%) |
| Іншага выйсьця не было | 26 (8.3%) |
| Чым больш у нас усяго саюзнага, тым лепей | 6 (1.9%) |

Усяго прагаласавала: 314

## «СБ»: «Экспансіянісцкая палітыка Расеі ...»

**Працяг са старонкі 9.**

«Ці пагражае яўна экспансіянісцкая палітыка Расеі беларускаму суверэнітэту?». — «Так, пагражае».

«Ці не зьяўляецца палітыка Расеі парушэньнем Будапэшцкага мэмарандуму 1995 г., па якім Расея, Англія і ЗША зьяўляюцца гарантамі беларускай незалежнасьці?». З гэтага ўзьнікае пытаньне: дык што, нам цяпер варта зьвяртацца да Брытаніі і ЗША, каб абараніць свае гарантыі? Адказ такі: «Пра Лёндан і Вашынгтон, без сумневу, трэба ўзгадаць... Таму дзяржавы, якія клапоцяцца пра наш прэстыж, павінны ўспомніць, што прэзыдэнты іх краінаў у свой час публічна гарантавалі Беларусі абарону сувэрэнітэту». Афіцыйны Менск засьцерагае свайго ўсходняга суседа, што, у выпадку чаго, можа пераарыентавацца на Захад.

Разам з тым газэта зазначае, што «выхад з сытуацыі ёсьць. І ён павінен быць знойдзены на перамовах. Базавыя ўмовы такія: Расея зьяўляецца ўладальнікам нафты і мае права устанаўліваць любы кошт, Беларусь валодае камунікацыямі і таксама мае права прызначаць свае кошты. Трэба дамаўляцца».

**Зьміцер Панкавец**

# Новы вораг Лукашэнкі

Гэта выпеставаная ім самім палітычная і эканамічная эліта. Піша **Андрэй Павач.**

Ці ведаеце, у чым розьніца паміж Лукашэнкам і выпеставанай ім за апошняе дзесяцігодзьдзе палітычнай і эканамічнай элітай? Лукашэнка, пры ўсіх «але», па-свойму любіць Беларусь і мае пэўныя прынцыпы. Ягоныя набліжаныя ня любяць Беларусі і ня маюць ніякіх прынцыпаў увогуле. Усе гэтыя дырэктары гэтак званых валаўтваральных прадпрыемстваў, міністры, буйныя банкіры, старшыні аблвыканкамаў і г.д., і т.п. разам са скодлішчам мясцовых райкамаўскіх, выканкамаўскіх, БРСМаўскіх і ўнівэрсытэцкіх патрыётаў складалі са сваім лідэрам дзіўны сымбіёз. Ніхто не прэтэндаваў на галоўнае месца ў прэзыдэнцкай «вотчыне», кожны ведаў сваё цёплае месца, знаў, калі трэба гучней закрычаць «ура», а Ён кагосьці караў, кагосьці мілаваў ці ўзвышаў, але збольшага ўсё было файна. Сапраўды, пакуль першаму прэзыдэнту Беларусі ўдавалася плыць у рэчышчы сваёй раней выбранай палітычнай лініі, чаму спрыяла станоўчая эканамічная каньюнктура, часам здавалася, што сыстэма не настолькі маразматычная, як падаецца на першы погляд.

Аднак у апошнія дні фэадальная сутнасьць беларускай сыстэмы ўлады, ды й па вялікім рахунку, усёй грамадзкай сыстэмы ў Беларусі праявілася найбольш яскрава. Адно слова аднаго чалавека — і ўсё з ног стала на галаву.

Найлягчэй пераарыентаваліся звыклыя да ідэалягічных ваганьняў начальства журналісты афіцыйных СМІ. Гэтыя ўжо даўным-даўно забыліся (а, можа, і ніколі ня ведалі) пра адну з запаведзяў журналіста «па-сапраўднаму любіць тое, што любіш, і ненавідзець тое, што ненавідзіш». Амаль імгненна лісьлівае аблізваньне «расейскіх братоў» зьмянілася бесперапынным лямантам пра «халодную газавую вайну з Расеяй». Затое на ўсіх ранейшых бізнэсоўцаў-інтэгратараў глядзець было шкада: разгубленыя твары, няўпэўненасьць, стомленасьць. А як жа, бо сёньня ім трэба абгрунтоўваць тое, катэгарычна супраць чаго яны былі ўчора. Хочаш ня хочаш, але скідай сваю элеганцкую, купленую за ўдала прададзены Расеі трысьняговы цукар тройку, бяры вушанку і лезь разам са сваім лідэрам у зямлянку. Але гэтага рабіць ня хочацца, ды і маскоўскія калегі, мабыць, пасьмейваюцца: «Ну, колькі ўжо можна, давайце да нас, тут значна лепей». Эканамічная эліта ў сваёй натуры прадажная, і разьлічваць на яе вялікі патрыятызм я б ня стаў. Да ўсяго, і Сідорскі першага студзеня ў Маскве выглядаў вельмі няблага. Не марыянэтка, мужык талковы. Гатовы палітычны лідэр!

Адным словам, калі ўважліва прыглядаесься да падзеяў некалькіх апошніх тыдняў, неяк адразу прычапляецца думка, што, здаецца, у Лукашэнкі зьяўляецца новы, мабыць, найбольш небясьпечны вораг — выпеставаная ім самім палітычная і эканамічная эліта Беларусі. Беспрынцыповая, далёкая ад разуменьня таго, што такое беларусы і Беларусь, якая проста можа спрацаваць паводле прынцыпу фэадалізму: калі фэадал не выконвае забавязаньняў перад сваімі падначаленымі, яго скідаюць.

А ўсе астатнія людзі, спытаеце вы мяне? Усе астатнія — трэці стан, які і пытацць ні аб чым ня варта. Пойдуць туды, куды павядуць іх старыя фэадалы разам з новым каралём.

Самае страшнае ў гэтай сытуацыі тое, што для многіх цяперашніх высокапастаўленых падначаленых Лукашэнкі незалежнасьць Беларусі — гэта ня больш чым пытаньне выгаднай эканамічнай каньюнктуры.

Але і кідацца разам з Лукашэнкам і ягоным спэцназам бараніць «зямлю пад белымі крыламі» не выпадае. Алегорыя, калі Лукашэнка каля зямлянкі адстрэльваецца ад расейскай пяхоты з кулямёта, а Мілінкевіч падае яму дыскі з патронамі, наўрад ці калі стане рэальнасьцю.

Сыстэма, завязаная на адным чалавеку, якой бы моцнай ні здавалася, неўнікнёна абрынецца. Адзінокі імпэратар, што пайшоў насуперак усіх сваіх васалаў, ня мае ніякіх шанцаў. За створаную ім «стабільнасьць» і «ўмацаваны сувэрэнітэт» мы заплацілі дзесяцьцю гадамі контрбеларусізацыі і маральнага распаду грамадзтва. А гэта занадта дарагая цана за ўсе мітычныя посьпехі. Баюся, не было гэта дадзена зразумець Лукашэнку дванаццаць гадоў таму, не зразумее ён гэтага і цяпер. Праўда, ён можа суцяшаць сябе тым, што, магчыма, гадоў праз дваццаць нейкі стары беларус скажа: «Вось пры Ім было добра і спакойна, а цяпер бардак». Менавіта таму і Ціта, і Садам маюць выразны шанец пераўтварыцца ў сьвятых.

Што ж рабіць нам — тым, хто разумее, што сапраўдны сувэрэнітэт — гэта ня газавы кран пад аховай уласных аўтаматчыкаў і ня ўдала падпісаны кантракт на пастаўкі нафты. Што ж рабіць нам, хто даўно заўважыў, што і Ўсход і Захад лічацца толькі зь сілай. Што ж рабіць нам, для каго сапраўдная незалежнасьць — гэта беларускамоўныя школы і ліцэі на вуліцах і плошчах імя Каліноўскага, Брыля і Быкава, гэта нацыянальнае войска пад бел-чырвона-белым сьцягам і моладзь, якая не сьпіваецца каля булдыроў, а чытае кніжкі і шануе сваіх настаўнікаў?

Думаю, не скажу лепш за аднаго з найвялікшых беларускіх патрыётаў ксяндза Вінцэнта Гадлеўскага. Напісаў ён гэтыя словы ў 1939 г., напярэдадні пачатку самай вялікай і страшнай у гісторыі чалавецтва завірухі: «Чым гэтая бура скончыцца — няма ведама. Адно для нас пэўнае, што калі б гэта бура не абмінула беларускага народу, дык галоўным правілам для ўсіх беларусаў, а такжа галоўным імкненьнем для ўсіх беларускіх дзеячоў павінна быць адно: **абарона і захаваньне беларускай нацыі.** Да гэтага ўсе мы павінны ісьці ня толькі ў часе супакою, але тым болей у часе буры. Абарона беларускага народу і захаваньне ягонага нацыянальнага вобліку павінна быць правілам для ўсіх беларусаў у кожных абставінах жыцьця». У гэтым найважнейшы зарок нашага адзінства, праўды і будучай Перамогі.

*Горадня*

# «Ніхто ня дасьць нам

Пра нафту, газ і БТ піша Віталь Тарас.

## Сьвята шызафрэніі

Каляднае беларускае тэлебачаньне дало, напэўна, багата матэрыялу для псыхааналітыкаў і псыхіятраў. Нехта яшчэ даўно заўважыў, што плюралізм у адной галаве хутчэй падобны да шызафрэніі.

Трэба было ў адным сюжэце «Панарамы» скрытыкаваць палітыку расейскіх энэргетычных манаполіяў і расейскі імпэрыялізм, каб адразу пасьля гэтага, безь перадыху, выкрываць імпэрыялізм амэрыканскі. А ў мэтах больш эфэктыўнай крытыкі выкарыстоўваць цытаты з салідных амэрыканскіх газэт кшталту The Wall Street Journal і The Financial Times. (Цытату наконт «хуліганства й бандытызму» расейскага боку ў дачыненьні да Беларусі БТ працытавала разоў трыццаць.) І пры гэтым трэба не забыцца абвінаваціць ва ўсім беларускую апазыцыю, якая нібыта ўзрадавалася грабежніцкім цэнам на газ.

У «Панараме тыдня» напярэдадні Раства сюжэт пра апазыцыю, з прадстаўнікамі якой сустракаліся ў Беларусі супрацоўнікі амбасады ЗША, заняў ці не ўдвая больш месца ў этэры, чым сюжэт пра эканамічныя дачыненьні з «хаўрусьнікам». А тэма праваслаўнага Раства нечуваным чынам была адсунутая ў канец галоўнай інфармацыйнай праграмы!

Пагледзеўшы ў гэтыя дні выпускі навінаў на беларускіх тэлеканалах, міжволі ўспамінаеш школьныя падручнікі савецкай гісторыі з мапамі: «Расея ў коле франтоў» у 1918 — 1919 г. Толькі Расея цяпер сама выступае ў ролі хаўрусьніка Антанты. (Апазыцыі ж, відаць, адводзіцца роля «белачэхаў», якія захапілі транссібірскую чыгуначную магістраль).

Зусім лішнім будзе тут згадваць БНР. Цікава, што А.Лукашэнка, назваўшы днямі сябе «першым кіраўніком незалежнай Беларусі», фактычна адсек ад яе гісторыі ня толькі Беларускую Народную Рэспубліку, але й БССР — сузаснавальніка ААН. Гісторыя Беларусі, як нам даводзяць, пачалася нават не ў 1991-ым, і не ў 1994-ым, а толькі цяпер, у гэтыя студзеньскія дні. Бо калі кіравацца лёгікай сучасных ідэолягаў, пакуль Расея забясьпечвала былую саюзную рэспубліку таннымі газам і нафтай, ніякай пагрозы сувэрэнітэту Беларусі не існавала. Гэта прагныя злыя дзядзькі ў Расеі, якія невядома скуль узяліся і чыіх імёнаў ніхто ня ведае, раптам вырашылі набіць кішэні далярамі за кошт братняй Беларусі, і тым самым зьнянацку паставілі яе перад неабходнасьцю бараніць незалежнасьць. Як той казаў, не было б шчасьця.

## Ніхто ня хоча жыць у зямлянках

Палохаючы беларускі народ пагрозамі з Усходу і Захаду, дзяржаўныя СМІ крыху перастараліся. Калі ні там, ні там не засталося хаўрусьнікаў ці проста «шчырых і прыстойных людзей» (выраз чыноўніка беларускай мытні), дык складаецца жахлівая карціна: мо сапраўды адзіным выйсьцем для беларусаў застаецца вайна супраць усіх?!

Характэрна, што тэма «сыходу ў зямлянкі» захліснула ў гэтыя дні многія сайты й блогі ў Інтэрнэце, і гэта ёсьць карыкатурна-іранічным адлюстраваньнем, свайго роду адваротным бокам дзяржаўнай прапаганды. Сапраўды, сьвет ацалеў таму, што сьмяяўся.

Але ёсьць у гэтым сьвяце дзяржаўнай шызафрэніі і іншы бок. Як вядома, процілеглясьці сыходзяцца. Аляксандар Мілінкевіч, іншыя дзеячы апазыцыі выказалі напярэдадні Новага году, так бы мовіць, стрыманы аптымізм у сувязі з маючым адбыцца пераходам у беларуска-расейскіх дачыненьнях на рынкавыя рэйкі. У відавочнай або невідавочнай форме выказваліся спадзяваньні, што сканчэньне «беларускага эканамічнага цуду» прывядзе да разбурэньня сацыяльнай стабільнасьці і, адпаведна, — рэвалюцыйнага абуджэньня масаў.

Калі б усё было так адназначна й проста, як гэта апісваецца ў падручніках марксізму-ленінізму... Надзвычай жорсткія санкцыі Расеі ў дачыненьні да Грузіі, як мы бачылі, прывялі толькі да яшчэ большай кансалідацыі грузінскай нацыі вакол прэзыдэнта Саакашвілі. (Будзем спадзявацца, у крамлёўскіх дарадцаў ня хопіць фантазіі дадумацца да падобных крокаў у дачыненьні да беларусаў, і ўчорашніх «братоў» ня стануць высылаць з Масквы ў Беларусь сотнямі ў заплямбаваных вагонах). Пры гэтым аўтарытарны характар рэжыму Саакашвілі канстатуюць ужо ня толькі лідэры грузінскай апазыцыі, але дэмакратычныя інстытуцыі ў краінах НАТО, куды Грузія імкнецца ўступіць.

Калі на хвіліну забыцца на існаваньне Абхаскай і Паўднёва-Асэтынскай праблемаў, дык Грузія паводле дзяржаўнага ўладкаваньня нагадвае Беларусь прыкладна 1997 — 1998 г.

Тым ня менш, Саакашвілі падчас свайго кароткага адпачынку ў Закарпацьці ва Ўкраіне бязь ценю іроніі падзякаваў крамлёўскаму кіраўніцтву за эканамічныя санкцыі супраць Грузіі, паколькі яны, паводле прэзыдэнта, вымусілі грузінскіх гаспадарнікаў варушыцца, шукаць новыя рынкі збыту ды проста рабіць прадукцыю канкурэнтаздольнай.

## Прыклад Славаччыны

Ці здольнае беларускае кіраўніцтва (ня толькі кіраўнік дзяржавы, але і прэм’ер, кіраўніцтва ўраду, міністэрства энэргетыкі, напрыклад, якому незалежнай прэсай было выдадзена столькі авансаў), а таксама кіраўнікі беларускіх прадпрыемстваў шукаць і знаходзіць альтэрнатывы цяперашняму стану рэчаў, калі можна выпускаць большую частку прадукцыі «на склад»? І забясьпечваць «сярэднюю зарплату» ў 400 даляраў пераважна з дапамогай друкавальнага станка? Ці гатовыя работнікі беларускіх заводаў шукаць працу за мяжой — да прыкладу, у той самай Расеі, або станавіцца дробнымі прадпрымальнікамі, якіх у Беларусі да апошняга часу трымалі за «вшивых блох»? І ці здольная апазыцыя патлумачыць людзям, што адбываецца? Самі па сабе эканамічныя варункі ня зробяць таго, што могуць і павінныя зрабіць інтэлектуальная і дзяржаўная эліты.

Мы бачым, што нават у ЭЗ зь ягоным вольным рынкам, больш-менш агульнымі правіламі народы розных

# выбаўленьня...»

краінаў па-рознаму рэагуюць на цяжкасьці пераходнага пэрыяду. Вядомы эканаміст Лешэк Бальцаровіч, які сыходзіць з пасады прэзыдэнта Нацыянальнага банку Польшчы, у інтэрвію «Газэце выборчай» аспрэчыў модную апошнім часам тэзу, быццам народы Цэнтральнай Эўропы, у першую чаргу палякі, стаміліся ад лібэральных рэформаў і таму шукаюць выйсьця альбо ў левай ідэалёгіі, альбо ў клерыкалізме ды антыкамунізме. Ён прыводзіць да прыкладу краіны Балтыі, дзе рэформы ідуць значна больш шпаркімі тэмпамі, чым у Польшчы, але правыя партыі не губляюць папулярнасьці. Прывёў ён да прыкладу і Славаччыну, якую ў сярэдзіне 1990-х ніхто не ўспрымаў сур'ёзна. У выніку рэформаў правага ўраду Дзурынды Славаччына займае цяпер адно зь першых месцаў у сьвеце паводле тэмпаў эканамічнага разьвіцьця, а рэформы аховы здароўя і органаў юстыцыі ў гэтай краіне лічацца ўзорнымі.

Хто ведае, калі б Беларусь распачала рэформы сьледам за Славаччынай, урад якой 12 гадоў таму ўзначальваў экс-баксёр, малаадукаваны папуліст Мечыяр, напэўна, цяпер перад беларускім кіраўніцтвам стаялі б праблемы зусім іншага маштабу і характару. І, мабыць, як калісь Славаччына, Беларусь нават спазнала б аднойчы радасьць чэмпіёнства ў сусьветным хакеі, а не ў бутафорскіх «калядных турнірах»?

Але гісторыя, як вядома, ня мае ўмоўнага ладу.



WWW.KOMMERSANT.COM

**...а кран, як выявілася, закрываўся па той бок мяжы.**

## Раніцой мы прачнуліся?

І ўраду, і апазыцыі, і грамадзтву Беларусі ў цэлым давядзецца прывыкаць жыць і дзейнічаць у зусім новых прапанаваных абставінах. Традыцыйны журналісцкі штамп — «мы прачнуліся ў зусім іншай краіне» — 1 студзеня 2007 г. нечакана спраўдзіўся. Ці, прынамсі, можа спраўдзіцца цягам бліжэйшых месяцаў.

Няма больш міту пра саюзную дзяржаву Беларусі й Расеі. Няма міту пра братэрства славянскіх народаў. Зразумела, як толькі міт пра Саюз лопнуў, зь яго, бы з расейскай матрошкі, вылез стары новы міт пра Рэспубліку Беларусь, якая захавала ў сабе і нясе сьвету ўсё найлепшае, што было ў Савецкім Саюзе. Савецкая Расея, як мы памятаем з падручнікаў гісторыі, выжыла й ператварылася ў таталітарнага монстра зь ядравай дубінай. Для гэтага давялося замарыць голадам мільёны людзей, мільёны астатніх загнаць у ГУЛАГ.

Ці гатовая Беларусь на пачатку новага тысячагодзьдзя яшчэ раз заплаціць — хай зусім не такую цану, значна меншую — усяго толькі лёсам будучых пакаленьняў за тое, каб усьвядоміць, што яна можа захавацца толькі як эўрапейская краіна? Краіна са сваім адметным нацыянальным тварам, а не глухая расейская правінцыя са сваімі ўласнымі грашыма, мытнямі ды астрогамі.

Апазыцыйныя сілы, як вядома, так і не выпрацавалі агульнай стратэгіі што да выбараў у мясцовыя саветы. Беларускае тэлебачаньне з радасьцю цытавала нядаўна словы Мілінкевіча, які скрытыкаваў апазыцыйныя партыі за правал перадвыбарчай кампаніі: хтосьці з дэмакратычных кандыдатаў вырашыў удзельнічаць, хтосьці зьняў кандыдатуру, хтосьці заклікаў да байкоту. Але на ягоную думку, як і на думку многіх дэмакратычных актывістаў, галоўнае, што давала выбарчая кампанія, — гэта магчымасьць данесьці да выбарцаў сваю пазыцыю. Гэта так. Але ці ёсьць яна на сёньняшні дзень? Ці было з чым ісьці актывістам да людзей? І ці хапае мужнасьці гаварыць зь імі на самыя складаныя тэмы — пра тое, як жыць далей, хто вінаваты і што рабіць.

# Адны ідуць, другія стаяць

Удзел аб'яднанай апазыцыі ў мясцовых выбарах не такі масавы, як быў чатыры гады таму. Усяго сёлета рэгістрацыю атрымалі 213 прадстаўнікоў апазыцыйных палітычных партыяў, што менш за 1 % ад агульнай колькасьці кандыдатаў. Выбары ў многіх буйных гарадах, такіх, як Віцебск ці Баранавічы, будуць практычна безальтэрнатыўнымі.

З прычыны шматлікіх парушэньняў выбарчага заканадаўства ў выбарах адмовіліся ўдзельнічаць дзясяткі актывістаў. Асабліва шмат тых, хто адмовіўся на Магілёўшчыне і Гомельшчыне.

У Менску на мясцовыя выбары ідуць старшыні АГП і ПБНФ Анатоль Лябедзька і Вінцук Вячорка, адзін зь лідэраў незарэгістраванага «Маладога фронту» Алег Корбан, сябры Партыі БНФ Вадзім Канапацкі, Сяржук Карповіч, Андрэй Клікуноў, Аксана Крываносава, Алесь Мыцько, Сяржук Карповіч — пераважна юнакі.

У Гомель удзел у выбарах возьме паплечнік Мілінкевіча Віктар Карніенка.

У Магілёве балятуюцца сябры Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) Юры Новікаў і Сяргей Фамін. У Бабруйску ад БСДП (Грамада) на выбары ідзе Алена Мядзьведзева.

У Жодзіне пазмагаецца за мандат Аляксандар Валчанін. У Барысаве альтэрнатыўнымі будуць толькі тыя акругі, дзе будуць удзельнічаць незалежныя кандыдаты. Сярод апошніх сябры АГП Леў Марголін, Віктар Гарбачоў, эканаміст Зьміцер Бабіцкі.

У Берасьці ў выбарах прымае ўдзел Яўген Бяласін (і за яго ўжо ўчапілася падатковая інспэкцыя). У Бярозаўскі раённы савет балятуецца сябра Партыі БНФ Анатоль Сахаруша. На другі тэрмін хоча пераабрацца ў Белаазерскі гарсавет Юрась Губарэвіч.

Кандыдат у дэпутаты Пінскага гарадзкога савету Аляксандар Васільеў быў арыштаваны на сямёра сутак і за выбарамі будзе сачыць праз краты.

Лідэр аб'днаных дэмакратычных сілаў Аляксандар Мілінкевіч, які быў зарэгістраваны сябрам шэрагу ініцыятыўных групаў дэмакратычных кандыдатаў, аб'езьдзіў паўкраіны, дзе меў сустрэчы з выбарцамі. На гэтым тыдні ён наведаў Мазыр, Гародню, Глыбокае, Полацак.

У большасьці акругаў выбары будуць безальтэрнатыўныя. У сярэднім на адно месца прыпадае 1,04 кандыдата.

**Зьміцер Панкавец**

# Мілінкевіч рэзка крытыкуе партыйную апазыцыю

Лідэр Аб'яднаных дэмакратычных сілаў Беларусі Аляксандар Мілінкевіч даў ацэнку ходу палітычнай кампаніі «мясцовыя выбары» і падрыхтоўцы чарговага Кангрэсу дэмакратычных сілаў. На думку Аляксандра Мілінкевіча, «любыя заявы сёньня кіраўнікоў палітычных партый аб зьняцьці дэмакратычных кандыдатаў сьведчаць пра няўпэўненасьць у сілах гэтых кіраўнікоў, якія так і ня здолелі арганізаваць шырока разрэклямаванай агульнанацыянальнай палітычнай кампаніі «Мясцовыя выбары».

— На больш як 24 000 акругаў апазыцыйныя палітычныя партыі выставілі разам менш за 1000 кандыдатаў, але й гэтая лічба, паводле зьвестак інфармаваных людзей, завышаная ледзь ня ў два разы. У некаторых выпадках нават вядучыя палітыкі, спрабуючы зарэгістравацца, не змаглі фармальна выканаць элемэнтарныя патрабаваньні заканадаўства.

Склалася ўражаньне, што лідэры партый ня ведалі, у якіх умовах давядзецца праводзіць выбарчую кампанію. Размовы пра тое, што ўлады не друкуюць улётак, забараняюць сустрэчы, гучаць неперакanaўча. Мы [Рух «За Свабоду» — Рэд.] дзейнічалі паводле схемы: падавай заяўку, зьвяртайся да ўладаў, не дазваляюць — шукай магчымасьці і праводзь сустрэчы.

Сёньня канстатую, што палітычную кампанію «Мясцовыя выбары» можна назваць няўдалай. Нашы прапановы — адзіная палітычная кампанія, адна каманда, адно пасланьне, адзін сцэнар — не былі падтрыманыя. Таму хто як хацеў, так у выбарах і ўдзельнічаў.

У гэтых умовах мы вымушаныя былі зрабіць тое, што магчыма — зьбіралі подпісы, сустракаліся з выбарцамі, дэмакратычным актывам у 26 гарадах Беларусі. Да дня выбараў папрацуем яшчэ ў 15-ці населеных пунктах. Трэба да канца выкарыстаць усе магчымасьці для інфармаваньня людзей, і толькі пасьля прымаць рашэньне, здымаць ці не здымаць кандыдатаў», — адзначыў Аляксандар Мілінкевіч.

Ацэньваючы падрыхтоўку дэмакратычных сіл да Кангрэсу, Мілінкевіч зьвярнуў увагу на невыкананьне пагадненьня, падпісанага палітычнымі партыямі і зацьверджанага Палітычнай радай:

— Пагадненьне аб правядзеньні Кангрэсу, падпісанае кіраўнікамі палітычных партый і зацьверджанае Палітычнай Радай, не выконваецца па прынцыповых пытаньнях. Гэта падрывае давер як да Палітрады, так і да самога Кангрэсу. Сёньня некаторыя партыі называюць астранамічныя лічбы сваіх вылучэнцаў на Кангрэс. Журналісты пачынаюць высьвятляць — аказваецца, што сапраўдныя лічбы ў дзясяткі разоў меншыя.

Таму падрыхтоўку да Кангрэсу пакуль можна лічыць нездавальняючай. І самае кепскае, што шэраг кіраўнікоў партый не дэманструе волі зьмяніць сытуацыю ў лепшы бок, — мяркуе лідэр Аб'яднаных дэмакратычных сілаў Аляксандар Мілінкевіч.

# Адзін прэтэндэнт ужо застаўся бяз працы

Сябар Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамады), нядаўна абраны сябар Менскага гарадзкога камітэту Максім Касьцевіч два гады працаваў у вядомай фірме «Евроопт», якая займаецца агульна-раздробным гандлем харчовых тавараў. Працаваў ён як спэцыяліст у мэрчэндайзінгу і рэкляме. За два гады працы Максім ня меў заўвагаў ад сваіх начальнікаў, ня кажучы пра дысцыплінарныя спагнаньні. Наадварот, ён быў на добрым рахунку ў кіраўніцтва фірмы.

Праблемы ў маладога сацыял-дэмакрата пачаліся напачатку лістапада, калі ён надумаўся стаць кандыдатам у дэпутаты Менскага гарадзкога Савету на Адзінцоўскую выбарчую акругу № 30 і падаў дакумэнты на рэгістрацыю ініцыятыўнай групы.

Ну што, здавалася б, уладзе нейкі малады чалавек? Няхай сабе зьбірае подпісы, а яна, улада, ужо мае свайго кандыдата (дакладней, кандыдатку), якая «ўпэўнена пераможа» ў дзень галасаваньня. З такім складам выбарчых камісій няцяжка намаляваць любыя «вынікі галасаваньня».

Аднак улада за нешта пакрыўдзілася на Максіма Касьцевіча. Якое было зьдзіўленьне маладога спэцыяліста, калі яго паклікалі не да начальніка аддзелу, не да камэрцыйнага дырэктара і нават не да намесьніка генэральнага дырэктара, але адразу да Івана Гайка — генэральнага дырэктара «Евроопта».

Генэральны дырэктар заявіў Максіму Касьцевічу, што той пачаў горш спраўляцца са сваімі абавязкамі. Але ўсё наадварот: рэкляма «Евроопта» дзе толькі ні разьмешчана. Амаль усюды. І тады гендырэктар з усёй начальніцкай адкрытасьцю сказаў, што, заявіўшы аб сваім намеры стаць дэпутатам, малады спэцыяліст заняўся ...нёй (кожнаму даецца права прыдумаць слова). «Дальше мы вместе не полетим», — сказаў на разьвітаньне сп.Гайко.

Якое ж было зьдзіўленьне і намесьніка генэральнага дырэктара, і камэрцыйнага дырэктара, і начальніка аддзелу, калі яны даведаліся, што Максім Касьцевіч з 15 лістапада ўжо не працуе на фірме.

...26 кастрычніка прэс-служба БСДП (Грамады) апавядала пра звальненьне з працы маладога інжынэра «Магілёўліфтмаша» Ігара Барысава. Цяпер звольнены ягоны таварыш і равесьнік Максім Касьцевіч.

Некаторыя нашы «мысьліцелі», асабліва «незалежныя» журналісты і «палітолягі», маюць звычку паліваць партыі брудам: маўляў, мала вылучаюць, мала працуюць і гэтак далей. Хто з гэтых «мысьліцеляў» дасьць працу маладым людзям?

А колькасьць звольненых будзе — чым бліжэй да дня выбараў — узрастаць. «Палятуць» і прэтэндэнты на дэпутацкія мандаты (большасьць зь іх так і застанецца прэтэндэнтамі, бо акруговыя камісіі іх «зарэжуць»), «паляцяць» і многія сябры ініцыятыўных групаў (сьпісы ж у выбарчыя камісіі пададзеныя), і іншыя актывісты. А нашы «мысьліцелі» будуць казаць: партыі працуюць кепска, працуюць мала.

**Анатоль Сідарэвіч**

КАМЭНТАР РЭДАКЦЫІ

# Да выбараў у мясцовыя саветы засталося чатыры дні, а апазыцыя ня вызначылася, што рабіць

14 студзеня ў Беларусі маюць прайсьці выбары ў мясцовыя саветы. Аднак лідэры дэмакратычнай апазыцыі так і не далі яснага адказу, што рабіць выбарцам у гэты дзень.

Рашэньне можа быць любым: ісьці на выбары і галасаваць там, дзе ў сьпісе ёсьць апазыцыйныя кандыдаты, і галасаваць супраць усіх там, дзе няма альтэрнатывы; або байкатаваць выбары. Але мусіць быць цьвёрдая, адзіная пазыцыя ўсяго незалежнага грамадзтва.

У абставінах, калі недзяржаўныя СМІ недаступныя большасьці грамадзянаў, прынцыповыя пасланьні фармуляваць як мінімум за месяц да падзеі, каб людзі пасьпелі перадаць іх з вуснаў у вусны.

Прэцэдэнт зь невыказваньнем яснай пазыцыі ўжо быў два гады таму, перад рэфэрэндумам 2004 г. Кіраўнікі апазыцыі так канчаткова і ня вызначыліся, што рабіць 17 кастрычніка. Байкатаваць рэфэрэндум, ісьці на выбары, забіраць бюлетэнь, а калі забіраць, то што зь ім рабіць і як рэзаць. Вынік мы ведаем.

Прычына зацяжак і няпэўнасьцяў зразумелая. Гэта адсутнасьць у апазыцыі дакладнага мэханізму прыняцьця рашэньняў. Ён можа зьявіцца, калі лідэр будзе надзелены паўнамоцтвамі і нагружаны адказнасьцю, і калі будуць прынятыя іншыя дысцыплінуючыя рамкі. Палітычная рада ня можа падмяніць лідэра. Гэты непаваротлівы орган можа два тыдні рыхтаваць пазыцыю Дэмакратычных сілаў у газавым канфлікце і пасьля яшчэ тыдзень узгадняць тэкст. І ніхто ні за што не адказвае, і няма з каго спытацца. Вячорка ківае на Лябедзьку, Лябедзька на Вячорку.

Беларуская апазыцыя яднае сумленных людзей, добрых спэцыялістаў. Яны здольныя настолькі ж эфэктыўна кіраваць краінай, як іх эстонскія ці славацкія калегі. Аднак палітычны эфэкт іхнае ахвярнае дзейнасьці, іх высілкаў часта нізкі праз элемэнтарную адсутнасьць дысцыпліны.

Разумных гісторыя вучыць, неразумных мучыць, кажа прымаўка.

**Рэд.**



**Павал Севярынец** — у 1998 — 2004 г. лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны.

ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

# Сьвята нараджэньня Сьвятла

Двойчы на Каляды — перад каталіцкім Раством і на Новы год — у Алешчу прыяжджае *рэтрацягнік* зь Менску. Адмыслова да яго прыбыцьця на плятформе чыгуначнай станцыі ставяць вялізную елку, увешаную гірляндамі, і гукаўзмацняльную апаратуру. Цягнік на пяць вагонаў, ахайнейшы за звычайны, спыняецца ля елкі ды стаіць цэлую ноч пад гукі дыскатэкі. Люксовыя купэ з тэлевізарамі. Мора гарэлкі й прысмакаў. Масавік-зацейнік зь мікрафонам... Алешча — самая паўночная станцыя Беларускай чыгункі, і камэрцыйныя туры на зімовыя сьвяты ладзяцца чыгуначнікамі пад тым соўсам, што якраз тут, на нашай Поўначы, жыве беларускі Дзед Мароз (прывезены разам са Сьнягуркай, ён робіць выгляд, што выходзіць з алешчынскага лесу). І хаця БТ ужо даўно раскручвае Дзеда Мароза зь Белавескае пушчы, ягоны чыгуначны канкурэнт перасяляцца з хлебнага месца нікуды не зьбіраецца.

Менскія госьці бяруць з сабою дзяцей, водзяць карагод вакол елкі, п'юць «Савецкае шампанскае» з гарла, гуляюць ноч і перад першым дызэлем з «максімкай» адбываюць дахаты. Алешчынцы й сіценцы вось ужо каторы год падцягваюцца на 25 ды 31 сьнежня сюды. Паглядзець. Зьбіраюцца на эстакадзе — адтуль добра відаць асьветленыя купэ й вагні вялікай елкі. Асабліва сьмелыя падыходзяць да плятформы й нават робяць спробу забрацца ў вагон-рэстаран. Зухаў выстаўляюць, і тыя вяртаюцца на эстакаду, каб пахваліцца, хто што бачыў і хто што пасьпеў сьперці.

Іншых відовішчаў зімовай парою ў вяскоўцаў няма. І Каляды, і Новы год ад іншых выходных адрозьніваецца хіба што большай, чым звычайна, колькасьцю выпіўкі й моцаю дэбошаў. Са сьвятамі тут віншуюць міліцыя ды «хуткая дапамога». Дый елку ў хаце мала хто ставіць: яловыя галінкі на эстакадзе — самае дакучлівае сьмецьце, а ў лесе кожны сукаруб кляне «ёлкі-палкі» за найбольшую гушчыню галінаў.

Увогуле, што адзначаюць беларусы з 25 сьнежня да 7 студзеня штогод — вялікае пытаньне. Зьмену нумару году? Безаблічнае *Раждзяство*?.. А што, да прыкладу, сьвяткуе галоўны дзяржаўны ідэоляг таварыш Рубінаў, які днямі выдаў-такі ваенную тайну: рэлігія — опіюм для народу? Няўжо, як піша Лёлік Ушкін, і праўда — дзень нараджэньня СССР 30 сьнежня ды дзень абвяшчэньня БССР 1

## ХРОНІКА

### 3 студзеня

#### «Брестскому курьеру» прад'явілі абвінавачаньне

**Рэдакцыя недзяржаўнай газэты «Брестский курьер»** атрымала ліст — копію адказу Мінсувязі **дэпутату палаты прадстаўнікоў Валянціне Качан**. У сьнежні дэпутат зь Берасьця зьвярнулася ў Мінсувязі з прычыны выключэньня газэты «Брестский курьер» з падпіснога каталёгу на 2007 г. і адмовы Берасьцейскага філіялу РУП «Белпошта» распаўсюджваць газэту па падпісцы, дастаўляць у раённыя цэнтры. У афіцыйным адказе за подпісам **намесьніка міністра сувязі Н. Гаўрылавай** сьцьвярджаецца, што ў 2006 г. газэта «ня ў поўнай меры выконвала ўмовы дамовы, што выклікала за сабой дадатковыя матэрыяльныя і працоўныя выдаткі з боку пошты. На парушэньне дамоўных абавязкаў неаднойчы указвалася рэдакцыі газэты кіраўніцтвам Брэсцкага філіяла РУП «Белпошта». Галоўны рэдактар «Брестского курьера» **Мікалай Аляксандраў** паведаміў: за 16 гадоў існаваньня газэты рэдакцыя не атрымлівала ад кіраўніцтва пошты ніводнага паведамленьня, дзе б згадваліся факты парушэньня дамоўных абавязкаў з боку рэдакцыі.

### 4 студзеня

#### Пікет у Салігорску

4 сьнежня ў Салігорску сябры незарэгістраванага «Маладога Фронту» арганізавалі пікет ля цэнтральнага рынку. Яны вывесілі транспарант «Не — выбарам без альтэрнатывы!» і раздавалі мінакам улёткі з заклікам да байкоту выбараў. Акцыя была прымеркаваная да рашэньня Палітрады дэмакратычных сілаў Салігорску байкатаваць мясцовыя выбары. Міліцыянты затрымалі **Івана Шылу й Андруся Тычыну**. На І.Шылу склалі пратакол за «удзел у несанкцыянаваным пікеце» і за парушэньне Закону аб друку. Пасьля маладзёнаў адпусьцілі. Маладафронтаўцы раздалі на вуліцах некалькі тысячаў інфармацыйных улётак.

### 5 студзеня

#### Студэнтку БДЭУ вэрбуе КДБ

Студэнтка факультэту мэнэджмэнту Эканамічнага ўнівэрсітэту **Яна Карповіч** накіравала генпракурору скаргу на дзеяньні супрацоўнікаў КДБ. Паводле скаргі, **супрацоўнікі КДБ** аказвалі на студэнтку псыхалягічны ціск, намаўлялі на супрацоўніцтва, пагражаючы выключэньнем з унівэрсытэту. Я.Карповіч зьяўляецца сябрам ініцыятыўнай групы кандыдата ў дэпутаты Менгарсавету, актывіста апазіцыі **Алега Корбана**. Спэцслужбісты змушалі дзяўчыну адмовіцца ад удзелу ў ініцыятыўнай групе Корбана.

#### Актывіста АГП вінавацяць у падробцы дакумэнтаў

Супраць **сябра АГП Аляксандра Булаўкіна** заведзеная крымінальная справа паводле **арт. 192 КК**. Нагодай стала нібыта падробка А.Булаўкіным пратаколу пасяджэньня мясцовай суполкі АГП, пасьля перададзенага ў Круглянскую раённую выбарчую камісію з мэтай рэгістрацыі кандыдатам у дэпутаты Круглянскага райсавету. Пастанову аб узбуджэньні крымінальнай справы прыняў старэйшы сьледчы РУУС г.п. Круглае **Чысьцякоў А.В.** Кіраўніцтва АГП пацьвярджае факт вылучэньня Булаўкіна кандыдатам.

#### Новы год на нарах

Новы год **праваабаронца Валер Шчукін** сустрэў у Віцебскім ізалятары часовага ўтрыманьня. 30 сьнежня ён быў асуджаны на 7 сутак арышту, бо прайшоў на закрытае паседжаньне аблсуду. Там разглядаліся скаргі апазыцыйных кандыдатаў у дэпутаты, якім адмовілі ў рэгістрацыі. Да 3 студзеня сп.Шчукін спаў на голых нарах: на навагодніх выходных пасцель не выдавалася.

#### Бабруйскага праваабаронцу вінавацяць у крадзяжы

У Бабруйску затрыманы **праваабаронца Ігар Ходзька**. Міліцыянты нібыта падазраюць яго ў зьдзяйсьненьні крадзяжу. Затрыманага адвезьлі ў апорны пункт ГУУС Бабруйскага выканкаму.

#### Суд над Мілінкевічам адкладзены

У судзе Кастрычніцкага раёну Менску адбылося судовае пасяджэньне па абвінавачаньні лідэра аб'яднаных дэмакратычных сілаў **Аляксандра Мілінкевіча** ў нібыта наўмысным незаконным перасячэньні мяжы зь несапраўднымі дакумэнтамі. **Судзьдзя Германовіч** вярнуў складзены памежнымі службамі аэрапорту «Менск-2» пратакол на дапрацоўку. А таксама задаволіў хадайніцтва А.Мілінкевіча, які запатрабаваў вярнуць ягонаму сыну пашпарт, адабраны яшчэ 29 лістапада летась. Палітыку пагражае штраф да 4,5 тысяч даляраў альбо два месяцы папраўчых работаў.

#### Гомельскіх дэмакратаў выціскаюць з вуліцаў

Кандыдатам у дэпутаты мясцовых саветаў гомельскай гарадзкой арганізацыі АГП адмаўляюць у правядзеньні сустрэчаў з выбаршчыкамі на ад-

студзеня?.. І няўжо багата люду будзе адзначаць Новы год паводле *рубінавых зорак*?..

Калі запытаць вяскоўцаў — дык што, урэшце, сьвяткуем на Каляды насамрэч? — тыя пацепнуць плячыма: «Ціпа... ну дзень жа прыбаўляецца!» Для іх Раство — проста сьвята нараджэньня сьвятла.

У Эвангельлі напісана якраз пра гэта. «Было Сьвятло сапраўднае, Якое прасьвятляе кожнага чалавека, што прыходзіць у сьвет. У сьвеце было, і сьвет празь Яго пачаў быць, і сьвет Яго не пазнаў» (Яна 1:9-10).

За елкамі, чакалядкамі, мандарынамі й санта-клаўсамі неяк згубілася, што дзьве тысячы гадоў таму на сьвет нарадзіўся Збаўца чалавецтва, Ісус Хрыстос.

Ёсьць глыбокі сэнс у тым, што нараджэньне Сына Божага адбылося ў самую цёмную зімовую ноч сярод галечы й холаду. У тым, што пасьля гэтага сьвята пачынаецца Новы год. Што якраз у гэтую пару чалавек падрахоўвае вынікі году мінулага й зазірае ў будучыню.

Для беларусаў у 2006-ым нарадзіўся сьветлы агеньчык Свабоды, Праўды й Справядлівасьці.

Хтосьці скажа: надта ж слабы агеньчык... Але Сын Чалавечы гэтаксама прыйшоў у сьвет слабым, безабаронным немаўлём.

Хтосьці скажа: ат, пастаялі на плошчы дзеці, АМАП іх расьпіхаў па аўтазаках, а потым з вучобы павыкідвалі, ды на эміграцыю. Але, каб спыніць прыйсьце Ісуса, улады таксама зьбівалі дзетак, а сьвятая сям'я мусіла ўцякаць у Эгіпет.

Хтосьці скажа: што ж яны ўсё церпяць, адно галадаюць ды лямантуюць?.. Але і наш Госпад скрозь увесь Свой зямны шлях цярпеў, пасьціў ды нёс людзям Слова.

І перамог на крыжы.

І ўваскрос, пакінуўшы людзям белую з чырваньню палатніну.

І павёў за Сабою пад гэтым сьцягам мільярды вернікаў.

Таму галоўная надзея для беларусаў у Новым годзе — не ў адмене эўрапейскіх прэфэрэнцыяў, ня ў рынкавых цэнах на расейскі газ і нават не ў Кангрэсе дэмакратычных сілаў. Галоўная наша надзея — у той падзеі, якую каталікі й пратэстанты сьвяткуюць 25 сьнежня, а праваслаўныя — 7 студзеня, і якая засталася ў смутнай памяці жыхароў Алешчы й Малога Сітна як *Дзень нараджэньня сьвятла.*

Нараджэньне Сьвятла — сымбаль і прадвесьце нашага нацыянальнага абуджэньня. Мы верым, можам і пераможам — бо Хрыстос нарадзіўся!

*в.Малое Сітна*

Галоўная надзея для беларусаў у Новым годзе — не ў адмене эўрапейскіх прэфэрэнцыяў, ня ў рынкавых цэнах на расейскі газ...

## ХРОНІКА

крытых пляцоўках у сваіх выбарчых акругах. Сябрам мясцовай арганізацыі АГП **Віктару Карніенку і Леаніду Судаленку**, якія балятуюцца ў абласны Савет дэпутатаў, а таксама **Міколу Калюку**, які балятуецца ў гарсавет, у гарвыканкаме патлумачылі: сустрэчы з выбаршчыкамі праводзяцца ў зачыненых памяшканьнях, зацьверджаных камісіяй. У Гомелі ж для мітынгаў прызначанае адно месца — пляцоўка перад ДК таварыства глухіх «Віпра». Гэты ДК знаходзіцца ў іншым раёне горада, далёка ад акруг усіх трох кандыдатаў.

### Апазыцыйным кандыдатам забаранілі праводзіць мітынг

Лідэрам магілёўскай абласной арганізацыі БСДП (Грамада) **Юр'ю Новікаву і Сяргею Фаміну** адмоўлена ў правядзенні мітынгу і пікету 6 і 12 студзеня.

Кандыдат у дэпутаты Магілёўскага гарсавету, вядомы ў горадзе грамадзкі актывіст **Зьміцер Салаўёў** у сувязі з гэтым накіраваў афіцыйную заяву ў гарадзкую выбарчую камісію аб зьняцьці сваёй кандыдатуры з удзелу ў выбарах.

### 6 студзеня

### Мілінкевічу чыняць перашкоды на Гомельшчыне

Аўтамабіль з Аляксандрам Мілінкевічам тройчы быў затрыманы міліцыяй у Гомельскай вобласьці, куды ён прыехаў як давераная асоба кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Саветаў. У Сьветлагорскім раёне міліцыянтам падалося, што кіроўца Мілінкевіча нецьвярозы, у Рэчыцы яны 2 гадзіны задавалі пытаньні наконт аднаго з апошніх рэчыцкіх крымінальных здарэньняў, а па шляху на Гомель міліцыянты зьвінавацілі вадзіцеля аўто і яго пасажыраў у тым, што яны непрышчэпленыя. Мілінкевіч не патрапіў ні на адну з заплянаваных сустрэчаў. І дэмакратычныя кандыдаты — **Анатоль Паплаўны** ў Гомелі, **Валеры Пуціцкі** ў Рэчыцы і **Віктар Раманішка** ў Сьветлагорску — падалі заявы аб зьняцьці сваіх кандыдатураў у знак пратэсту супраць дзеяньняў уладаў.

### Затрыманьне ў Бабруйску

Лідэр кампаніі «За свабоднае развіцьцё прадпрымальніцтва», кандыдат у дэпутаты ў мясцовыя саветы ад БСДП (Грамада) **Алена Мядзведзева** была затрыманая міліцыяй на некалькі гадзін. Прычыну затрыманьня не патлумачылі, у пастарунку правялі агляд асабістых рэчаў, сканфіскавалі ўлёткі. Пратакол жанчына не падпісала.

### 8 студзеня

**Праваабаронца Алег Воўчак**, кандыдат па Вясьнянскай выбарчай акрузе, зьняўся з выбараў. Прычынай стала адмова менскіх друкарняў надрукаваць яго перадвыбарчыя ўлёткі.

### Затрымалі за парушэньне Ўказу № 31

**Моладзевы лідэр Аляксей Шыдлоўскі** быў затрыманы ў цэнтры Менску за распаўсюджванне налепак «Джынс – за свабоду!». У Партызанскім РУУС Менску на яго склалі пратакол аб парушэньні Ўказу прэзыдэнта №31 «Аб добраўпарадкаваньні жыльлёвага фонду». Пасьля складаньня пратаколу хлопца адпусьцілі.

### У Віцебску канфіскавалі ўлёткі

Міліцыя канфіскавала 7-тысячны наклад улётак са зваротам да выбарцаў незарэгістраваных дэмакратычных кандыдатаў — алімпійскага прызёра і двухразовага чэмпіёна сьвету **Ігара Каныгіна**, былога старшыні штабу А.Мілінкевіча **Хрыстафора Жаляпава**, кіраўніка абласной арганізацыі БСДП (НГ) **Аляксея Гаўруцікава**, маці палітвязьня Паўла Севярынца Тацяны, рэдактара газэты прадпрымальнікаў «Мы і рынак» **Сяргея Парсюкевіча**. Кіроўцу легкавіка, які перавозіў наклад, **Ігара Цішкіна**, вінавацяць у парушэньні закону аб выбарах, яму пагражае суд і штраф да 10 базавых велічыняў альбо папраўчыя працы.

### 9 студзеня

### Гарадзенскіх «графітчыкаў» аштрафавалі

У судзе Ленінскага раёну Горадні адбыўся суд над **Вадзімам Логінавым і Аляксеем Крывінцовым**. Кожны аштрафаваны на 30 базавых велічыняў (930 тыс. рублёў). Гэта мінімальнае пакараньне прадугледжанае па **314 арт. КК РБ**.

21 верасьня мінулага году хлопцы нанесьлі на сьценах каледжу прыборабудаваньня і інтэрнату, у якім пражывае Крывінцоў, графіці антыдзяржаўнага зьместу па-беларуску.

У той самы дзень абодва гарадзенцы былі затрыманыя міліцыянтамі. І ўжо тады пакрылі матэрыяльныя выдаткі «за пашкоджаньне маёмасьці».

### Гомельскага актывіста вінавацяць у зьдзяйсьненьні ДТЗ

Супрацоўнікі Гомельскай міліцыі затрымалі каардынатара незарэгістраванага руху «За Свабоду» па Гомельскай вобласьці **Уладзімера Кацору**. Яго машына, паводле міліцыянтаў, некалькі дзён таму на невядомай шашы стала прычынай дарожна-транспартнага здарэньня.

**СП**

# Як моладзь займаецца палітыкай у Нямеччыне

Пасьля зьніжэньня выбарчага цэнзу да 16 гадоў чатыры гімназісты заснавалі партыю і сталі трэцяй палітычнай сілай у горадзе. А таксама: як арганізаванае мясцовае самакіраваньне і як праходзяць мясцовыя выбары ў Нямеччыне? Піша **Інга Пэтц**.

1998 год. Сьвет, здавалася, нейкім дзіўным чынам выйшаў з каляіны. «Кайзэрсьляўтэрн» адразу ж пасьля ўваходу ў бундэсьлігу стаў чэмпіёнам Нямеччыны. Францыя — чэмпіёнам сьвету ў футболе. Ян Ульрых ня выйграў *Tour de France*. Гэльмут Коль і Хрысьціянска-дэмакратычны зьвяз упершыню за 16 год прайгралі выбары ў бундэстаг. Нават у Мангайме, мястэчку між Кёльнам і Дусэльдорфам з 43 тыс. жыхароў, пачынала твaрыцца нешта неймавернае. Халодным сьнежаньскім днём чацьвёра падлеткаў сустрэлася ў дзіцячым пакоі. Між імі быў Даніель Цымэрман, 17-гадовы бялявы хлопец з жывымі вачмі і сьветлымі думкамі. «Мы хацелі нешта арганізаваць, — узгадвае ён. — Нешта вясёлае. Нам хацелася пасваволіць». Чатыры галавы думалі. Заснаваць гурт? Неарыгінальна. Тэатральную трупу? Надта бяскрыўдна. І тут узьнікла ідэя, якую Цымэрману і яго паплечнікам адразу ж удалося ажыцьцявіць. Ідэя, якая пасьля натхніла бурмістра Мангайму Томаса Дунхгайма на выказваньне: «Яны рабілі тут гісторыю». Такое палітыкі, можа, і ахвотна кажуць, але не пра іншых. Гімназісты рабілі гісторыю. Яны заснавалі партыю і назвалі яе «Пэто» (*Peto* — лац. «я патрабую»). Сярэдні ўзрост кіраўніцтва: 18,7 году. Мэты зразумелыя: моладзевую кавярню, танейшыя квіткі на аўтобус, начную лінію аўтобусаў. Не рэвалюцыйныя ідэі, якія зьмяняюць сьвет, аднак усё ж прагматычныя, яны мусілі зьмяніць сьвет у Мангайме.



**Фракцыя «Пэто» ў Гарадзкой радзе Мангайму.**

Партыі і грамадзянскія ініцыятывы ў Нямеччыне ўвесь час нехта засноўвае. Але каб вучні? Хіба іх не дастала, як вынікае з шматлікіх апытаньняў, палітыка і партыі? Цымэрман прызнаецца, што яго ня надта цікавіла палітыка. «Ну толькі ў цэлым. Але партыйная палітыка?!» Не, выкрыквае ён, як быццам ягоныя погляды і сёньня не зьмяніліся. «Мы былі ўсё ж крыху наіўныя». Як ён мог ведаць, што стане кіраўніком фракцыі і мясцовая прэса будзе ўтрапёна хваліць яго за прамовы на тэму бюджэту? «Нам нічога так моцна не перашкаджала, каб мы толькі таму хацелі нешта зьмяніць. Не, мы хацелі выпрабаваць сілы. Каб ведаць, чаго вартыя. Гэта было нашай мэтай». Цымэрман — не крыкун і не крытыкан. Ён старанна выбірае словы. Можна было б назваць яго дзялком цьверозага розуму альбо «зялёным» з рэалістычнай арыентацыяй. Аднойчы ў інтэрвію газэце адной марксісцкай партыі з Руршчыны ён мусіў тлумачыць, чаму «Пэто» не арганізоўвала мітынгаў. Гэта ж, як сьцьвярджаў інтэрвіюэр, найлепшы шлях прыцягнуць да сябе ўвагу. Інтэрвію не было надрукаванае. «Пэўна, мы для іх недастаткова радыкальныя, — кажа Цымэрман. — Але ўсё залежыць ад таго, што разумець пад словам радыкальны. Можна стаць заўважным і іншым чынам».

Напрыклад: канструктыўна выступаць у камунальнай палітыцы ў абарону моладзі. «Пэто» хацела, аднак, зрабіць нешта «ўласнае». І якраз таму не далучылася да моладзевых саюзаў папулярных партыяў. Цымэрман казаў: «У нас не было жаданьня сядзець сьпярша шэсьць гадоў у цёмных каморках ХДЗ ці СДПГ (Сацыял-дэмакратычная партыя Германіі), гатаваць каву і цягаць паперы. Паводле дэвізу «Глядзі, перш чым казаць» «Пэто» хацела сама займацца палітыкай і пры тым адразу ж — тут і цяпер.

Камунальная палітыка адкрытая такому піянэрскаму



**Інга Пэтц** — аўтар газэты «Зюддойчэ цайтунг», актывіст Германска-беларускага таварыства. Вялікі сябар Беларусі, арганізатар канцэртаў «N.R.M.» у Нямеччыне і сьвяткаваньня 100-годзьдзя «НН» у Бэрліне.




**Даніель Цымэрман заснаваў «Пэто» ў 17 гадоў.**

духу і жаданьню дзейнічаць. Прынамсі, фармальна. На камунальных выбарах адсутнічае 5-адсоткавы бар'ер і ў некаторых землях, як у Паўночным Рэйне — Вэстфаліі, галасаваць можна з 16 год. «Нам было патрэбна каля 1000 галасоў, каб здабыць адно месца ў Радзе. І гэта не было немагчыма». Пэто змагаецца за паляпшэньне дзіцячай і моладзевай палітыкі, увядзеньне нядзелі, вольнай ад машын, за стварэньне адукацыйных месцаў. І неафіцыйна за рэформу камунальнай палітыкі. Прэч застылыя партыйныя лягеры, неабходныя гнуткія большасьці, «што ўтвараюцца ў залежнасьці ад сытуацыі». Гэта мара Цымэрмана. Рэалізацыя якой, — згаджаецца ён, — адбудзецца няхутка. Усё яшчэ сядзіць у галовах тое, што толькі фракцыя вызначае лінію». Таму яны і ня хочуць палітычна падпарадкоўвацца. Выслоўе «Пэто» гучыць: «Мы ня справа, мы ня зьлева. Мы наперадзе».

«Яны працуюць вельмі канструктыўна. Гэта не натурыстая партыя, што заўсёды толькі супраць і ладзіць шуміху, — кажа дасьледчык партыяў Ульрых фон Алеман з Дусэльдорфскага ўнівэрсытэту. — Дробязны нэгатывізм, які звычайна пануе ў грамадзянскіх ініцыятывах і партыях, тут замянілі сьвежымі ідэямі. На пару з інтэлектуальным патэнцыялам і грамадзянскай падаплёкай». Жыхарам Мангайму спадабаўся сьвежы вецер зь дзіцячага пакою. На камунальных выбарах у 1999 г. партыя здабыла 6,1% — адпаведна 2 месцы ў Радзе. Цымэрмана там не было. Яму было тады ўсяго 17 год. Каб быць у Радзе, трэба было мець прынамсі 18. Аднак ён выступаў у ток-шоў, тлумачыў, чаму ў Мангайме некаторыя рэчы здаваліся іншымі, чым па ўсёй краіне. Журналісты прыяжджалі ў горад на Райне рабіць рэпартажы пра пасьпяховых заснавальнікаў партыі. І сёйтой з традыцыйных палітыкаў зелянеў з зайздрасьці, што нейкім вучням надаецца такая ўвага. Адзін сябра Гарадзкой рады ад ХДЗ сказаў неяк у інтэрвію: «Гэта добра, што моладзь бярэ ўдзел. Але было б яшчэ лепш, калі б яны далучыліся да нас». Шмат хто лічыў дасягненьне «Пэто» аднадзёным пасьпехам ці няшчасным выпадкам на вытворчасьці. Але атрымалася насамрэч сапраўдная гісторыя посьпеху. У 2004 г., на наступных камунальных выбарах, «Пэто» атрымала 16,6%. Партыя заняла сем месцаў у Радзе, пакінуўшы Свабоднай дэмакратычнай партыі (2 месцы), традыцыйнай трэцяй сіле ў Нямеччыне, былую камору, якую «Пэто» выкарыстоўвала да гэтага часу ў якасьці фракцыйнага офісу. Ззаду засталіся і «зялёныя» (2 месцы). «Пэто» стала трэцяй палітычнай сілай у Мангайме пасьля ХДЗ (18) і СДПН (11). Першыя пяць гадоў уплыў «Пэто» ў Радзе быў нязначным, але сёньня ні СДПН, ні ХДЗ ня могуць атрымаць большасьці бяз школьнікаў.

Паўстае пытаньне: як гэта ўсё магло здарыцца? «Іншыя партыі лічылі, што нас абралі з пратэсту. Я так ня думаю, — кажа Цымэрман. — Жыхары Мангайму ўбачылі, што мы можам і што мы спрабуем зламаць старыя лягеры. Больш за палову моладзі абрала нас. І дарослыя, канечне, таксама, інакш мы б не набралі 16%». Падчас выбарчай кампаніі ўсе кандыдаты ад «Пэто» красаваліся на вялізным постэры на фоне Райну. На ім стаяла: «Зорка — гэта каманда», «Наш камандны дух — найлепшы рэцэпт посьпеху». Мы ўжо даўно ведаем адно аднаго, часткова нават сябруем. Гэткім чынам, нам, канечне ж, прасьцей спрачацца міжсобку. Да таго ж мы, хоць крыху і дзёрзкія, але заўсёды спрабуем знайсьці найлепшае рашэньне». Напрыклад, у 2000-м у Радзе ішла гаворка пра тое, каб надаць адной вуліцы новае імя. «Пэто» прапанавала — «Гасьцінец валасянкі-чорнагаловіка». «Гэта від птушак, якім у нашай мясцовасьці пагражае выміраньне, — сказала колішняя сяброўка Гарадзкой рады Юліяна Войгт. — Мы хочам, каб жыхары Мангайму вывучылі нешта новае». Але ХДЗ не схацеў. У яго тады была абсалютная большасьць. Рашэньне было прынятае на карысьць больш традыцыйнага «Савінага гасьцінцу».

«Мы ня гонімся за эфэктамі ці пасадамі, мы займаемся сур'ёзнай палітыкай, — тлумачыць Ліза Рыдэль. — Мы можам нават працаваць надпартыйна: сябры «Пэто» маюць розныя палітычныя погляды. Мы хочам рабіць нешта разам. Убаку ад партыйнай грызьні». Яна размаўляе хутка, няўпынна. Жанчына з мноствам ідэяў. Ёй 22, і яна кіраўнік фракцыі «Пэто». Два гады таму яна трапіла ў маладую партыю, і яе хутка абралі ў кіраўніцтва. Яна замяніла Цымэрмана на пасадзе кіраўніка партыі і стала кіраўніком фракцыі. Цымэрман, у 24 гады адзін з найстарэйшых у «Пэто», сам адышоў на задні плян. «Гэта было даўно запланавана, бо інакш была небясьпека састарэць».

Рыдэль вывучае правы і трапіла ў «Пэто» незадоўга да выбараў. «Я тут адразу ж апынулася пры справе. Няма патрэбы спачатку выслугоўвацца, каб трапіць наверх. І для моладзі бяз нас рабілася б яшчэ меней. Мы — доказ таго, што можна нешта зьмяніць. Калі хочаш, ты можаш вельмі хутка пераняць адказнасьць. Спачатку ў кіраўніцтве, а пасьля і ў палітыцы». Ясна. Палітыка моцна зьвязаная зь бюракратыяй і пэўнай тактыкай дзеяньняў, і ёй таксама трэба было шмат чаму навучыцца: палітыка часта азначае — пераадольваць вялікія цяжкасьці. «Вымагаюцца цярпеньне і настойлівасьць». Таксама трэба дамагацца палітычнага плёну хутчэй у малых справах. Так, «Пэто» змагла адкінуць закрыцьцё стадыёну. І Рада адзінагалосна прыняла прапанову «Пэто» адносна адкрыцьця моладзевай кавярні. Канечне, партыя ня можа абмяжоўвацца толькі моладзевымі тэмамі. Яна як моцная палітычная сіла мусіць займацца ў

**Працяг на старонцы 22.**

# Як моладзь займаецца палітыкай у Нямеччыне

Працяг са старонкі 21.

Радзе ўсімі праблемамі і фармуляваць да іх прапановы, даказваючы сваю пазыцыю і погляд. У гаспадарчых пытаньнях, падтрымцы эканомікі, экалягічнай і транспартнай палітыцы. І тут «Пэто» патрапіла давесьці тое, што «бывалыя» ў палітыцы называюць інстынктам. Вучні запатрабавалі пры запляніраваным кальцавым руху разгрузіць дадаткова прылеглую галоўную вуліцу, чаго ўжо даўно дамагаліся мясцовыя жыхары. «Пэто» не баіцца зрабіць і непапулярную прапанову, калі ёсьць упэўненасьць у слушнасьці справы. Так адбылося, калі Рада Мангайму праз зьніжэньне калькасьці дзяцей мусіла была вырашыць, які зь дзіцячых садкоў гораду трэба закрыць.

Колькі часу Рыдэль прысьвячае палітыцы? «20 гадзін на тыдзень дакладна. Часам больш, часам менш. Але іншыя больш выдаткоўваюць на кампутарныя гульні ці тэлевізар. Я ж займаюся палітыкай». Пасьля яна сказала тое, што кажуць многія сябры «Пэто», калі пытаесься, чаму яны гэта робяць. «Бо гэта прыносіць задавальненьне».

Гэта можна назіраць у гарадзкім парку на ўскрайку Мангайму. Штогод «Пэто» ладзіць турнір у пляжным валейболе. На ярка-зялёнай траве горача. З панк-рокам, півам і вафлямі пасьля турніру распачынаецца вялікая вечарынка. Прыйшло каля 500 падлеткаў; калі запытацца, ці цікавяцца маладыя жыхары Мангайму палітыкай, то адказ ня будзе нечаканым. «Не. Ня вельмі, — кажа адзін вучань. — Але тое, што робіць «Пэто», мне даспадобы. Яны добра разварушылі Мангайм». На вечарынцы палітыка — ня першасная рэч, галоўнае — разам бавіць час. «Пэто, — напісала адна журналістка, — гэта як гурт, які падабаецца і на канцэрты якога ходзіш. Іх музычная радыёстанцыя называецца «Мангайм», тут іх заўсёды круцяць». Энтузіязм пануе і ў гасьцявой кнізе на хатняй старонцы «Пэто». «Вы робіце вартыя рэчы!» — можна прачытаць там. Альбо: «Супэрважна разбурыць заскарузлыя партыйныя структуры». Нават ад маладых сацыялістаў з Гамбургу прыходзяць кампліменты: «Рэспэкт. Актыўнасьць і ахвярнасьць моладзі для моладзі мусіць быць узнагароджаная адпаведным вынікам выбараў».

Сьпікер Нямецкага фэдэральнага саюзу моладзевых арганізацыяў Вольфганг Пэшэль лічыць, што грамадзянская заангажаванасьць моладзі часта недаацэньваецца: «Ужо сам панятак «палітыка» часта асацыюецца з партыйнай палітыкай. А палітыка пачынаецца там, дзе моладзь самаарганізуецца». «Пэто» злучае волю да грамадзкай заангажаванасьці моладзі з камунальнай палітыкай.

Калі заснаваць партыю так лёгка, чаму ж партыі школьнікаў не растуць па краіне, як грыбы пасьля дажджу? «Трэба моцна ангажавацца, — аналізуе фон Алеман, — палітыка адбірае шмат часу».

І тут — слова кіраўніку партыі. Маркус Райнгальд — атлетычны 18-гадовы хлопец у бэйсболцы і джынсах. Ён гаворыць яшчэ крыху няўпэўнена. Яго толькі нядаўна абралі кіраўніком «Пэто». Як ён трапіў сюды? «У 2004 г. была адна іх вечарынка. Мне спадабалася, што нехта дбае пра моладзь. Я паразмаўляў зь імі. І сёньня я кіраўнік!» Ён сьмяецца. Пасьля зноў робіцца сур'ёзным. «Я добры арганізатар, але палітычных амбіцыяў ня маю. Акрамя як у «Пэто». Мы ж дзейнічаем толькі ў Мангайме. Так можна засяродзіцца на справе і не займацца міжасабовымі сваркамі. Той, хто хоча працаваць у кіраўніцтве, даволі хутка сюды трапляе. Напрыклад, новай кіраўніцы фракцыі ўсяго 17». Заўсёды займацца гэтым ён не жадае. «Я хачу вывучаць машынабудаўніцтва. Тады я кіну». Можа, менавіта гэтая ідэя робіць «Пэто» такой прывабнай? Кожны можа ўзяць удзел, стварыць пляц ідэяў, які ў выніку пойдзе на карысьць іншым. Аднак партыя мусіць заўсёды клапаціцца пра зьмену. Бо, калі прыходзіць час на вышэйшую адукацыю, калі пачынаецца працоўнае жыцьцё, калі нехта зьяжджае з гораду ці проста губляе жаданьне гэтым займацца, тады канец з палітыкай і «Пэто». Партыя налічвае 190 сяброў. «Трэба прапанаваць моладзі стымулы. Мы нейк зладзілі акцыю: раздавалі марозіва, а разам зь ім фармуляры на ўступленьне. І калі часам нічога болей не функцыянуе, — сказаў Цымэрман, — тады мы бярэм партыйныя грошы і ладзім вечарынку. Найважней, каб мы добра правялі час». Для таго, хто ня лічыць сябе рэвалюцыянэрам, гэта гучыць даволі рэвалюцыйна.

Сваіх маладых палітыкаў «Пэто» залучае найперш у гімназіі імя Ота Гана. У яе шэрым будынку заснавальнікі партыі таксама некалі сядзелі за партамі.

Калі б Цымэрман быў у ХДЗ альбо СДПГ, ён ужо шмат зрабіў бы для сваёй партыі. Можа, яму б начапілі пачэсную значку і сябры з воплескамі ўздымаліся б пры яго зьяўленьні на летніх вечарынках і калядных фэстах мясцовага аб'яднаньня. Яму б паціскалі рукі, хацелі б быць паблізу. А так Цымэрман сядзіць на турніры па пляжным валейболе як роўны сярод роўных. Ці ня думаў ён калі-небудзь прэзэнтаваць «Пэто» на ўзроўні фэдэральнай зямлі альбо фэдэрацыі? «Не, у нас на гэта няма грошай. І тады было б складаней трымаць разам людзей. Адной моладзі недастаткова. Тое, што мы робім, можа функцыянаваць толькі на камунальным узроўні. Інакш патрэбная была б нейкая партыйная лінія альбо ідэалёгія». Ён усьміхаецца. Сёньня ён вывучае францускую мову і фізыку ў Кёльне і хоча працаваць выкладчыкам. Ці не разглядае ён мажлівасьці далучыцца да іншай партыі, каб стаць, можа, прафэсійным палітыкам? Цымэрман глядзіць на сонца. «На сёньня гэта не актуальна». Паўза. Але. Не. Ён ня можа выключыць гэтую мажлівасьць.

**www.peto.de**



**...а ў астатнім «Пэто» — файная моладзевая тусоўка.**

# Дэмакратыя па-славацку

Па-беларуску гэтай восеньню пабачыла сьвет кніга браціслаўскага Інстытуту грамадзкіх пытаньняў «Славацкая надзея: досьвед дэмакратычных трансфармацый». Рэдактарамі беларускай вэрсіі кнігі сталі філёзафы Валянцін Акудовіч, Алесь Анціпенка і Юрась Барысевіч.

Некаторыя дасьледнікі нацыяналізму лічаць, што найбольшыя праблемы з нацыянальнай ідэнтычнасьцю пры канцы XX стагодзьдзя мелі тры эўрапейскія народы: беларусы, украінцы й славакі. На сёньня нацыянальнае пытаньне яшчэ застаецца актуальным толькі для дзьвюх постсавецкіх дзяржаваў, а вось для Славаччыны яно засталося ўжо ў мінулым.

Чэхі і славакі на працягу многіх стагодзьдзяў жылі ў адной імпэрыі Габсбургаў, але разам з тым існавалі ў розных сусьветах. Чэхі знаходзіліся ў аўстрыйскай частцы дзяржавы, а славакі — у вугорскай. Яшчэ ў XIX стагодзьдзі славакі, як і беларусы, заставаліся вясковай нацыяй, на славацкіх землях, як і на беларускіх, адсутнічала навучаньне на роднай мове. На момант распаду Аўстра-Вугорскай імпэрыі Славаччына практычна ня мела сваіх палітычных, культурных, грамадзкіх элітаў. Будаўніцтва дзяржавы пачалося амаль з нуля. Пра гэта ў кнізе піша гісторык і палітоляг Мілан Земка.

Незалежнасьць Славаччыны была абвешчаная нават пазьней за беларускую, толькі 1 студзеня 1993 году. За дзесяцігодзьдзе краіна змагла пераадолець няпросты і неадназначны шлях ад постсацыялістычнай эканамічнай разрухі і палітычнай нестабільнасьці да паўнавартаснага сяброўства ў Эўразьвязе і NATO.

У сярэдзіне 90-х гадоў у Славаччыне, як і ў Беларусі, да ўлады прыйшоў кіраўнік з аўтарытарнымі замашкамі — папуліст Уладзімер Мэчыяр. Але ў адрозьненьне ад Беларусі Славаччына дала рады такому выкліку лёсу і захавала дэмакратычны характар кіраваньня.

Славацкія дэмакратычныя пераўтварэньні не праходзілі лёгка і незаўважна для насельніцтва. На розных выбарах палітыкі-папулісты заўжды набіралі і набіраюць значны адсотак.

Сёньня Славаччына ня мае патрэбы змагацца за дэмакратычныя каштоўнасьці, яна сама можа стаць эталёнам для некаторых краінаў, што імкнуцца да дэмакратыі, у тым ліку для Беларусі. Менавіта з такой мэтай і быў зроблены пераклад гэтай кнігі.

Ва ўводзінах да кніжкі старшыня браціслаўскага Таварыства сяброў Беларусі Павал Дэмэш піша: «Гаворка тут не пра гістарычныя рэмінісцэнцыі, тактыку дзеяньня або гвалтоўнае накідваньне грамадзка-палітычных ці жыцьцёвых узораў. Дзьве невялікія эўрапейскія краіны, зь якіх адной ужо ўдалося знайсьці шлях у эўрапейскую сям'ю дэмакратычных нацый, імкнуцца, у межах наяўных магчымасьцяў, бліжэй пазнаёміцца і весьці партнэрскі дыялёг».

Аўтарамі «Славацкай надзеі» зьяўляюцца вядомыя ў краіне палітолягі, журналісты, пісьменьнікі, гісторыкі, эканамісты, сацыёлягі. Яны на высокім эўрапейскім інтэлектуальным узроўні аналізуюць, якім чынам Славаччына змагла за адносна кароткі тэрмін прайсьці шлях да дэмакратыі.

Кніга мае пяць разьдзелаў: чыньнік гісторыі і славацкая незалежнасьць, барацьба за ўсталяваньне дэмакратычнай палітычнай сыстэмы, фармаваньне замежнай палітыкі і яе абрысы, эканамічныя пераўтварэньні, разьвітаньне зь мінулым і новыя рэаліі.

Для Беларусі сёньня найбольш цікавым падаецца эканамічны разьдзел кнігі. Яўген Южыца падрабязна апавядае пра эканамічныя рэформы ў Славаччыне ад 1991 году. Яны не даліся лёгка. У 1994—1995 гадах эканоміка Славаччыны празь ня дужа ўдалую палітыку ўраду трапіла ў паласу нестабільнасьці. Дзяржава штучна спрабавала захаваць на адным узроўні цэны на электраэнэргію, газ, цяпло, але такія захады не давалі плёну. Пад канец «эпохі Мэчыяра» 5-мільённая Славаччына мела агульную запазычанасьць 12 мільярдаў даляраў.

У 1998 годзе пасьля прыходу да ўлады ўраду Мікулаша Дзурынды новая эканамічная праграма найперш асноўвалася на правядзеньні празрыстай прыватызацыі і аднаўленьні празрыстасьці эканамічных дачыненьняў. Ня ўсё адразу ішло гладка. Славаччына аж да канца 90-х не магла дасягнуць фінансавых паказьнікаў 1989 году, але затое па цэлым шэрагу нефінансавых паказьнікаў (як колькасьць аўтамабіляў ці пабытовых рэчаў у карыстаньні) у разы пераўзышла ранейшыя.

Пераабраньне ў 2002 годзе Дзурынды прэм'ерам дало магчымасьць працягваць эфэктыўныя рэформы ў эканамічнай галіне. Да 2005 году Славаччыне ўдалося стварыць узорна-сучасныя судовую й падатковую сыстэмы, службу аховы здароўя. Засталося толькі зрэфармаваць сыстэму адукацыі, асучасьніўшы яе.

Антон Марцінчын апісвае мэханізмы прыватызацыі і прыцягненьня замежных інвэстыцыяў у славацкую эканоміку. Нешта падобнае празь некаторы час можа чакаць і Беларусь.




**Славацкая надзея: досьвед дэмакратычных трансфармацый.** — Браціслава— Менск, 2006. Наклад 600 асобнікаў.

Разам з тым, як адзначае сацыёляг Зоя Бутарава, Славаччына ня здолела канчаткова разьвітацца з посткамуністычнай сьвядомасьцю. Хаця большасьць славакаў пазытыўна ацэньвае перамены 90-х, каля 40% славакаў бачаць у цяперашнім рэжыме больш заганаў, чым у ранейшым. Карані такой зьявы найперш ляжаць у тым, што славакі не былі падрыхтаваныя да разбурэньня сыстэмы сацыяльных гарантыяў. Большасьць жыхароў Славаччыны па сёньня не ўспрымае камуністычны рэжым за імпэрыю зла, а 37% лічаць, што хапіла б і касмэтычных рэформаў, а не радыкальнай трансфармацыі. Амаль палову жыхароў Славаччыны не клапоціць таталітарная спадчына камуністычнага ладу. І тым ня менш людзі падтрымліваць сяброўства краіны ў эўраструктурах. Карацей, тая самая раздвоенасьць грамадзкай сьвядомасьці, як і ў нас. Аднак славацкія палітычныя эліты нашмат лепей упраўляюцца зь ёю.

У кнізе таксама ёсьць вычарпальныя дадаткі пра славацкую гісторыю, палітычныя партыі і дзеячаў.

Пераклад «Славацкай надзеі» на беларускую мову ажыцьцявілі Алесь Карцель, Сяргей Сматрычэнка, Ірына Сітнік, Павал Раага і Андрэй Пачопка.

**Зьміцер Панкавец**

**Па больш дэталёвую інфармацыю пра жыцьцё Эўропы зьвяртайцеся да ўэб-бачынаў http://www.belarus-europe.info/ і www.belarus-europe.info.**

**Тэлепраграма «Акно ў Эўропу» трансьлюецца на канале RTV і праз кабэльнае тэлебачаньне штонядзелю а 17-й з паўторам у панядзелак (а 5.00), аўторак (12.00), чацьвер (5.00) і суботу (2.00).**

**Штотыднёвая радыёпраграма «Акно ў Эўропу» трансьлюецца на Эўрапейскім радыё для Беларусі на частотах AM і FM, праз спадарожнік і ў Сеціве а 8-й раніцы (AM: 612 kHz, спадарожнік: 11013 Mhz, Сеціва: http://www.belradio.fm/, www.belradio.fm/, FM: 103.4 а 5.40).**

**Гэтыя праграмы фінансуюцца Эўракамісіяй.**

Кароткі зьмест першай сэрыі: просты беларускі хлопец Бульбашэўскі пастанавіў зрабіцца звышчалавекам. Так зьявіўся Бульбman...




МАЛЯВАЎ ЛЯВОН ВОЛЬСКІ

# Дзякуй

**Леаніду Я.** з Пухавіцкага раёну.
**Васілю К., Аляксандру Л., І.С., Міхаілу Б.** з Гомеля.
**Тамары К.** з Жодзіна.
**Пятру Д.** са Сьвіслацкага раёну.
**Ніне М.** зь Вялейскага раёну.
**Адзе Р.** з Шаркаўшчынскага раёну.
**Сяргею У., Івану Ю.** з Бабруйску.
**Вячаславу В., Лізавеце К.** з Маладэчна.
**Івану Х., Ігару Б.** з Глыбоцкага раёну.
**Сяргею К., Аляксандру С., Зьмітру М., Сяргею З., Івану А., Аляксею П., Анатолю Х., Яўгену Ч., Сяргею К.** з Горадні.
**Міхаілу Т.** са Слуцку.
**Віталю Г.** з Чачэрскага раёну.
**Зьмітру К.** з Мастоўскага раёну.
**Марату Ш., Руслану К.** з Наваполацку.
**Аляксандру Ц.** з Шумілінскага раёну.
**Сяргею С.** зь Мёрскага раёну.
**Сьцяпану Г., Уладзіславу В., Уладзімеру К., Ліліі З., Л.К., Уладзімеру М.** зь Менскага раёну.
**Івану Д.** зь Мядзельскага раёну.
**Мікалаю В.** з Пружанскага раёну.
**С.Ц.** зь Лепельскага раёну.
**Мікалаю В.** зь Бярозаўскага раёну.
**Барысу Л.** з Пастаўскага раёну.
**Вользе Ш., Віктару С.** з Ваўкавыскага раёну.
**Вячаславу К.** з Барысава.
**Уладзіславу Х., Хрысьціне М.** зь Верхнядзьвінскага раёну.
**Галіне Ч.** з Рэчыцкага раёну.
**Сяргею Х.** са Столінскага раёну.
**Віктару Л.** з Калінкавіцкага раёну.
**Вячаславу С.** з Баранавічаў.
**Анатолю С., Юр'ю К.** з Мазыра.
**Канстанціну Ш.** з Докшыцкага раёну.
**Лявону В.** з Лагойскага раёну.
**Л.С., Любові Ш., Раісе А., Паўлу Ж.** зь Віцебску.
**Аляксандру К., Анатолю Б.** з Магілёва.
**Уладзімеру Ц.** з Салігорску.
**Соф'і К.** з Клічаўскага раёну.
**Віктару К.** зь Ліды.
**Пятру Б., Арсеню Д.** зь Берасьцейскага раёну.
**Алене П.** зь Берасьця.
**Натальлі М., Ф.Г., Галіне К., Г.Б., Зьмітру Г., Леаніду Г., Леаніду Г., Паўлу Б., Алесю Ц., Юр'ю В., Надзеі П., Марыне Б., І.Л., Паўлу П., Георгію М., Канстанціну Л., Валер'ю І., А.С., В.Д., Сяргею У., А.А., Яўгену Л., Баляславу К., Сяргею З., Уладзімеру Л., Ганьне Л., Андрэю Т., А.Д., Алегу Т., Тацяне Л., Мікалаю С., А.К., Т.М., Ігару Ж., Івану І., Васілю З., В.Д., Зьмітру Н., Генадзю Б., М.Р., А.Л., Алісе К., Натальлі Б., Валер'ю К., Валянціну К., Насьці Т., Івану І., І.П., Ю.Л., Л., Мікалаю А., Сяргею Г., Ігару Х., М.Х., Валянціну П., Віктару С., Алене К., Аляксандру К., Эльяшу Б., Ігару С., Аляксандру З., Ніне Ш., Сяргею А., Аляксандру Ф., Юр'ю М., Рыце Н., Сяргею З.** зь Менску.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521
МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3015 212 000 012** Асабовы рахунак: 

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521
МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: **3015 212 000 012** Асабовы рахунак: 

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

**дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні.**

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@tut.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям'ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 8000 рублёў на месяц. Гэтага хопіць на выхад і дастаўку газэты. **У блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначайце адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.** Тыя, хто перакажа 24000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад «НН» на 3 месяцы. Хто перакажа 48000 рублёў адразу, гарантуе публікацыю «НН» на паўгоду.

*Пажылым вясковым людзям прысьвячаецца*

# Сакрэт нашых

Палітычныя і культурныя асаблівасьці сучасных беларусаў усе бяруць пачатак у калгаснай вёсцы. Уціск, прыніжэньне, бясправе, зьнявага і страх не маглі зьнікнуць бясьследна. Але ці бачылі вы вочы дзядоў, якія выкупілі коней, змаглі ўзяць зямлі ўдосталь у 90–я гады мінулага стагодзьдзя, калі ўжо афіцыйна былі пэнсіянэрамі? Піша **Сяргей Брадавы**.

Ня мог зразумець я юнаком, чаму прыпаміналі людзі, як жылося «за Польшчай», адкуль была туга пры параўнаньні з існуючай рэальнасьцю праз трыццаць, нават пяцьдзясят гадоў пасьля аб’яднаньня 1939 г.? У кніжках было другое: пра лютых польскіх паноў у заліхвацкіх жартах гучала зьедлівае «выше польских самолётов» ці анэкдоты са стандартнай тройкай немец-паляк-рускі, дзе за ўсіх разумнейшы і спрытнейшы быў, канечне ж, рускі. Папраўдзе кажучы, далёка ня ўсё было соладка і за польскім часам. Але ж меў чалавек нешта такое, што давала годнасьці між людзьмі і гонару перад сабой.

Пад’ём эканамічнага патэнцыялу Савецкага Саюзу Іосіф Сталін пачаў з раскулачваньня і прымусовай калектывізацыі. Прайшліся камісарскай касой па вёсцы. Тое ж адбывалася і ў заходніх раёнах Беларусі пасьля вайны. Афіцыйна, для прыліку, гэта называлася барацьбой з «частнособственническим уклоном» на шляху да камунізму, а на самай справе было простае выкачваньне матэрыяльных і людзкіх сродкаў для разьвіцьця індустрыі. Трэба аддаць належнае: рэдка які рэжым у сусьветнай гісторыі так жорстка і са смакам змагаўся з уласным народам дзеля ажыцьцяўленьня, укараненьня, умураваньня «гуманных» ідэй. Краіна стала звышдзяржавай. Пра цану не пыталіся раней, а цяпер і зусім забыліся — найноўшая рэчаіснасьць не дае сумаваць. Як жа жылося вёсцы зь яе простым, паўсядзённым клопатам? Якім болем аддалося «построение нового мира» ў тысячах лёсаў? Я гадаваўся пры калгасе з амаль што «чалавечым тварам», але сёе-тое пабачыў.

Дыялектыка вучыць, што супярэчнасьць — гэта рухавік прагрэсу, нейкая плянка, каторую трэба пераўзысьці, пераадолець, каб перайсьці далей ў новую якасьць. Такія супярэчнасьці называюць нарматыўнымі, натуральна неабходнымі. Наша гаворка пра супярэчнасьці нездаровыя, супроць натуры. Пра тое, што штурхае парой да пакут звыш усякага сэнсу.

Як прымудраўся селянін выжываць са сваіх 30 — 40 сотак зямлі?! Там, дзе ён працаваў пасьля асноўнай работы ў калгасе, якая прыносіла толькі працадні і капейкі. Кожны будны дзень трэба выходзіць на працу ў калгас — своеасаблівая паншчына на карысьць фэадала-дзяржавы. Дарэчы, згодна з указам Пятра І, сяляне Расейскай імпэрыі мусілі працаваць на гаспадара толькі тры дні на тыдзень. Калі ж гэта было? У савецкай краіне кола гісторыі круцілі ўзад-уперад як хацелі.

Афіцыйная статыстыка акуратна даводзіла насельніцтву, колькі сабрана «на круг» у калгасах-саўгасах краіны, а колькі сабрана з кусочкаў, лапікаў, шнуркоў насельніцтву краіны ведаць было не канечне. Пра некаторыя «кусочкі» асобная размова. Частка зямлі сельскім жыхарам давалася на калгасным полі, звычайна пасля ільну ды яшчэ ў пару пасьля таго, як сам калгас адсеецца. Селяніну дазвалялі ўрабляць дзялянку год-другі, і — пераходзь на новы ўчастак: палівай яго потам, угнойвай, змагайся з каменьнем, пустазельлем-пырнікам. Чытаеш у падручніках пра гаспадарчую дзейнасьць у старажытным Эгіпце ці пры прыгонным праве, і міжволі не-не дый просяцца параўнаньні.

Чым карміць і падсьцілаць жывёлу, каб дацягнуць да вясеньняй пашы — гэтая праблема-стымул прымушала, кажучы цяперашнім словам, круціцца. Рэзалі на корм сечку з саломы ды бульбоўніку — сена было, як раскоша. Шырока выкарыстоўвалі лянішча — гэта трава, скошаная пасьля сарванага ўручную ільну. Нават сварыліся за больш зарослыя дзялкі. Яна, гэтая трава, была ці не даражэйшай за «сацыялістычную» аплату працы.

Памятаю, як мой бацька, ды і суседзі, касілі ля дому адразу ж пасьля таго, як прыбіралі сена ў калгас. Гэтакая своеасаблівая «касьба пасьля касьбы». Касілі-сенавалі ў равах, у лесе. Ды і то ня ўсюды можна — там жа вотчына лясьніцтва. Але і тут ёсьць дзе разгарнуцца народнай фантазіі. Калега на працы расказваў, што на ягонай радзіме на Палесьсі сена нарыхтоўвалі больш за 10 км ад дому, на балоце. Бяры затым сабе чвэрць (!) фуражу, астатняе — дабрадзею-калгасу, пэўна ж за дазвол касіць вельмі «спажыўную» асаку і дапамогу ў перавозцы асакі зімой.

Саломы не хапала — касілі аржоньне (канечне ж, з аглядкай на брыгадзіра). А зімой даводзілася часам секчы яловыя лапкі, каб было чым падаслаць. Ну а калгасныя стагі з саломай тым часам маглі стаяць гадамі амаль некранутымі, або спальваліся наагул.

Якая ў вёсцы гаспадарка без каровы! А як жа было ў такіх умовах адзінокім жанчынам гадаваць сваю рагулю. А такія былі і ёсць ці ня ў кожнай вёсцы. Колькі іх па вёсках вялікіх і малых ва ўсёй Беларусі!

Красьці, браць не сваё — грэшна, але зіма доўгая. Тому несьлі: посьцілкамі, клункамі, у кішэнях. Алешына ля самай хаты, а сьпілуеш — аштрафуюць. І гэта пры тым, што такія паняцьці, як сумленьне, сорам для беларуса зусім не вадзіца.

Кім стаў селянін, сельскі работнік пасьля калектывізацыі? Кім мог ён быць безь зямлі і сапраўдных сродкаў яе апрацоўкі? «Калхозьнікамі» сталі і ён, і ягоныя дзеці. Нешта накшталт сучаснага «лох» у моладзевым асяродзьдзі. Слова «калгасьнік» ужывалася ў бадзёрых песьнях ды нарысах-аповесьцях пра тое, як жа добра жывецца ў нашай вёсцы. У рэальным жыцьці быў «калхозьнік» як проціпастаўленьне беларуска-расейска-польскім годным назовам —«гаспадар», «аспадар», «спадар», «хозяин», «господин», «пан».

Уціск, прыніжэньне, бясправе, зьня-

# бацькоў




вага і страх не маглі зьнікнуць бясьследна. Вось і далося ў знакі такое жыцьцё з двайным сэнсам халуйствам дзяцей. Звычайная сялянская памяркоўнасьць стала вульгарным скажэньнем філязофіі непраціўленьня злу насільлем. Беларусь жа была і ёсьць самая пакорная, як ні глянь наўкола.

* * *

Лічыце гэтыя нататкі-абразкі не за крытыку, не за бурчаньне ці, наадварот — замілаваньне, а проста як позірк на жыцьцё беларускіх сялян чалавека, якіх тысячы і тысячы ў нашай краіне.

Напісаць пра вясковых дзядкоў і бабулек думаў даўно. Чагось не ставала. Не было пэўнай меткі, апоры, стрыжня. І вось знайшоўся. У адным з інтэрвію «Известиям» Сьвятлана Алексіевіч вызначыла свае кнігі як кнігі «пра тое, як чалавеку застацца чалавекам у прасторы краіны-ўтопіі». Падумалася — гэта тое, што трэба. Утопія... Сапраўды, як было жыць і застацца чалавекам у краіне, дзе «ўсё ня так, усё ня так, як трэба» (памятаеце надрыўнае Валодзі Высоцкага)? Калі ня проста жыцьцё, а жыцьцё СУПРОЦЬ. А яшчэ жыцьцё-НА КРАІ, часьцяком на краі магчымага — раней, на краі, напрыканцы шляху зямнога — зараз.

Дык вось, прысьвячаю гэтыя радкі тым, чые дзіцячыя і юнацкія гады прыйшліся на вялікія зломы гісторыі, чыё сталеньне прайшло ва ўмовах гіганцкіх сацыяльных экспэрымэнтаў. Пра ПАЖЫЛЫХ, тых, што пажылі і пражылі вой як шмат, пра тых людзей, якія несьлі і нясуць пячаць тых доўгіх, нялёгкіх гадоў.

Для эпіграфу добра кладуцца знакамітыя словы Багдановіча:

**Народ, Беларускі Народ!**
**Ты цёмны, сьляпы, быццам крот.**
**Табою ўсягды пагарджалі,**
**Цябе не пускалі зь ярма**
**І душу тваю абакралі, —**
**У ёй нават мовы няма.**

Гістарычнае. 20-я — 40-я гады XX стагодзьдзя. Уявіць толькі... Беларусь без свайго ўдзелу літаральна разарваная паміж Польшчай і Расеяй. Тая ж Польшча затым — паміж Нямеччынай і Савецкім Саюзам, які, у сваю чаргу, патрапіў у зашмаргу нядаўняга палітычнага партнэра. Без маралі, сантымэнтаў, літасьці і спагады... Людзі, што жылі на гэтай тэрыторыі, трапілі ў такі вір падзей, што нават з вышыні сёньняшняга дня наўрад ці адназначна можна сказаць, як «правільна» мусіў быў чалавек паводзіць сябе, каб захаваць жыцьцё, мець хаця б мінімальныя ўмовы для гэтага жыцьця, захаваць сваю годнасьць. Каб потым не «цягалі» органы, ня брыдка было перад людзьмі і ня мучыла ўласнае сумленьне. Куды і як арыентавацца, ня ведалі, і дзеля гэтага пазбаўляліся ўсяго, аж да самага жыцьця, знакамітыя і ўплывовыя людзі, высокія чыноўнікі і міністры-маршалы. Наша гаворка пра людзей звычайных, зямных. Так, праца на зямлі ды добра калі некалькі клясаў школы — вось і ўсе ўнівэрсытэты, якія пасьпелі прайсьці яны да пагібельных гадоў, калі давялося апынуцца ў цэнтры сутыкненьня самых пякельных за гісторыю ўсіх часоў і народаў таталітарных машын.

* * *

Сялянская праца. Ва ўсе часы немажна было ў вёсцы без стараннасьці, бяз поту, бяз працы. А яна розная. Бывае натхнёная, у радасьць, з ахвотай. Непараўнальныя адчуваньні пры сяўбе, дакопках увосень, ці касьбе, як добра косіцца. І стома тады — зусім ня стома. Сам ня раз адчуваў гэты п’янлівы водар яднаньня зь зямлёй. Як адчувалі вы сябе, седзячы на возе з духмяным се-

нам.

А словы беларускія якія трапяткія, ласкавыя якія: «жыта» — ад пяшчотнага «жыць», ня рэзкае «рожь», ці кажуць яшчэ «дабро» — гэта пра збожжа, яно добрае, бо зямля аддзячыла за працу дабром... А яшчэ: «ральля», «бярэма», «пуня», «сьвежына» — цэлы россып чульлівага, паважнага стаўленьня да працы і яе вынікаў.

Праца — яна і цяжкая. Але ж трэба, мусіш зьбіраць ураджай і тады, калі ён ня ўдаўся, а сілаў пакладзена столькі. Тады цяжэй удвая. А ці даводзілася вам штосьці вельмі патрэбнае сьпешна дарабляць перад навальніцай ці ў прыцемках? Калі ня чуеш рук-ног, а трэба «рваць», бо кроў з носу, але пасьпець. З усяе сілы улягаць трэба і на гнаёк вясной — пустая зямля ня родзіць. Дый ці мала розных «трэба» на вёсцы.

Не было раней гідраўлікі на плугах — яе ролю выконвалі мужчыныпрычэпшчыкі. Некалькі гадоў такой працы — і можаш разьлічваць на «букет» захворваньняў. Трактарысты, каторыя гадамі развозілі без усялякіх прыстасаваньняў аміяк па палёх, таксама не выглядаюць у старасьці асабліва бадзёра. Увогуле, стваральнікі тагачаснай тэхнікі мала дбалі пра чалавека.

Як гэта прыгожа, паэтычна, мэлядычна гучыць: «Ой і мяла Ўльяніца лянок...» А ці вы мяліцу ў справе бачылі? А калі іх некалькі паставіць у малым памяшканьні! І так цэлы дзень, кожны дзень узімку жанчыны-калгасьніцы, стоячы ля машыны, каторая выкідвала пыл-кастрыцу, на тых мяліцах даводзілі да вышэйшага гатунку сыравіну для ільнозаводаў. Прадпрыемствы потым выпускалі прыгожыя сувэніры-ручнікі...

Ці бясконцыя праполкі. Бацькам дапамагалі дзеці, пачынаючы з дашкольных гадоў. Ведаю людзей, якім давялося прысутнічаць на барацьбе з пустазельлем у пялюшках — не было з кім пакінуць немаўлят. Навошта тая тэхніка — хапала рук. Спрацаваных, стомленых дарослых; сьвежых, яшчэ наіўных рук дзіцячых...

Але праца зь зямелькай, чыстая прырода, вясковы водар рабілі сваю добрую справу зь юнымі душамі. Сапраўды, вясковыя дзеці — гэта шчырасьць, прастата, кемлівасьць, асаблівы сьвет... Гэтаму не навучыш; такое засвойваецца, ухлынаецца нутром, натуральна чэрпаецца з асяродзьдзя.

З уладай, той уладай, якая была побач, местачковай, адносіны былі спэцыфічныя. Яна патрабавала працадні, а яшчэ малако і мяса з таго кавалачка «дарованай» зямлі, з падворка.

Чалавек павінен быў выконваць, даваць, а зь іншага боку прасіць (каня, хоць бы трохі болей зямлі і г.д.) і, урэшце, — палучаць: «працэнты» для ўкосу, тое ж дабро. Нават заробак называўся «палучкай». Ну, і канечне ж, бясконцыя «нельга»: больш адной каровы, лішні мэтар зямлі. Нават хату вясковец павінен паставіць быў там, дзе ўваб'юць калочкі. Якія толькі мэнкі не прыдуманыя былі як бы знарок, каб «прышчаміць» чалавека, закабаліць гаспадарчую ініцыятыву і сялянскую жылку. Паміж спамянутымі «суб'ектамі гаспадараньня» была сапраўдная «сьмехапанарама» ў выглядзе сельсавету і праўленьня калгасу.

З уладай, якая была далёка і высока, адносіны былі мінімальныя, цяпер бы сказалі — віртуальныя. Яна праз сродкі масавай інфармацыі апавядала пра посьпехі «союза нерушимых республик свободных», а падданае насельніцтва пэрыядычна «ўдзельнічала» ў волевыяўленні «адзінага блёку камуністаў і беспартыйных».

## Як кажуць пажылыя людзі, «некалі ж канец будзе!»

І як жа ўраз, літаральна за некалькі дзён, ссохлі сялянскія зьберажэньні пасьля вярхоўных рэформаў на пачатку 90-х гадоў. Менавіта нажытае нялёгкай працай сваёй і зьберажонае. А хто пытаўся? «Пагарэлі» і больш дасьціпныя, што гаварыць пра іх, прыземленых, прыстарэлых, недасьведчаных. Клясычнае купалаўскае «бо я мужык, дурны мужык» як найлепш тут дарэчы. Пайшлі ў пясок надзеі-спадзяваньні, апошнія ілюзіі наконт надзейнасьці сацыялістычнай дзяржавы. Адным з галоўных пастулятаў жыцьця станавіўся прынцып «кожны памірае сам-адзін». Найлепей сталі паміраць байцы арміі новых багачоў, што неяк ненавязьліва распладзіліся тут і там.

* * *

Верыць у Бога ў адкрытую было нельга, вера называлася цемрашальствам. Вельмі заахвочвалася другая вера — у сьветлае будучае, а маладзевыя газэты, збольшага даўшы рады фізыкам-лірыкам, ламілі галаву над вельмі злабадзённым пытаньнем: «Есть ли в жизни место подвигу?»

А яны верылі... Верылі нават, калі храмы заставаліся хіба што ў райцэнтрах. Верылі і як маглі вучылі веры, калі дзецям іх верыць сувора забаранялася. Гэта цяпер ледзь ня кожны начальнік лічыць абавязкам публічна абабіць сабе галаву ля абраза. Тады было інакш, «не было такой моды». І вера была больш шчырая і чыстая.

Вера была як сымбаль нескаронасьці, як абарона, як надзея на лепшае, на заступніцтва і вышэйшую справядлівасьць. Усявышні мае ўладу над стыхіямі прыроды і людзьмі, якія прыбралі ўладу. Гэта там, у Эўропе, самымі аўтарытэтнымі інстанцыямі лічацца дзяржаўныя інстытуты. У нас жа, выбачайце за каламбур, па-ранейшаму — вера, надзея, любоў.

Вера верай, а даводзілася працаваць і на рэлігійныя сьвяты — «хай Бог выбачае», бо інакш калі? Недатыкальныя былі толькі найбольш важныя, гадавыя сьвяты.

* * *

Была на нашым радыё добрая ў прафэсійным і душэўным сэнсе перадача «Жадаю Вам». Шмат год гучалі ў ёй віншаваньні пажылым людзям, і з кожным годам узроставы цэнз імяніньнікаў павышаўся. Яны, названыя і безыменныя, выжылі ў сваёй бацькаўшчыне, хоць яна трымала іх парой як за чужынцаў і была часам болей айчымам, чым бацькам. Засталіся людзьмі, перадалі, як маглі, парой наіўна, па-вясковаму проста, навобмацак, дабро і цяпло сэрцаў сваіх дзецям, унукам, блізкім. Як ні круці, а беларусаў заслужана паважалі і паважаюць далёка за межамі нашай краіны як добрых работнікаў і добрых людзей. Хто скажа, што ў нашым краі дрэнь людзі?!

Сэнсам жыцьця іхняга ў такіх умовах станавіліся дзеці. «Каб выйшлі ў людзі, а не капаліся ў гразі». І пайшлі сыны і дочкі вясковыя — здаровыя, разумныя, гаспадарлівыя — на будоўлі, заводы, установы. «Ад родных ніў, ад роднай хаты», — на гарадзкі брук-асфальт. А бацькам засталося адно — дажываць, падтрымліваючы нам масткі да адвечнага, да зямлі роднай, да каранёў, ну і да сяго-таго з харчоў. Згадайце нашы прыгарадныя цягнікі і аўтобусы ў выхадныя дні.

А яшчэ — унукі і ўнучкі. Іх любяць і песьцяць больш, чым дзяцей. Хто, як ні дзядуля і бабуля, могуць акрэсьліць мудрасьць жыцьця ўласным прыкладам, ці то словам, ці хоць інтанацыяй.

* * *

Гранічнае становішча — неад'емная частка грамадзкага і асобаснага існаваньня. Што б мы ні рабілі, мы ўпіраемся ў нейкую гранічную мяжу. У сацыяльных тэорыях сьцьвярджаецца, што калі ў якім-небудзь працэсе дасягнутая мяжа, то трэба зьмяніць напрамак намаганьняў, можа, характар намаганьняў, ці мусіш спыніцца ў сваім руху. Па меры прыбліжэньня да мяжы выдаткі, зьвязаныя з далейшай дынамікай, рэзка ўзрастаюць. Сыстэма гаспадараньня ў вёсцы падышла да мяжы! Нават у афіцыйных беларускіх СМІ часам у дачыненьні да вёскі, да сельскай гаспадаркі выкарыстоўваецца суворы тэрмін-дыягназ «дэградацыя». Вялікая колькасьць калгасаў дыхае ведама на што. Можна з дапамогай «адміністрацыйнага рэсурсу» (да прыкладу, «навесіць» небараку-калгас на прадпрыемства) выціснуць, выбіць які лішні дзясятак тон зерня, тону-другую мяса, выдаіць-выцягнуць з гэтых гаротных кароў дадатковы літар малака. Можна шчэ год-другі паганяць тэхніку, якая даўно ўжо адпрацавала сваё, прымусіць да працы людзей, якія яшчэ рухаюцца. Няўжо не зразумела, што ўсе гэтыя посьпехі маюць несувымерна высокую цану? У далёкіх і ня надта далёкіх краінах вырабляюць сельскагаспадарчай прадукцыі шматкроць болей і з затратамі, меншымі ў шмат разоў.

Чалавек здатны на многае. Наш чалавек можа жыць за граньню магчымага, а ля грані — дык колькі хочаш. Мы да многага прызвычаіліся. Але, як кажуць пажылыя людзі, «некалі ж канец будзе!» Думаць пра дамы, дарогі і людзей ў вёсцы сталі запозьнена — большую частку маладой эліты і хоць чагось вартых зь вёскі забраў горад. Што будзе далей? Застануцца сярод вёсак-засьценкаў і вёсак-прывідаў аазісы ў выглядзе цэнтральных сядзіб калгасаў — гэтакія фарпосты цывілізацыі («цэнтралы», «рэабілітацыйныя адстойнікі» для часовага прытулку сэзоннай рабочай сілы з гарадоў). Хто там будзе жыць стала? Пэўна ж, фэадальна-калгасная арыстакратыя, слой чыноўнікаў і работнікаў сфэры жыцьцезабесьпячэньня, можа, якія «вясковыя тыгры» (фэрмэры-прыватнікі, гаспадарлівыя шофэры-мэханізатары), ну і вясковыя люмпэны — новая ніша ў сацыяльным малюнку вёскі. Як інакш назваць малойцаў, што гуртуюцца днём у відных месцах, а ў цёмны час шчупаюць чужыя курнікі. Дажыліся да такога праз дваццаць вякоў ад пачатку нашай эры...

Між тым вёска, наша добрая старая вёска «людзей зямлі» памірае. Вынесьці труну на могілкі — гэта праблема! На кампутарна-тэхнакратычным фоне як у вытворчых, так і ў чалавечых адносінах, ды яшчэ ў геаграфічным цэнтры Эўропы, бабулька, што корпаецца ў бульбе, і дзед з касой на ўзьмежку сапраўды выглядаюць нейкімі фаліянтамі... Быццам апошнія магікане, ахоўнікі ТОЙ вёскі.

* * *

Старасьць. Старажытны філёзаф зазначыў: «Цяжка быць беражлівым, калі засталося на дне». Але ж... Ці бачылі вы вочы дзядоў, якія выкупілі коней, змаглі ўзяць зямлі ўдосталь у 90-я гады мінулага стагодзьдзя, калі ўжо афіцыйна яны былі пэнсіянэрамі?! Ці бачылі вы гэту неўдаваную радасьць, гонар — лебядзіную песьню з сумнай сівізной на скронях. Праз паўстагодзьдзя яны ажылі і зноў сталі гаспадарамі, фактычна незалежнымі ад калгасаў-манапалістаў на жыцьцё ў вёсцы. Мой дзядзька, па-заліхвацку праяжджаючы паўз вёску, з гумарам ціха гаварыў: «Гэта не са мной здароваюцца, а з канём!» Загнаныя дзесяцігодзьдзямі ў кут, яны змаглі расправіць свае ўжо старэчыя плечы. Ці ня тут разгадка маіх даўнейшых пытаньняў!

Сіла прывычкі, патрэба працаваць. Хоць сілы ўжо ня тыя. Прывычка да паўсядзённай працы на вёсцы ёсьць неад'емным атрыбутам асобы. Да прыкладу, дырэктар саліднага прадпрыемства краіны кожны год едзе да бацькі амаль праз усю Беларусь садзіць-выбіраць бульбачку. Пры гэтым стары ўпарта адмаўляецца ад гатовай. Дзе там! Неяк я пачаў гаварыць знаёмай мэдсястры аб тым, што сельскім жыхарам прыходзіцца на старасьці больш працаваць, чым гарадзкім. Адказ быў наколькі нечаканым, настолькі слушным: «Можа, таму яны болей і жывуць?»

Сыходзяць у зямлю па-рознаму: хто да часу, хто мо й болей адмеранага на небе. Парой і значна — вёска ж неяк павінна жыць, а зьмены няма або надта рэдзенькая. А паглядзеце, колькі недарэчных сьмярцей, суіцыдаў сярод моладзі і сярэдняга пакаленьня. Старыя вяскоўцы іншага гарту. Але ж і яны ня вечныя. Яны — як апошняе прыкрыцьцё, сотні і сотні жывых чалавечых астраўкоў на абсягах нашай краіны. А калі і адыходзяць у сьвет іншы, то звычайна таму, што стаміліся ўжо несьці крыж зямны.

Жывое імкнецца да жыцьця. Трава прабіваецца нават праз асфальт і брук.

Застаўся лапік бруку і ў вёсцы майго дзяцінства — у старажытным Гарадку, што на Маладачаншчыне. Для іх, старых, — гэта знак дзяцінства і юнацтва, абпаленага вайной і пасьляваеннымі выпрабаваньнямі. А зараз — гэта просты знак, індыкацыя жыцьця. Чаму? Травы між старых камянёў прарастае з гадамі болей — хадакоў і падарожных становіцца ўсё меней. Гэтым брукам рухаюцца яны і ў шлях апошні...

Вядома, ня ўсюды было так, як я тут акрэсьліў: дзе болей, дзе меней, дзе багацей, дзе бядней. Бывалі сьвяты, нават і вялікія сьвяты і на вясковых вуліцах. Але ж было, было тое, чаго ня выкрасьліш, ня вырвеш жыўцом зь нялёгкага лёсу гэтых людзей. Бо зраслося, бо сваё.

Напрыканцы згадаем і другую частку таго верша пра беларускі народ:

Збудзіўшысь ад грознай бяды,
Ўвесь поўны сьмяротнай жуды,
Ты крыкнуць ня вольны: «Ратуйце!»
І мусіш ты «Дзякуй» крычаць.
Пачуйце жа гэта, пачуйце,
Хто ўмее з вас сэрцам чуваць!..

Так трапна і празорча напісаў наш малады клясык аж у 1913 годзе!

Сапраўды таленавітым словам ня трэба камэнтару.

Але, людцы мілыя! Схілім галаў перад гэтымі людзьмі, іх працавітасьцю, стойкасьцю, дабрынёй, жыцьцялюбствам!

Яны застаюцца тут назаўсёды.

Далей пойдуць іншыя. Трэба ж, каб было будучае, не павінны прапасьці дарма пакуты і подзьвігі, страты і спадзяваньні гэтых людзей зямлі беларускай.

*Маладэчна*

**А словы беларускія якія трапяткія, ласкавыя якія: «жыта» — ад пяшчотнага «жыць», ня рэзкае «рожь», ці кажуць яшчэ «дабро» — гэта пра збожжа, яно добрае, бо зямля аддзячыла за працу дабром. А яшчэ: «ральля», «бярэма», «пуня», «сьвежына» — цэлы россып чульлівага, паважнага стаўленьня да працы і яе плёну.**

# Дай Божа ўсё ўмець, але ня ўсё рабіць

На прадпрыемствах амаль не засталося добрых токараў ці станочнікаў. Дакладныя працы выконваюць людзі перадпэнсійных гадоў. Піша Руслан Равяка.

Усеагульная адукацыя, якая засталася нам з савецкіх часоў і якую ўхваляе наша ўлада, не адпавядае патрэбам часу. Яна не дае сучасных, напраўду патрэбных ведаў, не прыстасоўвае маладзёна да сапраўдных умоваў жыцьця, ня вучыць працаваць. Нездарма моладзі, што прыходзіць на працу пасьля навучальных установаў, кажуць: «Забудзьцеся пра ўсё, чаму вас вучылі ў інстытуце (тэхнікуме/хабзе)».

Ужо цяпер на прадпрыемствах паўстае гэткая праблема, як недахоп сапраўдных спэцыялістаў. Сумленна працуюць толькі старыя кадры, што засталіся з савецкіх часоў. Моладзь, якую разьмяркоўваюць, адседжвае свае гадзіны, робячы толькі тое, што наказалі й паказалі. Самаадукацыяй ніхто ня хоча займацца. Старыя гуляюць падчас перапынкаў на абед у шахматы ці даміно, моладзь — па кутках дзяўбе кнопкі мабільных. Ды й падчас працы агінаецца, увільвае ад работы. Беручы, зрэшты, прыклад са старэйшых.

У Заходняй Беларусі з настальгіяй узгадваюць спэцыялістаў, што пачыналі працаваць яшчэ за панскай Польшчай. Як казаў адзін майстар, тым трэба было толькі паставіць задачу — ня трэба было тлумачыць, што і куды класьці ці як рэзаць. Здатныя былі на ўсялякую работу. Ня трэба было стаяць над душою ды кантраляваць, каб не лайдачылі.

Як распавёў мне галоўны мэханік аднаго з баранавіцкіх заводаў, на прадпрыемстве амаль не засталося добрых токараў ці фрэзэроўшчыкаў. Дакладныя працы выконваюць пэнсіянэры, людзі перадпэнсійных гадоў. Дарэчы, у горадзе паўстаў сапраўдны недахоп станочнікаў —

# Моўнае пытаньне

Палітыкі зь незалежнага грамадзтва вымушаныя карыстацца пасярэдніцтвам Польшчы ва ўзаемінах з Захадам толькі праз тое, што цяжка наладжваць беспасярэднія кантакты, не размаўляючы вольна па-ангельску. Піша Бірута Янкевіч.

Цікавае пытаньне часам прыходзіць на розум — чаму беларусы не выходзяць масава ў сьвет? У сьвет навуковы, у сьвет грамадзкі і палітычны? Чаму мы часта абмяжоўваемся паездкамі на адпачынак у такія суседнія краіны, як Украіна ці Расея, ці абіраем далёкія курорты, на якіх можна паразумецца з пэрсаналам, скажам, па-расейску? Чаму чытаем (напрыклад, навіны ў Інтэрнэце) збольшага па-беларуску ці расейску? Чаму часьцяком у справах грамадзкіх і палітычных кантактуем з Заходняй Эўропай праз пасярэднікаў (напрыклад, Польшчу ці Літву)? Хіба падставы да такога самаабмежаваньня не эканамічныя?

Як усім нам вядома, замежныя мовы ў Савецкім Саюзе (а маё пакаленьне сярэднюю адукацыю атрымлівала ў тыя часы) у школах выкладаліся такім чынам, каб без дадатковай падрыхтоўкі чалавек мовай не валодаў. Так было значна прасьцей людзьмі кіраваць — ну куды ты падзенесься, калі ведаеш, у прынцыпе, добра адну расейскую мову, акрамя як у іншую рэспубліку СССР? Канечне, будзеш знаходзіцца толькі ў інфармацыйнай прасторы вялікай краіны, плянаваць сваё жыцьцё ў ёй, і думкі ня ўзьнікне, што бывае нешта яшчэ. І думкі ня ўзьнікне паразмаўляць лішні раз з замежнікам, які цудам трапіў у твой горад, бо проста ня зможаш. Для дзяцей палітычнай эліты звычайна была пара-тройка школак з паглыбленым вывучэньнем замежнай мовы. Але цяпер гаворка не пра іх.

Гледзячы на тое, што робіцца зараз з нашымі дзецьмі, задаесься пытаньнем: што зьмянілася? І ці нешта зьмянілася? У школах (размова не пра элітныя ліцэі) тыя ж мэтодыкі выкладаньня моваў — каб паставіць птушачку, дакладней, адзнаку ў атэстаце. Але колькі дзяцей пасьля сярэдніх школаў вольна размаўляюць-пішуць-чытаюць на мове, што вывучаецца аж 7 (!) год?

Да лепшага хіба зьмянілася стаўленьне некаторых (на жаль, толькі некаторых) бацькоў — шмат хто наймае дзецям рэпэтытараў, хто-ніхто спрабуе адпраўляць дзяцей за мяжу на вакацыі. Пасьля гэтага можна мовай карыстацца. І робіцца гэта не за 7 год, а звычайна за год з рэпэтытарам ці за лета за мяжой. Далей патрэбная толькі падтрымка ўзроўню, чаго школа, зноўку ж, даць ня можа. Прычыны гэтага відавочныя — дзяржаве не патрэбныя людзі, што могуць мысьліць па-за межамі інфармацыі, што гэтая дзяржава (ці суседняя з той жа палітыкай) людзям падае за праўду.

Нашыя навукоўцы не заўжды могуць сабе дазволіць навуковыя дыспуты з заходнімі навукоўцамі толькі праз тое, што не валодаюць мовамі, — як можна дыскутаваць, калі ні прачытаць ня можаш якой працы на іншай мове, ні адказаць на прачытанае. І застаюцца ў ізаляванай прасторы разам з Расеяй. Не кажу ўжо пра тое, што ня ўсе валодаюць мовамі, якія выкарыстоўваюцца ў першакрыніцах.

добрыя кадры сыходзяць з заводаў, але на іншых яны не зьяўляюцца: ідуць на пэнсію ці зьяжджаюць у Расею (больш-менш добрыя кадры застаюцца на невялікіх прыватных прадпрыемствах). А моладзь што — наробіць, як вароне на хвасьце панесьці.

Праз 10 — 15 год над Беларусьсю паўстане рэальная пагроза крызісу кваліфікаваных рабочых кадраў. Будзе шмат «дыплямаваных бараноў». А показкі пра дурную працавітасьць беларусаў адыдуць у нябыт.

Выратаваць становішча могуць толькі рынкавыя ўмовы гаспадараньня, беспрацоўе і прыватная ўласнасьць. Яны прывядуць да «эвалюцыйнага адбору» ды прымусяць супрацоўнікаў да шчырай працы й самаадукацыі.

*Баранавічы*



WWW.PHOTO.BYMEDIA.NET

Нашыя палітыкі не заўжды могуць сабе дазволіць не карыстацца пасярэдніцтвам Польшчы ва ўзаемінах з Захадам толькі праз тое, што цяжка наладжваць беспасярэднія кантакты, не размаўляючы вольна прынамсі па-ангельску. Грамадзкія арганізацыі таксама знаходзяцца ў пэўнай ізаляцыі ад сьвету праз гэтую праблему — вымушаныя карыстацца пасярэдніцтвам Польшчы, Літвы і іншых краінаў, што фактычна прэзэнтоўваюць беларускую сытуацыю на міжнароднай сцэне.

Канечне, найлепей у дадзенай сытуацыі зьмяняць сыстэму адукацыі — уводзіць вывучэньне некалькіх замежных моваў праз сучасныя цікавыя і эфэктыўныя мэтодыкі, вучыць дзяцей са школы выкарыстоўваць іншамоўныя крыніцы (напрыклад, пры падрыхтоўцы пэўных рэфэратаў у прадметах, не зьвязаных беспасярэдне з вывучэньнем моваў), шырока распаўсюджваць інфармацыю пра моўныя школы ў краінах-носьбітах моваў, ствараць уласныя і г.д. Але ўсё гэта на сёньняшнім этапе разьвіцьця дзяржавы, на жаль, немагчыма зрабіць эфэктыўна.

Якое выйсьце можа быць у дадзенай сытуацыі? Здаецца, толькі такое, як усё апошнім часам: калі чагосьці ня маем — мусім самі стварыць гэта.

Калі пытаньне арганізацыі курсаў ангельскай мовы не актуальнае ў Менску (тут трэба проста людзям давесьці, наколькі вывучэньне моваў істотнае), дык нават у такім вялікім горадзе, як Гомель (не кажу нават пра гарады не абласныя), якасных курсаў ангельскай мовы проста няма.

Застаецца зрабіць тое, што амэрыканцы робяць з адукацыяй для сваіх дзяцей — яны проста вырашаюць, што іх дзеці павінны вывучаць і як. Гэта і ёсьць канкрэтны мэханізм дзеяньня грамадзянскай супольнасьці — рабіць тое, што ўважаеш патрэбным для сваёй мясцовай супольнасьці. У нашай сытуацыі мы пакуль ня здолеем выкарыстоўваць нашых падаткаў на тое, што патрэбна нам, а ня дзяржапарату. Але мы можам наладзіць эфэктыўныя заняткі прынамсі ангельскай мовы ў грамадзкіх арганізацыях, клюбах і проста тусоўках.

У маёй арганізацыі пару год таму мы плянавалі ўключыць у праграму нядзельнай школы для моладзі дыскусіі на цікавыя тэмы па-ангельску. Мэтодыка даволі простая. Раздаецца друкаваны тэкст, абмеркаваньне якога плянуецца на наступным тыдні. Разам зь ім — слоўнічак на 20 — 40 словаў, што непасрэдна зьвязаныя з тэмай (не ангельска-беларускі, а ангельска-ангельскі — нешта накшталт тлумачальнага, каб чалавек спрабаваў не перакладаць свае ідэі, але думаць па-ангельску). Праз тыдзень — дыскусія, прэзэнтацыя хатняй працы камандаў, як, напрыклад, у дэбатах і г.д. Перад пачаткам дыскусіі (ці па заканчэньні) да гэтага варта дадаваць паўгадзінкі заняткаў з граматыкі, сучаснай размоўнай лексыкі (гэта ўжо праца настаўнікаў-лінгвістаў). Фактычна, для арганізацыі падобных гурткоў дастаткова аднаго-двух чалавек, што добра валодаюць мовай і могуць каардынаваць падобную дзейнасьць. А эфэкт падвойны — і мова вывучаецца (звычайна такія рэчы падганяюць людзей да таго, каб на курсы пахадзіць, ці да рэпэтытара, ці дома самастойна пазаймацца пабольш), і абмяркоўваюцца пытаньні, што разьвіваюць мысьленьне як такое.

Пачні мы гэта рабіць зараз — глядзіш, праз два-тры гады будзем вальней сябе адчуваць у сьвеце. Як усе цывілізаваныя людзі — вольна размаўляючы на сваёй, ангельскай, а ў будучым, можа, яшчэ на пары-тройцы замежных моваў.

# Ураздроб

Сёлетні сьпіс «Найлепшых кніг» паводле апытаньня «НН» атрымаўся нагэтулькі контравэрсійны, што выклікае жаданьне абараняць яго ад незадаволеных. Піша **Даніла Жукоўскі**.

Насамрэч сьпіс як ніколі інфарматыўны, але для больш спакойнага ўспрыманьня патрабуецца колькі дробных папраўак.

### «Кнігі году-2006»

Я настойваю на гэткім удакладненьні, а лепей, абмежаваньні. Перад намі кнігі году. Менавіта прэтэндэнтаў на гэткі тытул прапаноўвалі ўдзельнікі апытаньня. Не рызыкнуў бы вызначаць гэткім чынам кнігі «найлепшыя» хоць бы таму, што немагчыма параўноўваць Туронка з Барадуліным. Казаць жа пра кнігі-падзеі — больш карэктна і больш прыдатна ў сытуацыі небагатага кніжнага рынку.

### Пажытак для розуму

Сьпіс, які атрымала «НН» — аніякі ня рэйтынг з «найгоршых» і «найлепшых» кніжак. Зь яго мала што можна выцягнуць адносна таго, якую кнігу варта знайсьці і прачытаць, але ён шмат цікавага гаворыць пра дзьве грамады: чытачоў і аўтараў.

Нават кнігі, якія апынуліся на першым і другім месцы, згаданыя менш чым паловаю апытаных. Трэцяга «прызэра» згадалі ўжо толькі трое. Ці можна тут увогуле гаварыць пра нейкі рэйтынг? Сумленным будзе сьцьверджаньне, што маем у 2006-ым годзе толькі дзьве кнігі, вартыя зваца «Кнігамі году», рэшта складае тлум прэтэндэнтаў з прыкладна аднолькава малымі шанцамі.

Калі, адмовіўшыся ад сумнеўнага ранжыраваньня, разгледзець гэтыя кнігі разам, цяжка не заўважыць сьціплай долі мастацкае літаратуры і яшчэ сьціплейшае — сюжэтнае прозы. Крызіс навідавоку, і ў гэтым няма нічога нечаканага.

Другая выснова: цікавасьць чытача да гісторыі пацьвярджаецца вялікай колькасьцю згаданых выданьняў, але на мастацкай ніве шчыруе адна В. Іпатава. Было б гістарычных твораў больш — нехта б апынуўся побач з Туронкам.

Калі першая выснова — простае сьведчаньне цяжкага стану літаратуры ў існых неспрыяльных умовах, дык другое — папрок выдаўцам, якія не заўважаюць попыту і не спрабуюць на яго адказаць.

### Не экспэрты, а ўдзельнікі

Відавочна, што аніхто з удзельнікаў апытаньня ня мае доступу да больш-менш істотнага сэгмэнту кніжнага рынку. Рынак гэты падзяліўся на добра ізаляваныя анклявы.

# «Наш добры настаўнік»

Кнігі Скобелева варта выдаваць стотысячнымі накладамі. Піша **Павал Абрамовіч**.

Да ліку галоўных «літаратурных» падзеяў мінулага году можна аднесьці зьезд Саюзу пісьменьнікаў Беларусі (СПБ), які адбыўся пры канцы сьнежня. Разумеючы, што ўкладзеныя ў правядзеньне зьезду грошы трэба неяк адрабляць, і ведаючы, што гэта мерапрыемства атрымае шырокую рэкляму ў дзяржаўных СМІ, арганізатары пасьпяшаліся зрабіць шэраг гучных заяў. У гэтым усіх пераўзышоў старшыня СПБ Мікалай Чаргінец. Ён абвесьціў, што падначалены яму Саюз будзе адраджаць ідэі і традыцыі, якія заклалі ў аснову пісьменьніцкай арганізацыі Беларусі Янка Купала і Якуб Колас. Новыя «адраджэнцы» з высокай трыбуны ня толькі абяцалі-запэўнівалі-ўхвалялі (палітыку кіраўніцтва краіны, зразумела), але шмат і са смакам крытыкавалі. І ў першую чаргу — ідэйных апанэнтаў з Саюзу



СЯРГЕЙ ШАПРАН («БДГ»)

беларускіх пісьменьнікаў, якія выракліся «творчасьці ў імя інтарэсаў народу». Надавалі кухталёў і «сваім», каб чужыя баяліся (памятаеце «маладнякоўцаў»?). Так, сакратар СПБ Георгі Марчук «выявіў» тэндэнцыю замоўчваньня твораў сяброў СПБ у дзяржвыданьнях. Таксама ён абрынуўся на літаратурных крытыкаў за тое, што яны недаацэньваюць творчасьць сяброў Саюзу, у прыватнасьці Эдуарда Скобелева.

Ня ведаю, як іншыя, але асабіста я заўсёды высока цаніў талент Эдуарда Марцінавіча як дзіцячага пісьменьніка. Я не разумею, чаму беларускія кнігавыдаўцы мараць, як ім надрукаваць хутчэй за расейцаў чарговы опус пра Гары Потэра, тады як у нас ужо ёсьць свой цудоўны бэстсэлер для падлеткаў. Маю на ўвазе аповесьць «Прыгоды Арбузіка і Бебешкі» Скобелева, якая дваццаць гадоў таму была выдадзена накладам у чвэрць мільёна экзэмпляраў і ўвадначасьсе зрабіла аўтара супэрпапулярным. Думаеце, сучасным дзецям і іхным бацькам яна ня прыйдзецца даспадобы? Вы памыляецеся. Па-першае, Скобелеў стварыў філязофскую казку-прытчу, а Джаан Роўлінг выпусьціла жуйку ў прыгожай вокладцы. Па-другое, агрэсіўная маркетынгавая палітыка можа зрабіць цуд. Калі «Прыгоды Арбузіка і Бебешкі» сёньня даць у рукі Ксені Сітнік і паказаць па тэлевізіі, заўтра гэтую аповесьць будуць шукаць ва ўсіх кніжных крамах краіны.

Па-трэцяе, сама кніга зусім не састарэла — яе героі застаюцца актуальнымі. Асабліва кароль-вядзьмак Дулярыс, які забіў двух добрых чарадзеяў, што дапамаглі яму ў барацьбе за ўладу, і ператварыў большую частку жыхароў краіны ў трусоў і авечак.

Можна вінаваціць удзельнікаў-экспэртаў, а можна зрабіць выснову, што культурная атмасфэра сёньня не спрыяе пераносу інфармацыі, не садзейнічае пашырэньню меркаваньняў.

Мы бачым не экспэртныя ацэнкі меркаваньняў рынку (акрамя адказаў з кнігарняў, якія, аднак, ахопліваюць толькі асобны сэгмэнт менскага рынку, і таму ня могуць лічыцца паўнавартасна прадстаўнічымі), а вынікі прыватнага змаганьня апытаных зь перашкодамі на шляху да беларускага друкаванага слова: спачатку даведацца, пасьля адшукаць, пасьля пабачыць, рашыцца заплаціць грошы, знайсьці час, прачытаць... Калі пасьля не патрабуецца яшчэ й намаганьня, каб не шкадаваць пра немалыя высілкі, — зьяўляецца кандыдат на кнігу году.

### Ultra posse nemo obligatur

Сёлетняе апытаньне выдала вынікі, якія цалкам адпавядаюць магчымасьцям мэтодыкі. Яно выдатна прадэманстравала раздробленьне культурнага поля, нястачу адпаведных сродкаў інфармацыі і распаўсюду, наяўнасьць незадаволенага попыту што на кнігі, што на інфармацыю пра іх. Да яго, да апытаньня, ня варта кіраваць нейкія закіды.

Але гэткія вынікі — нагода задумацца, што атрымаецца ў наступным годзе. Каб палепшыць сытуацыю, патрабуецца ня так і шмат: пісаць, выдаваць, чытаць. Пісаць, выдаваць, чытаць. Пісаць, выдаваць, чытаць...

*Горадня*

Як вам гэты вобраз? А рэплікі Дулярыса? Яны ж проста шыкоўныя: «Як бачыце, я кожны дзень выдумляю цудоўныя законы. Ні дня без закону — гэта добрая звычка. І вам, і мне яна прыносіць шмат здароўя і радасьці… Сёньня раніцай, прачнуўшыся, я падумаў: «Як добра, калі падданыя любяць свайго караля і не жадаюць нічога, чаго не жадае кароль!»

Акрамя таго, у Эдуарда Скобелева ёсьць цікавыя вершы. Напрыклад, «Чоко-Моро» (2003) — «наш адказ» «Тараканищу» Карнея Чукоўскага. Паслухайце ўрывак зь яго: «Всем зверям без промедленья // покориться и молчать! // В обсужденья не встревать! // Я, ужасный Чоко-Моро, // смел, как тигр, велик, как слон, // объявляю глупым вздором// вашу жизнь и ваш закон!» Цяпер вы разумееце, чаму знакаміты Сяргей Міхалкоў у свой час назваў Скобелева «добрым настаўнікам», які спрыяе «разьвіццю грамадзянскага мысьленьня»?

Вось такі цудоўны пісьменьнік ёсьць у Беларусі. І я згодны з Г.Марчуком: пра Скобелева трэба больш пісаць у беларускім друку. А кнігі ягоныя, дадам ад сябе, — выдаваць стотысячнымі накладамі.


# ARCHE

## тры нумары запар

Часопіс «Arche» аднавіў выхад на паперы.










Выйшлі з друку № 10, 11, 12.

Шукайце ў незалежных распаўсюднікаў або падпісвайцеся. Падпісны індэкс 000345

# Першы беларускі паверх

**Васіль Аўраменка** піша пра кнігу Валера Булгакава: няйнакш малады дасьледчык прыпісаны да Адміністрацыі прэзыдэнта.




**Булгаков Валер. История белорусского национализма. — Вильнюс: Институт белорусистики, 2006.**

Яшчэ 15 год назад зьяўленьне гэтай кнігі было б немагчымае. А калі б яна раптам і выйшла, то была б не зразуметая дзевяноста дзевяцьцю працэнтамі сваіх патэнцыйных чытачоў. Сёньня, думаю, больш за палову чытачоў ацэніць яе адэкватна. Здавалася б, усяго 15 гадоў, але якіх гадоў!

Справа ў тым, што рамантызм пачатку 90-х быў дрэннай глебай для навуковай аб'ектыўнасьці. Тады на іх не было ні часу, ні грамадзкай патрэбы. Але «халодны душ» лукашызму прынёс сваю карысьць, бо дазволіў разгледзець тое, чаго не было відаць з вышыні нацыянальна-эмацыйнага ўздыму.

Увогуле, кніга Булгакава яшчэ раз даводзіць тую ісьціну, што гісторыя і гістарыяграфія — не адно і тое ж, і кожная эпоха глядзіць у мінулае праз свае адмысловыя «лінзы», выпінаючы адно, затуляючы другое, ігнаруючы трэцяе. Такім чынам, паміж гісторыяй сапраўднай і гісторыяй афіцыйнай (ці прынамсі папулярна-масавай) можа ляжаць вялізная прорва. Вось Булгакаў і спрабуе перакінуць хісткія масткі празь яе, наблізіўшы нас да «нягляншцавай» гісторыі нацыяналізму. Апошнія 15 год беларускіх рэалій ды сучасныя сацыяльна-гістарычныя падыходы дазволілі па-новаму зірнуць на многія «аксіёмы» і, здавалася б, бясспрэчныя факты нашай мінуўшчыны.

Вялікі плюс твору — пастаянная прысутнасьць эўрапейскага кантэксту, шырокае цытаваньне сусьветнавядомых аўтараў, паралелі з нацыятворчымі рухамі іншых народаў. Адносная нешматлікасьць расейскіх спасылак і крыніц — таксама хутчэй плюс. Бо міталягічныя «завалы» расейскай гістарыяграфіі, бадай, самыя вялікія і запушчаныя, а іхні разбор толькі б ускладніў галоўную задачу кнігі — «вывесьці на чыстую ваду» беларускі нацыяналізм.

«Чыстая вада» аказалася ня вельмі глыбокай, а як для нацыяналістаў «першага постсавецкага прызыву» (1988

Факты і тэксты, апублікаваныя Луцкевічам, былі пазьней выкарыстаныя літаратура- і мастацтвазнаўцамі ў БССР без спасылкі на аўтара. Піша **Анатоль Сідарэвіч**.

# Збор твораў Антона Луцкевіча




460 старонак вялікага фармату, 136 тэкстаў — такі аб'ём новае кнігі Антона Луцкевіча, што ўбачыла сьвет у «Кнігазборы» перад Калядамі. Том мае загаловак «Выбраныя творы: Праблемы культуры, літаратуры і мастацтва».

Як тлумачыць у прадмове да кнігі яе ўкладальнік і камэнтатар Анатоль Сідарэвіч, у гэтае выданьне ўвайшлі толькі беларускамоўныя публікацыі А.Луцкевіча, датычныя праблем культуры, літаратуры і мастацтва. Выключэньне склалі чатыры польскамоўныя працы, якія тэматычна цесна зьвязаныя з апублікаванымі ў кнізе беларускамоўнымі тэкстамі. Дзясяткі артыкулаў, рэцэнзій і водгукаў А.Луцкевіча, надрукаваных у габрэйскіх, нямецкіх, расейскіх, польскіх і чэскіх выданьнях, яшчэ чакаюць свайго дасьледчыка і публікатара. Праўда, укладальнік паведамляе, што сёньня яшчэ нельга скласьці канчатковага сьпісу і беларускамоўных працаў Луцкевіча, датычных культуры, літаратуры і мастацтва, бо ў Менску няма поўных камплектаў усіх заходнебеларускіх газэтаў, у якіх выступаў адзін з заснавальнікаў «Нашае Нівы» і яе галоўны публіцыст, а ў віленскіх і варшаўскіх бібліятэках, дзе гэтыя камплекты маюцца, А.Сідарэвічу папрацаваць не ўдалося.

Том «Выбраныя творы: Праблемы культуры, літаратуры і мастацтва» вельмі прыдасца гісторыкам беларускае духоўнае культуры, асабліва гісторыкам літаратуры, мастацтва і журналістыкі. Чытач убачыць, што шмат якія факты і тэксты, апублікаваныя ў свой час Луцкевічам, былі пазьней выкарыстаныя літаратура- і мастацтвазнаўцамі ў БССР без спасылкі на іх аўтара і першапублікатара, як гэта было, напрыклад, з многімі вершамі, перакладамі і лістамі Максіма Багдановіча. «Пазычалі» ў Луцкевіча і ідэі наконт этапаў творчае эвалюцыі паасобных пісьменьнікаў, школ і напрамкаў у разьвіцьці беларускае літаратуры. Чытач убачыць таксама, што палітык, адзін з заснавальнікаў Беларускай Сацыялістычнай Грамады, прэм'ер-міністар і міністар замежных справаў БНР А.Луцкевіч перш за ўсё цаніў у творах красу.

У гутарцы з карэспандэнтам «НН»

— 1994) — то проста катастрафічна плыткай. Як жа так, нашаму нацыяналізму няма і ста гадоў? А Вітаўт Вялікі, Леў Сапега і нават (!) Каліноўскі з Багушэвічам не былі беларускімі нацыяналістамі? Ну, спадарства, гэта ж правакацыя! Няйнакш «маладыя дасьледчык» прыпісаны да Адміністрацыі прэзыдэнта...

Але калі ўважліва прачытаць кнігу і асэнсаваць аўтарскія высновы, то зь імі цяжка не пагадзіцца: беларускі нацыятворчы працэс ва многім унікальны, складаны і запозьнены. На фоне іншых сучасных нацыяналізмаў на нашай тэрыторыі — польскага, расейскага, украінскага (а ў XIX — XX ст. быў яшчэ і габрэйскі) — ён сапраўды выглядае юным і кволым. Аптымізм першых гадоў нашай незалежнасьці быў занадта пасьпешлівы, а няўдачы наступных былі, бадай, заканамерныя. Аднак твор Булгакава — ня рэквіем па беларускім нацыяналізме, гэта хутчэй жорсткі самааналіз, сьмеласьць якога сьведчыць пра сталеньне самаго працэсу нацыятварэньня. Так, ён разбурае многія стэрэатыпы і прыгожыя карцінкі, створаныя папярэднікамі, але пакідае «зазор» паміж глухой сьцяной расейскага каляніялізму і ружовымі марамі раньняга незалежніцтва. Менавіта між імі можна ўгледзець пэрспэктывы Беларусі, і толькі працуючы на пашырэньне гэтай «шчыліны» можна дасягнуць рэальных вынікаў у нацыятварэньні.

Які выбар мае сёньня малады беларус? Пасяліцца ў расейскай «камуналцы», што дала расколіну, паспрабаваць патрапіць у супэрсучасны амэрыканскі «хмарачос», або застацца тут, на разбэрсанай будоўлі, дзе толькі закладзены падмуркі і ледзь набывае рысы «першы беларускі паверх»? Для тых, хто ўсё разумее і мае дастаткова сілаў ды цярпеньня — адказ відавочны. Хаця жыць з камфортам тут сапраўды пакуль цяжка. Але ж які прастор для творчага росту і самарэалізацыі! Колькі яшчэ не напісана, не адбудавана, ня зроблена! Банальна, і ўсё ж факт — Беларусь — нацыянальная «цаліна», якая ляжыць пад нагамі. Адкрыць яе для масавага творцы і спажыўца — вось задача-мінімум на бліжэйшыя 10 год.

Навуковы характар кнігі Булгакава ня робіць яе масавай. Канечне, можна было б паспрабаваць зрабіць зь яе кароткі, папулярызатарскі варыянт, але спрашчэньне тэрмінаў, скарачэньне аб'ёму, колькасьці спасылак і крыніц прывёў бы да скажэньня сэнсу і прафанацыі галоўных ідэй. Выйшла б яшчэ адна «глянцавая карцінка», супраць чаго так настойліва выступае аўтар.

Што тычыцца той думкі, што беларускі нацыяналізм ёсьць зьявай штучнай і хімэрнай накшталт «выдумкі якіхсьці дзівакоў», то любая нацыянальная ідэя — расейская, беларуская, папуаская ці амэрыканская — гэта заўжды *выдумка*. Каб не было ні «Нашай Нівы», ні БНР, ні БССР, то не было б і ўсяго іншага. Цалкам верагодна, што гісторыя магла пайсьці другой каляінай. Але ж беларускае «цеста» — наш народ — быў заўсёды, і «дрожджы», кінутыя Багушэвічам, хай і запозьнена, але запрацавалі — Беларусь адбылася! Як бы гэта каму ні муляла, але сёньня — яна рэальнасьць, зь якой вымушаныя мірыцца і зычліўцы, і нядобразычліўцы нашага шляху.

*Магілёў*

---

А.Сідарэвіч сказаў, што найбольш выдатнымі постацямі ў беларускім літаратура- і мастацтвазнаўстве, беларускай эстэтыцы міжваеннай пары былі Антон Луцкевіч, Максім Гарэцкі, Суліма (Уладзімер Самойла) ды ксёндз Адам Станкевіч, і найбольш поўная і аб'ектыўная гісторыя беларускай эстэтычнай думкі, літаратура- і мастацтвазнаўства будзе напісаная толькі тады, калі ўсьлед за творамі М.Гарэцкага і А.Луцкевіча сьвет убачаць укамэнтаваныя кнігі Сулімы і кс.Адама Станкевіча.

Застаецца дадаць, што том «Выбраныя творы: Праблемы культуры, літаратуры і мастацтва» — гэта ўжо другая кніга, у якой прадстаўлена творчая спадчына А.Луцкевіча. Першая кніга — «Да гісторыі беларускага руху: Выбраныя творы» — выйшла ў «Беларускім кнігазборы» ў 2003 г. У бліжэйшым часе ў вытворчасьць будзе здадзена трэцяя кніга — «Барацьба за вызваленьне». У том увойдуць дзёньнік і выбраная палітычная публіцыстыка А.Луцкевіча, партыйныя і дзяржаўныя дакумэнты, пісаныя ягонай рукой, а таксама працы з гісторыі Беларусі. Кніга ўжо існуе ў электроннай вэрсіі.

**Я.Са-віч**

# 55 000 словаў

У продажы зьявіўся «Нямецка-беларускі слоўнік». Аўтар і галоўны рэдактар Мікалай Кур'янка.




**Кур'янка М. Нямецка-беларускі слоўнік.** — Менск: выдавец Зьміцер Колас, 2006.

Слоўнік зьмяшчае звыш 50 тыс. нямецкіх слоў, словазлучэньняў ды фразэалягізмаў. Ягоныя стваральнікі — у працы браў удзел перакладчык і пэдагог Лявон Баршчэўскі — у прадмове зазначаюць, што кніга мае «выразную функцыянальную скіраванасьць — дапамагчы карыстальніку перакласьці на беларускую мову нямецкія тэксты размоўнага і грамадзка-палітычнага жанраў. (...). Таму ён будзе карысны як тым, хто вывучае нямецкую мову, так і тым, хто паводле характару сваёй дзейнасьці мае дачыненьне да нямецкай мовы».

Выдаў 796-старонкавы том Зьміцер Колас. Нагадаем, што пры канцы лета ў ягоным выдавецтве выйшаў «Ангельска-беларускі слоўнік» аўтарства Валянціны Пашкевіч з Канады.

Шукайце ў крамах.

# Докшыцы. 600 гадоў гісторыі

13 студзеня 1407 г. вялікі князь Вітаўт перадаў віленскаму ваяводу Войцеху Манівіду сёлы Беразінцы (Беразіно), Нязьдзілавіча (Гняздзілава), Дакшычане (Докшыцы). Докшыцам спаўняецца роўна 600 гадоў. Піша **Антон Лучкоўскі**.

## З гісторыі

Шэсьць стагодзьдзяў таму Докшыцы былі невялікім сялом, разьмешчаным на тэрыторыі старажытнай Харэцкай воласьці.

У 1458 г. Вайцех Манівід, уладальнік гэтых абшараў, памёр. Докшыцы па спадчыне перайшлі да яго дачкі Соф’і, якая ў хуткім часе выйшла замуж за Мікалая Радзівілавіча. Да 1542 г. Докшыцамі валодалі Радзівілы. Ганна Радзівіл выйшла замуж за Станіслава Кішку. Сын С.Кішкі, таксама Станіслаў, напачатку быў кальвіністам, аднак прыняў каталіцтва і хутка стаў біскупам жамойцкім. У 1608 г. ён фундаваў пабудову ў Докшыцах каталіцкага касьцёлу Найсьвяцейшай Тройцы. Ён жа перадаў касьцёлу свой фальварак Туркі, абавязаўшы сьвятароў утрымліваць у Докшыцах школу.

У 1514 г. славуты вайскавод Канстанцін Астроскі фундаваў будаўніцтва ў Докшыцах праваслаўнай царквы. У 1621 г. Докшыцы атрымалі статус мястэчка, а праз год правабярэжная частка мястэчка была аддадзеная капітуле жамойцкага біскупства. Докшыцы аказаліся падзеленымі на дзьве часткі. У левабярэжнай частцы, якая пасьля Кішкаў належала Юдзіцкім і Гутаровічам, была свая гандлёвая плошча і нават уніяцкая царква, зьнішчаная ў 1812 г. Гэтая частка Докшыц насіла назву Докшыцкая Слабада. Яна была далучаная да Докшыц толькі ў 1830-х.

У 1793 г. Докшыцы трапілі пад расейскую акупацыю. Тады расейцы надалі мястэчку з насельніцтвам 500 чалавек статус гораду. На чатыры гады Докшыцы сталі цэнтрам павету, а ў 1796 г. атрымалі герб. У 1797 г. Докшыцкі павет скасавалі, а Докшыцы парэзалі «па жывым», аддаўшы цэнтар мястэчка Барысаўскаму, а Докшыцкую Слабаду Вялейскаму павету.

Пасьля ўвядзеньня Кацярынай II «мяжы габрэйскай аселасьці» ў Докшыцы перасялілася шмат габрэяў з усяго наваколья. Перад вайной яны складалі большую частку насельніцтва гораду. Габрэі трымалі тут каля сотні крамаў і шэраг дробных прадпрыемстваў. Габрэй Хаім Гордан меў у Докшыцах піваварню, піва зь якой прадавалі нават у Вільні і Варшаве. У часе Другой сусьветнай вайны больш за дзьве з паловай тысячы габрэяў былі расстраляныя фашыстамі ў кар’еры на ўскраіне Докшыц.

За польскім часам у Докшыцах былі тры млыны, электрастанцыя, два гатэлі, некалькі рэстаранаў і кавярняў.

У 1907 г. у Докшыцах праходзіла нелегальная канфэрэнцыя дзеячаў Беларускай сацыялістычнай грамады, на якой было прынятае рашэньне аб спыненьні легальнай дзейнасьці партыі. На канфэрэнцыі прысутнічалі Антон і Іван Луцкевічы, Аляксандар Уласаў (рэдактар «Нашай Нівы»), Ф.Стацкевіч. У Докшыцах і наваколлі сто гадоў таму выпісвалі і чыталі «Нашу Ніву», бо ў ёй раз-пораз зьяўляліся допісы з гэтага краю, падпісаныя рознымі псэўданімамі. Ёсьць трохі падпісчыкаў «Нашай Нівы» ў Докшыцкім раёне і сёньня.



АРХІЎ А. ЛУЧКОЎСКАГА

## Рака Бярэзіна

На гербе Докшыц намаляваныя два збаны, зь якіх выцякаюць ручаіны і цякуць у розныя бакі. Ручаіны сымбалізуюць рэкі Вяльлю і Бярэзіну, якія бяруць свой пачатак на Докшыччыне. Вяльля пачынаецца за 30 км на поўдзень ад Докшыц, каля вялізнага Сьцёп-каменя (мясцовыя расказваюць легенду, што Сьцёп-камень — гэта акамянелы хлапец Сьцяпан, які прадаў душу нячысьціку, каб здабыць прыхільнасьць каханай дзяўчыны), а Бярэзіна бярэ свой пачатак каля саміх Докшыц, на лузе пры Даўгінаўскім тракце. Калісьці месца вытоку ракі можна было лёгка пазнаць: «Расла там бяроза, і заўжды быў кубак — гліняны ці драўляны, — зь якога можна было заўсёды напіцца вады», — прыгадвае 77-гадовы Мікалай Чысьцякоў, які амаль усё жыцьцё пражыў у Докшыцах і змалку цікавіўся гісторыяй роднага гораду. Аднак у савецкі час бярозу сьпілавалі, пра крыніцу забыліся. Некалькі гадоў таму докшыцкія БРСМаўцы паставілі сабе мэту знайсьці вытак Бярэзіны і ўсталяваць там памятны знак. Два разы арганізоўвалі летнік з назовам «Выток», ды так нічога і не знайшлі. Уся задума скончылася тым, што альтанку з расейскамоўным надпісам «Исток реки Березина» пас-



АРХІЎ А. ЛУЧКОЎСКАГА

тавілі на беразе возера ў цэнтры гораду.

Докшыцы ня маюць, як многія іншыя гарады, гістарычнага цэнтру з захаванай старой забудовай. Калі стаіш на цэнтральным гарадзкім пляцы каля райвыканкаму ды гарадзкога цэнтру культуры (былога райкаму партыі), то нават цяжка усьвядоміць, што Докшыцы маюць 600-гадовую гісторыю. Аб даваенным часе нагадваюць толькі мураваная Сьвята-Пакроўская царква-«мураўёўка», збудаваная ў 1903 г., ды двухпавярховая камянічка часоў Другой Рэчы Паспалітай, якую мясцовыя чыноўнікі зьбіраюцца руйнаваць. У гэтым кутку гораду шмат дзесяцігодзьдзяў стаялі помнікі правадырам. За часамі расейскай акупацыі тут быў помнік Аляксандру II, а галоўная вуліца называлася Аляксандраўскай. Бальшавікі зьнішчылі помнік, а на ягоным месцы пахавалі некалькі актывістаў савецкай улады, загіблых у польска-бальшавіцкай вайне 1919 г. Палякі надалі вуліцы Аляксандраўскай імя Пілсудзкага, а на месцы помніка цару паставілі помнік Пілсудзкаму. Камуністы зьнесьлі помнік. На другім баку плошчы ў савецкі час паставілі манумэнт Леніну, які стаяў сьпінай да райкаму партыі, трымаў рукі ў кішэні і задуменна пазіраў на райвыканкам. Напрыканцы 2005 г. Леніна зьнялі, а каб кампэнсаваць зьнікненьне ў цэнтры гораду гэтага атрыбуту савецкасьці, павесілі чырвоны сьцяг над адноўленай Дошкай гонару ля райвыканкаму. Год таму на месцы, дзе стаяў Ленін, запальваў паходню Лукашэнка. «Жители Докшицкого района всегда с Вами, всегда и во всём поддержат Вас!» — кляліся тады ў вернасьці ППРБ мясцовыя падхалімы.

### Гераічнае рабаваньне

У 1943 г. у Докшыцах дысьлякавалася 1-я Расейская Вызваленчая Армія, якая ваявала на баку немцаў пад кіраўніцтвам палкоўніка Радзівонава. Калі радзівонаўцы ўбачылі, што немцы церпяць паразы, то хуценька перайшлі на бок партызанаў, падпісаўшы адмысловае пагадненьне з кіраўніцтвам брыгады «Жалязьняк».

17 жніўня, на наступны дзень пасьля заключэньня пагадненьня, радзівонаўцы зьнянацку ўварваліся ў горад, зьнішчылі тут нямецкі гарнізон і пайшлі граміць чыгуначны вузел Крулеўшчына, адлеглы на 18 км ад Докшыц. У Докшыцах жа засталіся гаспадарыць жалезьнякоўцы. Яны спалілі тут касьцёл, школу, два млыны, бровар, два гатэлі і шмат іншых будынкаў. Адну старую жанчыну расстралялі за тое, што яна адмовілася аддаць ім карову.

За савецкім часам камуністы зруйнавалі трое могілак — двое габрэйскіх і адны хрысьціянскія. На месцы адных габрэйскіх могілак узьвялі раён электрасетак, другія ж пераўтварылі ў парк. Сёньня часта даводзіцца бачыць, як у гэтым парку гараджане навязваюць жывёлу, а па былых магілах ходзяць людзі. На месцы самых старадаўніх хрысьціянскіх могілак, дзе было нават некалькі каменных крыжоў, камуністы зрабілі «парк піянэраў» і паставілі там скульптуры піянэра, піянэркі і Леніна з кніжкай. Напачатку 1990-х на месцы «парку піянэраў» нарэшце збудавалі касьцёл Найсьвяцейшай Тройцы і каталіцкі кляштар.

Мясцовыя ўлады ведаюць пра юбілей Докшыц, і ў верасьні 2007 г. будуць праводзіць сьвята гораду. Да гэтага прымеркаваная рэканструкцыя гарадзкой плошчы, падчас якой зьнясуць старую камянічку, а на магіле бальшавіцкіх актывістаў зробяць аўтастаянку.

*Докшыцы*

# Зацьвілі краскі

На Новы год хадзіў з жонкай да ейнай вотчыны пад Крышылкі (фактычна няма ўжо той вёскі, адзін дом стаіць), дык па дарозе дахаты бачылі, як цьвітуць дзьмухаўцы і стрэлкі. Бадай, тая казка пра дванаццаць месяцаў. Старыя людзі кажуць — не на дабро.

**Максім Доўгі, Шчучын**

# Эвангелісты адмаўляюцца ад слова Каляды

Сёлета на Каляды ў царкве пяцідзясятнікаў «Благадаць Хрыстова» дзеткам раздалі сьвяточныя наборы цукерак вытворчасьці менскае цукерні «Камунарка». Па баках шасьціграных сувэнірных пакункаў зьмешчаныя навагоднія віншаваньні на трох мовах: беларускай, ангельскай і расейскай. Адпаведна вытворцы цукерак павіншавалі й з Божым Нараджэньнем: «Merry Chrystmas!», «С Рождеством!» і «З Калядамі!»... Аднак дзеткам падарункі былі раздадзеныя з ахайна заклеенымі беларускімі тэкстоўкамі. Вернікі не пашкадавалі часу, каб павырэзваць з чырвонага ракалу (дэкаратыўнай плястыкавай кляёнкі) сьцяжочкі й наляпіць іх на ўсе пушачкі. У слове «Каляды» пратэстанты бачаць паганскую традыцыю. А адзін зь вернікаў зьмяніў прозьвішча Каляда на жончына.

Словы «каляндар» ці «календула» пакуль астракізму не зазналі, хоць іхная этымалёгія тая самая, што й у беларускіх ды літоўскіх Калядаў — рымска-паганская.

**СХ**



GW

Жыхары Канарскіх выспаў ураЖаныя масавым наплывам імігрантаў. Яны баяцца, што турысты будуць меней ахвотна там адпачываць. На фота: адзін з турыстаў частуе выснажанага падарожжам імігранта.

# Сьвятла душы не пагасіць нягодам


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Становішча інвалідаў у Беларусі і Ўкраіне параўноўвае **Дар’я Ліс**.

Мы сустрэліся выпадкова на просторах Сеціва і пасябравалі — зусім не выпадкова і цалкам рэальна. Шмат супала рэчаў, але галоўнае — Лена любіць Украіну, я люблю Беларусь. Спачатку Памаранчавая рэвалюцыя у Кіеве, потым — нашы каліноўцы… У такія моманты пачынаеш разумець падтрымку сяброў.

Данецк. Пачатак зімы. У студэнтаў-завочнікаў эканамічна-праўнага факультэту Данецкага дзяржаўнага ўнівэрсытэту пачалася сэсія. Такой парой звычайна холадна і сьлізка. Сёлета шанцуе: надвор’е для гэтых дзён анамальна цёплае: Лене і ейным бацькам ня прыйдзецца пераадольваць сьнежных гурбаў на шляху да пяціпавярховага корпусу ўнівэрсытэту, які, вядома ж, ліфту ня мае. Знаёмыя постсавецкія рэаліі. Усё о’кей, калі вы здаровы чалавек, а Лена — студэнтка, разумніца і прыгажуня, — на інвалідным вазку.

Звычайная сям’я. Нарадзілася дачка, якую ўжо любілі і чакалі. Дзіцяці год. Звычайны грып. Ускладненьне — і дзяўчынка сур’ёзна захварэла. Сьпінальная аміятрафія (а прасьцей — праблемы са сьпінай і мышцамі) уносіць у жыцьцё карэктывы. Звычайная дзяўчынка становіцца інвалідам. Спачатку яна крыху хадзіла, потым — вазок, моцныя абмежаваньні ў руху. Калі хварэеш зь дзяцінства, пачынаеш успрымаць хваробу ня як трагедыю, а як тое, з чым прыходзіцца жыць «тут і цяпер». І… пераадольваць.

Так адбылося зь Ленай. Яна вырашыла расфарбаваць жыцьцё ў яркія колеры — так цікавей. Зь дзесяці год пачала займацца вышыўкай з народным майстрам Ларысай Краўчанка. Выгафтоўка — гэта даўняя «фішка» Ўкраіны… Лена спрабуе знайсьці свой стыль, валодае сямюдзесяцьцю швамі. Захапілася бісэрапляценьнем. Леніны бацькі, Сяргей і Таццяна Яваравы, — таксама людзі творчыя: тата — таленавіты мастак, а маці прыгожа вышывае.

Многія работы Алены Яваравай можна пабачыць на ейным сайце «Павер у сябе» (http://www.believe.net.ua/ua/) (ўэбдызайн — яшчэ адно хобі), які прысьвечаны справам інвалідаў Украіны. Рэсурс працуе болей за тры гады і займеў шмат прыхільнікаў (толькі падпісчыкаў рассылкі навінаў — 600) па-за межамі жоўта-блакітнай (ёсьць і расейская вэрсія), мае сымпатычны дызайн і зручны інтэрфэйс. Тут ёсьць чат і форум, дзе людзі з абмежаванымі фізычнымі магчымасьцямі могуць сустрэцца, пазнаёміцца, паразмаўляць, а таксама бібліятэка, база патрэбных і цікавых спасылак, жыцьцёвых гісторый, софт, своеасаблівая літаратурная гасьцёўня, дзе можна зьмясьціць вершы і прозу. Важна разумець, што ты не адзін. І яшчэ — не заўжды ў зносінах са здаровымі людзьмі вы знойдзеце столькі аптымізму і любові да жыцьця, як у зносінах зь інвалідамі, так што кожны можа зазірнуць на агеньчык і паразмаўляць пра што заўгодна — можа, гэта шанец зразумець у чарговы раз, што жыцьцё… не такая шэрая рэч. Дарэчы, слова «інвалід» час выводзіць з ужытку: няма абсалютна свабодных людзей — у кожнага свае абмежаваньні, абмежаваныя фізічныя магчымасьці зусім не азначаюць абмежаваньняў розуму, сэрца і душы. У Эўропе наагул не прынята акцэнтаваць увагу на праблемах, а праблемах здароўя — у прыватнасьці. Іх там звычайна спакойна вырашаюць, пры неабходнасьці — з дапамогай дзяржавы. Падчас падарожжа ў Францыю (даўняя мара), якое на шаснаццацігодзьдзе Лене падаравалі бацькі (разьвітаўшыся з аўтамабілем), ніхто на вуліцах не зьвяртаў увагі на дзяўчыну ў вазочку. У той жа час Лена магла наведваць тэатар, кіно, крамы, супэрмаркеты і знакамітыя парыскія кавярні — ніякіх перашкод, а гарадзкі транспарт цалкам прыстасаваны для праезду вазочнікаў. Вось толькі пры наведваньні Люўру ўзьнікла праблема ў выглядзе прыступак на ўваходзе… Але на некалькі хвілін — падышоў служачы і дапамог Лене падняцца на спэцыяльным ліфце для вазкоў. Парыж — сьвята, якое заўжды з табой, Гэмінгўэй меў рацыю… У Парыжы ніхто ня будзе зьдзіўляцца таму, што вы на вазку або носіце на галаве іракез.

У Беларусі ды ва Ўкраіне ўсё крыху інакш — постсавецкая прастора. У СССР дзейнічаў прынцып: няма чалавека — няма праблемы, таму і інвалідаў не было... Не, яны былі, зразумела: сядзелі ў чатырох сьценах. Сядзелі ціха. Нікому не перашкаджалі. У нашыя дні сытуацыя не такая змрочная: зьяўляюцца пандусы, на людзей абмежаваных фізычных магчымасьцяў не глядзяць як на іншапланэтнікаў, але праблемы перамяшчэньня чалавека на вазку прыкладна аднолькавыя ў Данецку ды ў абласных гарадох Беларусі. Напярэдадні сёлетняга Дня інвалідаў журналістка газэты «Донбасс» запрасіла Алену Явараву ў «падарожжа» па родным горадзе, у выніку якога высьветлілася: практычна ўсе ўстановы (ад дарагіх буцікаў да прадуктовых крамаў, ад праваслаўнай царквы да тэатру) недасяжныя для вазочніка (прыемны выняток — каталіцкі касьцёл). Жорстка, ды факт.

І ўсё ж ёсьць паміж нашымі краінамі адрозьненьні… Падчас сакавіцкіх падзей у Менску падумалася: у нашых акцыях пратэсту (выключна мірных, панове!) ня ўдзельнічаюць вазочнікі. На першы погляд, лягічна. На першы погляд… Падчас прэзыдэнцкіх выбараў ва Ўкраіне ў Данецку (вотчына Януковіча, як вядома) праходзіў мітынг у падтрымку Віктара Ючшанкі (зусім не шматлікі), і Алена была там — каб выказаць сваё меркаваньне грамадзянкі СВАЁЙ краіны. Зь ёй нічога ня здарылася. Вярнулася дадому, сагрэлася гарбатай… і наперад — да новых спраў, падзей і надзей. Крэда гэтай мужнай і мілай дзяўчыны — «…І назаўжды забыцца на слова «немагчыма»».

*Смаргонь*

## Немагчыма прамаўчаць

**і не падзяліцца ўражаньнем ад артыкулу «Навука і грамадзтва» ў дзяржаўнай газэце «СБ» за 12 сьнежня.**
Калі ўжо пачалі пісаць такія артыкулы, значыць, мы сапраўды назіраем апошнюю агонію ідэалёгіі нашай дзяржавы. Падняць з праху атэізм і выкласьці ў такой савецкай агітформе — гэта пачатак канца. Калі я чытала артыкул, дык ня ведала, ці то сьмяяцца, ці то плакаць. Калі яго дачытала, дык зразумела — набліжаецца выкананьне прарочага слова. Перад распадам СССР было шмат прароцтваў пра тое, што Бог разбурыць гэту сыстэму зла, і камуністычны рэжым рухне. Хрысьціянам тых часоў цяжка было паверыць у гэта, і нешматлікія верылі. Але хутка гэта адбылося, і так хутка, што людзі не былі гатовыя да такіх пераменаў. Прароцтвы споўніліся. І цяпер я хачу працытаваць прароцтва на нашу краіну: «Як Бог зруйнаваў жалезную заслону, як Бог зруйнаваў бамбукавую заслону ў Афрыцы, так Бог зруйнуе гэтую заслону ў Беларусі». Я веру, што гэты дзень будзе. І мы на парозе вялікіх пераменаў. І нам цяпер нельга здавацца і расчароўвацца. Мы дачакаемся абяцанага ад Бога.

**Ірына Гоманава, Менск**

* * *

**Зычу моцы духу ўсяму калектыву Рэдакцыі, бо разумею, як вам няпроста... проста выконваць свае прафэсійныя абавязкі.**

Асабістыя віншаваньні «залатой асадцы — 2004–5–6...» Віталю Тарасу, летуценьніку Паўлу Севярынцу ды ўсім-усім...

**Віктар Новік, Капыль**

## Тэстам ня вымераць любові

**Выкарыстаньне тэстаў па беларускай мове і літаратуры становіцца пашыранай зьявай у беларускім грамадзтве.** Нават выкарыстоўваюцца тэсты ў якасьці ўступных іспытаў па беларускай мове і літаратуры ў ВНУ. Я перакананы, што тут Міністэрства адукацыі зрабіла вялікую памылку.

Я ня супраць тэстаў па беларускай мове ці літаратуры. Але лічу, што тэсты ня могуць служыць у якасьці формы правядзеньня выпускных, тым больш уступных іспытаў па літаратуры ці мове. Трэба ўжо даўно зразумець ня толькі настаўнікам, але і мэтадыстам–навукоўцам, што беларуская мова — гэта ня толькі прадмет вывучэньня, але і сродак навучаньня і выхаваньня. Заўсёды, калі я рыхтуюся да ўроку па беларускай мове ці літаратуры, то вызначаю тры мэты: адукацыйную, выхаваўчую і разьвівальную. Мы часам забываемся пра выхаваўчую мэту, лічым яе другаснай.

Для мяне на сёньня найважней выхаваць праз беларускае слова Патрыёта, Грамадзяніна. Абудзіць нацыянальную самасьвядомасьць, любоў да роднай мовы, гісторыі, нацыянальных традыцый.

У 2002 г. я скончыў Магілёўскі дзяржаўны унівэрсытэт імя А.Куляшова і прыехаў працаваць на Кармяншчыну ў якасьці настаўніка беларускай мовы і літаратуры. І ўжо тады я зразумеў, што абудзіць нацыянальную самасьвядомасьць вучняў можна толькі праз жывое роднае слова, а таксама праз пісьмовыя творчыя работы.

Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на распрацоўку тэмаў сачыненьняў. Тэмы мусяць закранаць менавіта пачуцьцёвае ўспрыманьне школьнікаў. Вось якія тэмы сачыненьняў я прапаноўваю сваім вучням: «Чаму беларусы не размаўляюць па–беларуску», «Маё пакаленьне», «Што такое шчасьце», «Мой выбар у жыцьці», «Што я зрабіў (зрабіла) для Радзімы?» і г.д.

Разам з вучнямі выпускаем літаратурную газэту. Школьнікі з радасьцю бяруць удзел у абмеркаваньні тэмы газэтнага нумару, падбіраюць і карэктуюць навуковы матэрыял, самастойна і з дапамогай настаўніка пішуць мастацкія творы: вершы, апавяданьні, сачыненьні, эсэ, прысьвечаныя юбілею таго ці іншага беларускага паэта ці пісьменьніка. Таксама часта выкарыстоўваю на ўроках беларускай мовы вусныя пераказы на патрыятычныя тэмы.

Я перакананы, што форму прыёму ўступных экзамэнаў трэба зьмяніць. Ва ўсіх беларускіх ВНУ трэба абавязкова ўвесьці экзамэн па беларускай мове і літаратуры ў форме сачыненьня, бо толькі праз сачыненьні можна выявіць сапраўдных творчых і інтэлектуальных маладых людзей. А ў сярэдніх школах неабходна аднавіць экзамэн па беларускай літаратуры ў вуснай форме, калі мы ня хочам страціць беларускае нацыі.

**Юры Мянькоў, Кармяншчына**




## Зрабілі вам стэнсіл

**Віншуем са стагодзьдзем. У падарунак мы, удзельнікі ЖЖ суполкі by_stencil (community.livejournal.com/by_stencil), зрабілі вам стэнсіл.**

Стэнсіл — малюнак аэразольнай фарбай праз трафарэт. Ад самага пачатку свайго існаваньня трафарэты выкарыстоўваліся як «зброя рэвалюцыянэраў» — спосаб данесьці свой пункт погляду і мелі абавязковы ідэйны падтэкст.

Сёньня стэнсілы не губляюць сваёй актуальнасьці.

**Ад Рэдакцыі:** стэнсілерам вялікі дзякуй.

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб’ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас:**
**а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

## АПЫТАНЬНЕ «НН»

### Дзе Вы жывяце, наш чытач?

| | |
|---|---|
| Менск і Менская вобласьць | 148 (49.0%) |
| Гарадзеншчына | 19 (6.3%) |
| Берасьцейшчына | 12 (4.0%) |
| Гомельшчына | 11 (3.6%) |
| Віцебшчына | 24 (7.9%) |
| Магілёўшчына | 19 (6.3%) |
| Эўропа | 43 (14.2%) |
| Расея | 5 (1.7%) |
| Амэрыка | 9 (3.0%) |
| Афрыка і іншыя Карыбы | 12 (4.0%) |

Усяго прагаласавала: 302

## МІХАЛ АНЕМПАДЫСТАЎ



СХАВАНАЕ СЭРЦА

Лета, сьпёка, і сквар, і з тарфянікаў дым.
Летам сьвятаў багата, адно за адным,
І яшчэ, у дадатак, адразу за тым,
Але мне не сьвяткуецца, блін.

Сьвеціць тварам у твар мне горад–герой,
Але ёсьць яшчэ іншы, ёсьць яшчэ той
Занядбаны, забыты, зацюканы брат
Горад прыцемкаў, горад–вар'ят.

Ён адкрые на хвілю свой скрыўлены твар
Тады, калі восень, і дрэваў пажар
Ужо дагарэў, і калі да зімы
Вымылі неба дажджы.

Гэтак чыста і пуста на пляцы Цэнтральным,
А за ім памірае, квартал за кварталам,
горад Менск. Памірае нязграбна, нягожа,
І гары яно гарам, і памерці ня можа.

Вось жа прыйдзе зіма і нашэпча замовы,
І суцішыцца боль на пэрыяд зімовы,
Зацярушаны сьнегам, засьне стары горад
Без Адвэнту, Калядаў і Новага году.

Мінск ідзе у сьвяточны запой тымчасова,
Мне па горла стаіць, мне ужо дастаткова,
Але кліча, і цягне мяне за сабой ён,
Што ты робіш са мной, горад–герой мой.

Цьвік заб'е Сакавік на зімовыя смуткі,
Аўтазак адвязе адмарозкаў на суткі,
Зарунее трава ва усіх накірунках,
Закрасуе вясна у зялёных карунках.

Так захочацца жыць, і пад швэдрам прарэжуцца крылы,
Навальніцы і дворнікі вызваляць горад ад пылу,
Горад Мінск бутафорскім алмазам зазьзяе на сцэне,
Горад Менск назаўжды у ягоным схаваецца ценю.

Мастакі занатуюць, завучаць на памяць Менску прыкметы,
Сэрца Менску у сэрцы сваім захавае мясцовы паэта,
Жыхары павылазяць на вонкі з утульных пракураных нораў,
Будуць спраўджваць вуліц адлегласьць і плошчаў выкрочваць прастору…

Тут прасторы хапае, ды паветра няшмат,
І дыхае цяжка горад–вар'ят,
Але б'ецца і грукае сэрца ягонае,
Надзейна схаванае на белым чырвонае.



ФОТА АЎТАРА

## АНДРУСЬ ХРАПАВІЦКІ

ПРАГАЛЫ

Мы палім масты і будуем новыя,
Рэкі пераплываем, зьбіраем грыбы і ягады,
Будуем замкі свае папяровыя,
Гарэлкай, бы кітам, замазваем сэнсавыя прагаліны.

Нас шмат, багата нас, аж задужа...
Было б нас меней, напэўна, жылі б заможней,
А зараз бы кропля ў душы...
Сьцякаем па голым целе з пустога ў парожняе.

Мы песьцім суседзкіх котак, бо сваіх мы ня маем.
Нашыя хаты ахоўваюць толькі сабакі,
А не сыгналізацыя, бо ёй мы не давяраем.
Мянты ў нас, бы ў амшары вужакі.

Краіна пад белым, белым прагалам
Клявішы найдаўжэйшай, каб патрапілі нават нагамі.
Віцебчукі, вы блытаеце Малевіча і Шагала?
А вось Space і Enter ня зблытаеце нават змалу.

Прагалы ў памяці, думках, падручніках і газэтах.
Тэлеканалы тут маюць шмат тэхнічных пярэрваў,
Напэўна, у іх свае схаваныя мэты —
Рыхтуюць чарговы сюжэт, каб папсаваць нам нэрвы,

Каб у нэрвах нашых палопаліся клеткі,
Якія, вядома, не аднаўляюцца, і замест іх пустэча
Ўзьнікае. А нэрвы, яны ў нас, як у клетцы
Жывёлай загнанай жывуць, аж пакуль не адкінем плечы,

Бо таго, хто за імі стаіць, адкінуць ніяк не ўдаецца.
Дакладней, там двое, з крыламі і з рагамі.
Адзін чамусьці заўсёды сьмяецца
І шэпча нам тое ж, што кажуць вядучыя ў «Панараме».

РАЗ, ДВА, ТРИ

Дзіцячы садок. Дзеці становяцца ў шэраг.
Дзеці ходзяць па коле пад вайсковае «раз, два, три»,
Выхавацелі зноў гартуюць паслухмяную шэрасьць
На мове чужой краіны, а ня роднай зямлі.

Раз, два, три.... Па коле, па коле, па коле...
Дзеці–жаўнеры, дзеці, вы гатовы страляць
У іншых дзяцей, у вашых бацькоў? Гэта вашая роля?
Дзеці ў садку маленькія. Што яны могуць сказаць?

І ці змогуць, калі іх зь першых гадкоў прывучаюць,
Быць вінцікамі ў сыстэме, адказваць «так» на загад?
Дзеці ходзяць па коле... з адчаем на іх пазіраю,
Як сыстэма гартуе чарговы вайсковы атрад.

ПЕШКІ

О не, я не хачу зрабіцца пешкай.
Замест шашы адны пустыя сьцежкі.
Замест людзей адны чужыя вочы.
Замест багоў аблічча ночы.

Дарога ў нікуды. Няма свабоды.
Каб за свабоду, быць няма народу.
Каб на Радзіме жыць, няма нагоды,
Бо там тубыльцы кланяюцца стоду.

І вось ён я паміж фігур на мапе.
І я жыву, нібыта на этапе.
Лятак і неба, карабель і мора,
Бальшак і аўта, і назад па норах.

Хаваемся адно ад аднаго, бо ганьба,
На ганак выйдзеш, а навокал багна.
Навокал усё адны пустыя сьцежкі.
Адзін кароль… і пешкі…




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## ВАДЗІМ БОЛБАС

ПІЛІПАЎКА

Дробны восеньскі дождж прамывае апалае лісьце,
У зьмярканьні паўдзённым хаваюцца дрэвы, дамы.
І, здаецца, ня будзе ніколі ніякага выйсьця,
Не пазбыцца панылае, змрочнай асеньняй турмы.

Хмары нізкія, шэрыя восеньскі горад накрылі,
Не праб'ецца празь іх хоць танюсенькі сьветлы прамень.
Адчуваньне прасторы і часу усе мы згубілі,
Бо ня бачылі сонца, здаецца, мо тысячны дзень.

У Піліпаўку шэрую цягне у сон на зьмярканьні,
Год каторы у сьнежні тужлівы імжак, а ня сьнег.
Не варушацца думкі, слабеюць і нікнуць жаданьні,
Кроў у жылах зь няўхільнасьцю сьмерці прыцішвае бег.

Ні сьпяваць, ні гуляць з надыходам паўдзённай цямрэчы,
Нат ня йдзе успамін пра калісьці жаданых жанчын.
І ня вабяць напоі вясёлай сяброўскай сустрэчы,
Толькі б лёг і ляжаў. І глядзеў у сутоньне адзін.

А бывала ж калісьці: насыпле Піліпаўка сьнегу,
Так што з дому ня выйсьці, і гурбы за хаты вышэй.
На ўраджай збажыны, а вясёлай дзятве на пацеху.
І ад белага сьнегу, здавалася, й ноччу сьвятлей.

А пакуль золкі дождж ліст зжаўцелы з галінкі змывае,
Хмары шэрыя ніжай і ніжай павольна плывуць.
У часіны такія міжволі ў прыроды пытаеш:
«Дык ці выпадзе сьнег? Ці пачуцьці ў душы ажывуць?»

*31.01 — 06.02.2006*

## ЮРАСЬ ПІВУНОЎ

ВОСЕНЬ 100–ГОДЗЬДЗЯ «НАШАЙ НІВЫ»

Бярозка струменіць
Лістотаю жоўтай,
Прагноз абяцае нам
Холад і слоту.
У краіне — «стабільнасьць»,
Бяруць актывістаў —
У многіх ёсьць шанец
Стаць «тэрарыстам»...

## КАСЯ КАВАЛЬКОВА

***

Абярніся, хлопча,—
Гэта твой горад,
Убрукаваны
Тваім горам.

Углядзіся ў нябёсы, дружа,
Там сьцяг наш родны —
Лязом расьсякае паветра.

## MANN KURT

ХАЙКУ

***

Якія мужныя й шчырыя твары ў нашых партызанаў!
Асабліва на рэльефных пано,
Каваных і мазаічных.

***

Міліцэйскі трактар на ўзбочыне самотна стаіць.
Краіны сьвятое імя
Міжволі ўзгадаю.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Поп-сьпявачка Вольга Барабаншчыкава на тэнісным турніры кампаніі «Атлант-М».**



# У «Перамозе» паказ фільму, дубляванага на беларускую мову

«Маленькая калядная казка» (Швэцыя — Фінляндыя).

Маленькая дзяўчынка Іна згубіла ўлюбёную цацку — мядзьведзянятка Ну-Ну. Цацка трапляе ў розныя рукі, вандруе па ўсёй краіне і абсалютна выпадкова напярэдадні Калядаў вяртаецца да Іны...

Фільм, зьняты ў 1999 г., дубляваны на беларускую мову творчай ініцыятывай «Беларускі Гольфстрым» сумесна з прадстаўніцтвам Швэцыі ў Беларусі. У агучваньні бралі ўдзел вядомыя акторы, музыкі, журналісты: Аляксандар Памідораў, Ягор Маёрчык, Юрый Баранаў, Жэня Жуковіч.

«Маленькая калядная казка» будзе паказвацца ў менскім кінатэатры «Перамога» (вул. Інтэрнацыянальная, 20) у суботу і нядзелю (**13 і 14 студзеня**) **а 13:00 і 14:30**.

**Ул. інф. і kino.br.by**

# Стары Новы год з KRIWI

**13 студзеня**, у стары Новы год, у менскім Доме кіно пройдзе аўдыёвізуальнае шоў пад назвай «Кароткае замыканьне. Культавыя кліпмэйкеры». Спэцыяльна для ўдзелу ў гэтай імпрэзе з Бэрліну прыехала Вераніка Круглова. «Арганізатары не зьбіраюцца рабіць жорсткую схему і ўсаджваць людзей у глядацкую залю, — кажа яна. — Усе будуць свабодна рухацца з адной залі ў іншую».

У холе вялікай залі пакажуць музычнае відэа, «шорцікі» — кароткія фільмы і арт-кліпы. А тамсама — поўная праграма рэклямныхролікаў наватарскага скандынаўскага калектыву «Трактар», які мае багата ўзнагародаў. Пакажуць сэрыю жартоўных драйвавых і яскравых танцавальных фільмаў, ролікі Bjork, Rolling Stones, Kylie Minogue, The Chemical Brothers, Foo Fighters і шмат каго яшчэ.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Другая частка — аўдыё-відэа-мікстэрыя: жывы выступ KRIWI пад візуальны шэраг ад Валерыя Канішчава і выстава беларускай мастачкі Жаны Капусьнікавай.

Цягам усяе імпрэзы ў холе можна будзе знайсьці інфармацыю пра ўсё, што адбываецца, мультымэдыйны столік і, вядома ж, бар.

**Паводле ERB, InterFilmWostok**

# Таямніцы Марка Шагала

**БТ, 10 студзеня, 21.40**
**«Эпоха». Марк Шагал.** Фільм 2.
Беларусь, 2006, каляровы, 40 хв.
**Рэжысэр і вядоўца:** Алег Лукашэвіч

Аўтарская перадача Алега Лукашэвіча пра Марка Шагала — і адзін зь нямногіх праектаў беларускае тэлевізіі, які можна глядзець. У перадачы — карціны Шагала, месцы, зь ім зьвязаныя, гутаркі са сваякамі й мастацтвазнаўцамі.

Перадача добра змантажаваная, а само апавяданьне ня нуднае.

**11 і 12 студзеня а 21.40** — працяг перадачы.

**Андрэй Расінскі**

БЕЛАРУСКАЯ РЭДАКЦЫЯ РАДЫЁ “ПАЛЁНІЯ”




www.polskieradio.pl/polonia/by

**Паглядзі на карцінкі і скажы, чым займаюцца ўзімку жыхары Плястыляндыі.**







## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Дзіця ў лябірынце пачвараў

**Лабірынт Фаўна** (Laberinto del Fauno).

Мэксіка — Гішпанія — ЗША, 2006, каляровы, 119 хв.

**Рэжысэр:** Гільерма Дэль Тора.

**Ролі выконваюць:** Арыядна Хіль, Івана Бакера, Серхі Лопез, Марыбэль Вэрду.

**Жанр:** Страшная казка, гісторыка-партызанская драма-прыпавесьць.

**Адзнака:** 9 (з 10).

Гішпанія, 1944 год. Дзесяцігадовая Афэлія разам зь цяжарнаю маці прыяжджае ў лягер айчыма — капітана Відаля. Капітан — злы й фанабэрысты чалавек, які вядзе бязьлітасную вайну зь мясцовымі партызанамі. У закінутым лябірынце летуценная Афэлія сустракае Фаўна, які паведамляе дзяўчынцы, што яна — дачка падземнага караля. І, каб вярнуцца да бацькі, ёй трэба прайсьці магічныя выпрабаваньні.

Рэальная вайна сплятаецца з кашмарамі лябірынту — і што здольнае супрацьпаставіць злу безьвіннае дзіця?

Гільерма Дэль Тора — адзін з найлепшых сёньняшніх рэжысэраў, першы казачнік-рэаліст новага стагодзьдзя. Нават ягоныя камэрцыйныя стужкі («Мімікрыя», «Блэйд-2») вылучаюцца выкшталцонай культурай кадру, бездакорнымі эфэктамі й магіяй кінаэкрану.

Дэль Тора распрацоўвае новы жанр страшнага казачнага рэалізму, дзе фантазіі сплятаюцца з рэальнасьцю, гісторыя неадлучная ад містыкі, а героі (звычайна дзеці) даюць бой сацыяльнаму й мэтафізычнаму злу. Першая спроба такога жанру — алхімічна-вампірычная прыпавесьць «Хронас», другая — шэдэўр «Хрыбет д'ябла» пра грамадзянскую вайну ў Гішпаніі вачыма хлопчыка.

«Лябірынт Фаўна» працягвае традыцыі «Хрыбта». Мэксіканец Дэль Тора пазычае й вынаходкі Карласа Саўры часоў франкісцкае дыктатуры, чые кінапрыпавесьці пра дзяцей насычаліся мэтафізычным страхам.

Але шчэ адна крыніца Дэль Тора — клясычны гішпанскі жывапіс. Ветліва-драпежны Фаўн, сьляпая пачвара з вачыма на далонях, цёмныя лябірынты ад апэратара Гільерма Навары — як кашмары позьняга Гоі й барочная містыка.

Бязьвіннасьць мае ўладу, зло ня здольнае фантазіраваць. Але допускам у сьвет фантазій становіцца ўласная кроў — а казка становіцца настолькі страшнай, што дзецям лепей яе не глядзець.

Карціна — для ўдумлівых гледачоў. Гэта сапраўднае сьвята кінэматографу, ібэрыйскі шэдэўр, які рэзка вылучаецца сваёю адметнасьцю.

Сэансы ў Доме кіно 12 і 14 студзеня а 18.45, 13 студзеня а 17.00.

**Андрэй Расінскі**

## КАНЦЭРТ

**Андрэй Мельнікаў**

**19 студзеня** на ўправе БНФ **а 18.30** пачнецца канцэрт Андрэя Мельнікава «Маё пакаленьне». Т.: 571-26-11.

## ВЫСТАВА

**«Гагарын жывы»**

**Да 31 студзеня** ў галерэі «Падземка» (пр.Незалежнасьці, 43) працуе выстава Васіля Пачыцкага, вядомага таксама як Вася Гагарын.

## КІНО НА DVD

**РАСТВО ХРЫСТОВА (The Nativity Story)**
Калядная драма, ЗША, рэж. **Ктрын Гардвік**
У ролях: **Кейша Касл-Г'юз, Оскар Ісаак, Хіам Абас**
Гісторыя Хрыстова Нараджэньня, у якой акцэнтуецца ўвага на жыцьці Сьвятое сям'і ў складаных умовах перад прышэсьцем Збаўцы...
Менск, Кісялёва 12, 643-21-08

# Прэзэнтацыя новай кніжкі Хадановіча




**18 студзеня** у чацьвер, а **18.00 Андрэй Хадановіч** запрашае на паэтычна-музычную акцыю «Размова з рэхам». У рамах імпрэзы — прэзэнтацыя новай кнігі **«Сто лі100ў на TUT.BY»**. Удзел бяруць гурт «Рэха», а таксама Ўладзімер Арлоў, Максім Жбанкоў ды іншыя добрыя людзі. Месца: кіназаля Палацу моладзі (Старавіленскі тракт, 41). Даведкі праз тэл.: 262-02-90, маб. 272-02-90.
Кошт уваходу — 2 тыс. руб.

# ВЯЛІКАЯ ПАЛІТКРЫЖАВАНКА



**Па гарызанталі: 1.** Першы віцэ-прэм’ер, «герой» перамоваў з «Газпромам». **4.** Лётчык-пэнсіянэр, былы старшыня пралукашэнкаўскай Патрыятычнай партыі. **9.** «Чэсны» сацыёляг, чалец-карэспандэнт Акадэміі навук. **10.** Стан прыхільнікаў пэўнай ідэі. **11.** Біблійны царок, недабіты Саўлам. **13.** Прозьвішча жонкі першага прэзыдэнта Расеі. **14.** Бягун на доўгую дыстанцыю. **15.** Імя рабіна, у 2005 г. выціснутага зь менскай сынагогі ў рамках змаганьня зь іншаземнымі духоўнымі асобамі. **18.** Колькасны выраз спартовай перамогі. **20.** Лідэр беларускіх камуністых. **22.** Замак, дзе сядзеў Монтэ-Крыста. **24.** Там рэй вядзе Кадафі. **25.** Асадак у вадаёме. **27.** Пасудзіна, у якой увесну 2006 г. людзі неслі гарбату на Кастрычніцкую плошчу сталіцы. **30.** Правадыр украінскіх нацыяналістаў у 1930 — 40-я г. **31.** Перасоўны цырк. **33.** Фабіян ... — сябра першага савецкага ўраду Беларусі. **34.** Баявое мастацтва, вучыцца якога забаранялася ў БССР. **35.** Амэрыканец, аўтар кніжкі «Як уплываць на людзей» і т.п. **36.** Мера зямельнай плошчы ў ВКЛ. **39.** Зянон. **42.** Першы кіраўнік ураду ў сувэрэннай Беларусі. **44.** Украінскі савецкі паэт Іван ... **45.** Так клічуць «звышуплывовую», паводле І.Ціцянкова, жонку «сьпікера» У.Канаплёва. **46.** Імя баўгарскага шахматыста, які пад канец 2006 г. абвінаваціў чэмпіёна сьвету У.Крамніка ў супрацы з ФСБ. **48.** Свабода. **49.** Малодшы камандзір у французскім войску. **51.** Беларускі палітык-хрысьціянін. **52.** Раней яе заводзілі музыкі-бадзягі, цяпер — нуднікі. **53.** У позьняй БССР — партдзеяч з Гомелю, дэпутат ВС. **54.** Маладуха з апэрэты І.Кальмана «Сільва». **57.** Казацкі атаман, заваёўнік Сібіры. **60.** Паэт XVI ст., аўтар гераічнага эпасу пра вайсковыя справы Крыштафа Радзівіла. **62.** Яе разяваюць аратары (перан., іран.). **63.** Выбары для палітыкаў. **64.** Улюбёная цацка ўраду, пакліканая вырашыць «праблемы сяла». **66.** Тэарэтык расейскага анархізму XIX ст. **68.** Грашовая адзінка Японіі. **69.** Імя лепшага сябра беларускіх нафтавікоў у Лацінскай Амэрыцы. **70.** Саламон ... — першы мысьляр, які называў сябе беларусам (XVI ст.). **72.** Прамысловы абшар у Нямеччыне. **73.** «Першае ... для дзетак-беларусаў» (1906) напісала рэвалюцыянэрка Цётка. **74.** Украінскі філёзаф XVIII ст.; жыў як дэрвіш.

**Па вэртыкалі: 1.** Першы пасол Рэспублікі Беларусі ў Нямеччыне. **2.** Францускі гуманіст XVI ст., аўтар «Досьледаў». **3.** Чалец пратэстанцкай дэнамінацыі ў ЗША; літаральна «трасун». **4.** Беларускі праваабаронца, летась вылучаны на Нобэлеўскую прэмію. **5.** Намесьнік недзеяздольнага манарха. **6.** Джавахарлал ... — індыйскі палітык XX ст. **7.** Дадатак да відовішчаў. **8.** Настаўнік гісторыі, дэпутат Бабруйскага гарсавету. **12.** Трапічнае дрэва, зь якога магчыма вырабіць дэталі для машын. **16.** Адміністрацыйная адзінка на Арабійскай паўвысьпе. **17.** Адзін з кіраўнікоў КПБ у машэраўскі час; пазьней — пасол СССР у Паўночнай Карэі. **18.** Францускі біёляг, чыё вучэньне было «разьвітае» Т.Лысенкам. **19.** Чэскі пісьменьнік-філёзаф Мілан ... **21.** Прэзыдэнт Эгіпту «Гамаль-Абдэль-на-ўсіх ...» (савецкая дрындушка). **23.** Адна з апошніх літар грэцкага альфабэту. **26.** Францускі дасьледчык мораў; адкрыў пратоку між Японіяй і Расеяй, названую яго імем. **28.** Футбаліст з Бразыліі; летась браўся ў рожкі са сваім прэзыдэнтам. **29.** Поўны крах задумкі (разм.). **32.** Распуснае зборышча. **37.** Першы міністар замежных справаў Рэспублікі Беларусі. **38.** Пісьменьнік, дзеяч грамадзянскай ініцыятывы «За свабодныя выбары». **39.** Да 1924 г. у БССР іх было 6. **40.** Казацкі атаман, які «папаліў места слаўнае Магілеў» (1595 г.). **41.** Адмірал, шэф гітлераўскай выведкі. **43.** Антон ... — наркам асьветы БССР у 1920-х г., «нацдэм». **47.** Маладзевы актывіст з Баранавічаў, яго кашуля была першым «джынсавым» сьцягам. **49.** Памутненьне крышталіка ў воку. **50.** Вядучы інструмэнт або голас у хоры. **53.** Кандыдат філязофіі, палітычны аглядальнік (на радыё «Свабода» і інш.). **55.** Вечназялёнае дрэва з дробным лісьцем. **56.** Шпег-даносчык, перадусім у СССР. **58.** Фабрыка, зь якой А.Лукашэнка пачаў выбарчую кампанію ў 2004 г. **59.** Невялікі вайсковы човен. **61.** Імя «жалезнай лэдзі». **62.** Сурагат сьметанковага масла. **65.** Ш.Руставэлі як прадстаўнік народу. **66.** «Хопіць» на італьянскі капыл. **67.** Багіня інтэлектуальных гульняў, выдуманая ў XVIII ст. **71.** Ім абазначаецца невядомая велічыня.

**Склаў Вольф**

**Адказы**

**Па гарызанталі: 1.** Сямашка. **4.** Баранкевіч. **9.** Данілаў. **10.** Лягер. **11.** Агаг. **13.** Ельцына. **14.** Стаер. **15.** Сендэр. **18.** Лік. **20.** Калякін. **22.** Іф. **24.** Лібія. **25.** Іл. **27.** Тэрмас. **30.** Бандэра. **31.** Шапіто. **33.** Шантыр. **34.** Каратэ. **35.** Карнэгі. **36.** Валока. **39.** Пазьняк. **42.** Кебіч. **44.** Драч. **45.** Ала. **46.** Весялін. **48.** Воля. **49.** Капрал. **51.** Севярынец. **52.** Катрынка. **53.** Камай. **54.** Стасі. **57.** Ярмак. **60.** Рымша. **62.** Мялка. **63.** Экзамен. **64.** Аграгарадок. **66.** Бакунін. **68.** Ена. **69.** Уга. **70.** Рысінскі. **72.** Рур. **73.** Чытаньне. **74.** Скаварада.

**Па вэртыкалі: 1.** Садоўскі. **2.** Мантэнь. **3.** Квакер. **4.** Бяляцкі. **5.** Рэгент. **6.** Неру. **7.** Ежа. **8.** Чыгір. **12.** Гваякум. **16.** Эмірат. **17.** Барташэвіч. **18.** Лямарк. **19.** Кундэра. **21.** Насер. **23.** Фі. **26.** Ляперуз. **28.** Рынальда. **29.** Пшык. **32.** Оргія. **37.** Краўчанка. **38.** Якавенка. **39.** Павет. **40.** Налівайка. **41.** Канарыс. **43.** Баліцкі. **47.** Сасім. **49.** Катаракта. **50.** Прыма. **53.** Карбалевіч. **55.** Туя. **56.** Сэксот. **58.** «Камунарка». **59.** Кананерка. **61.** Маргарэт. **62.** Маргарын. **65.** Грузін. **66.** Баста. **67.** Каіса. **71.** Ікс.



**...расейска-беларускія перамовы па нафтагазавай тэме праходзілі ў нефармальнай абстаноўцы.**

— За што, спадар Кабякоў?

— А хто падзяліў «Дружбу» паводле прынцыпу мне 30 адсоткаў, табе 70?!

— Дык мы ж сырок дзялілі, а не нафтаправод...




**...Леў Талстой уздымаў духоўнасьць тымі ж сродкамі, што і ляўрэат прэміі за ўздым духоўнасьці — «Советская Белоруссия».**

— Духоўнасьць у Яснай Паляне кульгае. Пад пагрозай вяртаньня права першай ночы трэба забавязаць усіх сялянаў падпісацца на збор маіх твораў у 50 тамах і стварыць маім кнігам прыярытэтную выкладку на сельскім кірмашы.



**...выпадкі выдачы заробкаў цукрам мелі месца і надалей.**

— Усё, студэнт, кідай зьбіраць буракі. Бачыш, са сховішча для агародніны інкасацыя едзе.

ТЭКСТЫ І МАЛЮНКІ ЛЁЛІКА УШКІНА

# пра-бел / пра-сьвет

Эсэістыка • Крытыка • Рэфлексіі

Сяргей Брадавы. Сакрэт нашых бацькоў ..................................... 26
Руслан Равяка. Дай Божа ўсё ўмець, але ня ўсё рабіць ......... 30
Бірута Янкевіч. Моўнае пытаньне .................................................. 30
Даніла Жукоўскі. Ураздроб ............................................................ 32
Павал Абрамовіч. Наш добры настаўнік ...................................... 32
Васіль Аўраменка. Першы беларускі паверх ............................. 34
Антон Лучкоўскі. Докшыцы. 600 гадоў гісторыі ...................... 36
Дар'я Ліс. Сьвятла душы не пагасіць нягодам .......................... 38



## год паэзіі

Міхал Анемпадыстаў. Схаванае сэрца 40
Андрусь Храпавіцкі. «Мы палім масты і будуем новыя...» 41
Вадзім Болбас. Піліпаўка 42
Mann Kurt. Хайку 42
Юрась Півуноў. Восень 100–годзьдзя «Нашай Нівы» 42
Кася Кавалькова. «Абярніся, хлопча...» 42



Віншуем сям'ю Івашчанкаў з нараджэньнем сына

Рэдакцыя

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Мікалаю зь Зіновічаў.** Просьбу пра лепшае асьвятленьне эканомікі ўлічым.

**Вадзіму М-ву зь Менску, Кастусю Х-ту.** Паэзія – ня Ваша. Жар свайго сэрца ўкладзіце ў паэзію жыцьця і барацьбы.

**Міколу Х.** У Вашым эсэ карціць рэфрэн «Мне шкада вас» замяніць на «я вас люблю». Дазволіце?

**Алесю Б-му з Ваўкавыску.** Вершы душэўныя, але тэхнікі ім нестае. Вучыцеся – і спрабуйце яшчэ.

# А ты падпішыся!




**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,** проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 25.**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Усіх маладафронтаўцаў** — са сьвятам нараджэньня Хрыста! II да Карынцянаў 4:5! Брат

**Віншую сп.Алеся Пушкіна** з нараджэньнем дачкі. Спн.Людміла Л.

**Віншую з Днём нараджэньня** Чайко Сяргея зь Ліды. Жадаю здароўя, посьпехаў у вучобе і надзейных сяброў праз усё жыцьцё. Са сьвятам!!!

**Ісцінна-праваслаўнага** хрысьціяніна Багдана Уладзімеравіча А. віншую з сапраўдным Новым годам! Вучыцель.

### КНІГІ

**Спадарства!** Хто мае кнігу «Diariusz zycia mego (1714—1764)» т.1—2 Marcina Matuszewicza, адклікніцеся, калі ласка. Патрэбна ў складаньні радаводу. Буду вельмі ўдзячны. Т.: 298–60–84. Віктар

**Прапаную кнігі:** І.Насовіч «Слоўнік беларускай мовы» факс.1924, «Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі» т.1, 2, 5, «Беларуск кнігазбор»: Гётэ, Баршчэўскі, Каліноўскі, філяматы і філярэты ды іншае, гісторыя, этнаграфія, архітэктура. Т.: 753–70–05

### ПАДАРОЖЖА

**Антось Астаповіч** запрашае ў сяброўскае падарожжа 21 студзеня маршрутам: Лепель—Бачэйкава—Ула—Двор—Нізгалава—Бешанковічы—Сьвяча—Іванск—Чашнікі. Т.: 262–73–43, 8–029–111–73–32

**Зьміцер Касьпяровіч** запрашае ў сяброўскую вандроўку па Воранаўскім раёне 21 студзеня (нядзеля). Маршрут: Менск — Гайцюнішкі — Канвелішкі — Больценікі — Нача — Радунь —Беняконі — Пеляса — Менск. 3–4 лютага: Вільня — Коўна — Румшышкі. Т.: 292–54–58; 622–57–20, 110–19–28, 509–12–16, 573–88–17

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

Просім нашых чытацялёў і ўсіх, хто нам спагадае, прысылаць весьці аб тым, як ідуць выбары да Думы на вашай старане. Яшчэ рэдакцыя падае да ведама ўсіх супрацоўнікаў і карэспандэнтаў, што засьцерагае сабе права перарабляць і караціць прысылаемыя працы павэдлуг патрэбы газэты.

Дзеля таго, што цяпер гарачы час выбараў, шкадуючы мейсца, пакуль што рысункаў не памяшчаем.

**«НН», №2, 1907**

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).
сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
шэф–рэдактар Андрэй Дынько
фотарэдактар Арцём Лява
галоўны рэдактар Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва»
**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**
© **НАША НІВА**.
Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220030, г. Менск, вул. Калектарная, 20а–112. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 2421. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 11.01.2006.
Замова № &&&.
Рэдакцыйны адрас: Калектарная, 20а–112.